В.Ф. Гапановіч
Л.А. Царанкоў

УЧАРАШНІ І СЁННЯШНІ ДЗЕНЬ УНІЯЦКАЙ ЦАРКВЫ

В.Ф. Гапановіч
Л.А. Царанкоў

УЧАРАШНІ І СЁННЯШНІ ДЗЕНЬ УНІЯЦКАЙ ЦАРКВЫ

МІНСК «БЕЛАРУСЬ» 1985

ББК 86.37
Г 19

Рэцэнзенты:
З. Ю. КАПЫСКІ, доктар гістарычных навук,
Я. Н. МАРАШ, доктар гістарычных навук,
В. І. ПЕПЕЛЯЕЎ, член Саюза журналістаў СССР.

Гапановіч В. Ф., Царанкоў Л. А.

І 19 Учарашні і сённяшні дзень уніяцкай царквы.— Мн.: Беларусь, 1985.— 96 с.

25 к.

У кнізе расказваецца, як узнікла уніяцкая царква, выкладаюцца яе гісторыя і палітыка. Паказана сувязь уніяцкіх першаіерархаў з найбольш рэакцыйнымі сіламі сучаснасці, барацьба супраць сацыялізму, інтэрнацыяналізму, мірнага суіснавання. Для шырокага кола чытачоў.

Г $\frac{0400000000-192}{М\,301(05)-85}$ 037—84 ББК 86.37

© Выдавецтва «Беларусь», 1985

УСТУП

Гэта кніга раскажа аб захадах Ватыкана да распаўсюджвання каталіцызму ў Беларусі, на Украіне і ў Расіі праз унію [1] каталіцкай царквы з рускай праваслаўнай. Паведаміць яна і аб дзейнасці уніяцкага духавенства, бадай найбольш рэакцыйнага і экстрэмісцкі настроенага атрада апостальскай сталіцы.

Верхаводы сучаснай уніяцкай царквы, як і іх папярэднікі, актыўна вядуць антысавецкую прапаганду разам са збанкрутаванымі эмігранцкімі буржуазнымі групамі. Яны імкнуцца пасеяць сярод эмігранцкага, асабліва украінскага, насельніцтва ЗША, Канады, Аўстраліі, ФРГ і іншых капіталістычных дзяржаў нянавісць да Савецкага Саюза. Уніяцкае духавенства не маскіруе антыкамуністычнай накіраванасці ўсіх сваіх намаганняў, адкрыта выказвае нянавісць да краін сацыялізму і вядзе антысавецкую дзейнасць у краінах капіталу ў цесным супрацоўніцтве з нацыяналістычнымі коламі і разведкамі імперыялістычных дзяржаў.

І ў наш час уніяцкіх пастыраў не пакідаюць сапраўды злачынныя планы, якіх не здолелі ажыццявіць іх палітычныя і духоўныя папярэднікі (такія, як С. Пятлюра, А. Шаптыцкі). Напрыклад, яны ўсё яшчэ намагаюцца наладзіць сувязі з рэшткамі уніяцкага духавенства і рознымі антыграмадскімі элементамі ў СССР, якія не маюць ужо ніякага ўплыву. Уся дзейнасць вышэйшых іерархаў і значнай часткі кліру сучаснай уніяцкай царквы ў капіталістычных краінах Захаду непасрэдна накіравана на падрыў мірнага суіснавання дзяржаў з розным сацыяльным і палітычным ладам. Дык што сабой уяўляе зараз уніяцкая царква ў лагеры ворагаў нашай краіны?

ШТО ПРЫВЯЛО ДА ЦАРКОЎНАЙ УНІІ

У сярэдзіне XIII ст. пачынае фарміравацца новая еўрапейская дзяржава — Вялікае княства Літоўскае. Яно актыўна пашырала сваю тэрыторыю за кошт заходніх земляў Русі. Гістарычныя ўмовы спрыялі гэтаму. Старажытнаруская дзяржава спыніла сваё існаванне пад ударамі татара-манголаў. Ужо ў другой палове XIV ст. у склад Вялікага княства Літоўскага акрамя ўсёй тэрыторыі цяперашняй Беларусі ўвайшла і значная частка Украіны. Сталіцай яго спачатку быў Навагрудак, а потым — Вільня.

Вялікае княства Літоўскае ўяўляла сабою ў той час даволі моцную дзяржаву. Некаторыя заходнерускія землі былі захоплены ваеннай сілай, іншыя трапілі пад панаванне літоўскіх князёў мірным шляхам — па ўмовах дагавору мясцовай улады з вялікакняжацкай. Гэта была буйная шматплямённая, яшчэ недастаткова цэнтралізаваная краіна. На чале яе стаяў вялікі князь. Яму былі падпарадкаваны буйныя і дробныя феадалы, якія жылі за кошт працы сялян. З цягам часу і зямля, і сяляне сталі поўнай уласнасцю дваран. Прыгоннае права ў XV ст. было замацавана ў дзяржаўных юрыдычных актах.

З канца XIV ст. літоўскія і польскія феадалы пачалі ўзгадняць свае дзеянні. Гэта было выклікана знешнімі прычынамі — з захаду насоўвалася пагроза нашэсця нямецкіх псоў-рыцараў. Пачатак больш цеснаму супрацоўніцтву паклала Крэўская унія, заключаная паміж Польшчай і Вялікім княствам Літоўскім 14 жніўня 1386 г. Яна была замацавана шлюбам вялікага князя літоўскага Ягайлы з польскай каралеўнай Ядвігай. Каралём Польшчы стаў Ягайла. Ён прыняў імя Уладзіслаў, каталіцкую рэлігію і прывёў да яе літоўцаў, якія да гэтага часу прытрымліваліся старажытных дахрысціянскіх веравызнанняў.

Аб'яднанне Вялікага княства Літоўскага і Польшчы даволі значны час заставалася фармальным. Яно было самастойнай дзяржавай, мела сваіх манархаў і свой кі-

раўнічы апарат. Не адно стагоддзе Літва вяла барацьбу за сваю незалежнасць, супраць намаганняў польскіх феадалаў падпарадкаваць яе Польшчы. Даволі часта ў краіне абвастралася барацьба вольнага гарадскога насельніцтва (рамеснікаў, купцоў), а таксама сялян супраць феадальнага, рэлігійнага і нацыянальнага прыгнёту.

Шлях да поўнага падпарадкавання праваслаўнага насельніцтва беларускіх і ўкраінскіх зямель польскія свецкія і духоўныя феадалы бачылі ў пераводзе яго ў каталіцызм і наступным апалячванні. Але намаганням навязаць каталіцызм сяляне і нізы гарадскога насельніцтва давалі рашучы адпор. Затое даволі ахвотна адмаўляліся ад праваслаўя ўкраінскія і беларускія феадалы. Гэта тлумачылася проста: перайшоўшы ў каталіцызм,— рэлігію, якая панавала ў краіне,— яны ўраўноўваліся ў правах з польскімі і літоўскімі панамі і атрымлівалі магчымасць займаць высокія дзяржаўныя пасады.

Адначасова на ўсходзе адбываўся інтэнсіўны працэс аб'яднання рускіх зямель вакол Масквы і ўзвышэнне Маскоўскага княства. З цягам часу ўтварылася моцная руская дзяржава. Гэта быў выключна прагрэсіўны гістарычны факт не толькі для рускай, але і беларускай і ўкраінскай народнасцей. Рашаючымі падзеямі для далейшага лёсу Расіі, Украіны, Беларусі былі: перамога над татарамі на Куліковым полі ў 1380 г., а потым — канчатковае звяржэнне мангола-татарскага ярма ў 1480 г. і стварэнне цэнтралізаванай рускай дзяржавы пры Іване IV (Грозным).

Сяляне і просты люд гарадоў Беларусі і Украіны ўвесь час імкнуліся да ўз'яднання з Маскоўскай дзяржавай, адзінакроўным і адзінаверным насельніцтвам яе. У гэтым яны бачылі сваё вызваленне з-пад прыгнёту іншаземных паноў, які ўвесь час узмацняўся. Прычым сацыяльны прыгнёт пераплятаўся з нацыянальным і рэлігійным. Тэндэнцыя да дзяржаўнага аб'яднання з беларусамі і ўкраінцамі была моцная і ў насельніцтва Маскоўскай Русі. Ідэі палітычнай еднасці трох братніх усходнеславянскіх народнасцей грунтаваліся на былым дзяржаўным адзінстве ў складзе Старажытнарускай краіны, блізкасці тэрыторый, эканамічных сувязях, роднасці моў і, нарэшце, на агульнасці веравызнанняў. Вялікі князь Маскоўскі ўсведамляўся насельніцтвам беларускіх і ўкраінскіх земляў, якое, дарэчы, у той час

называла сябе рускім, як адзіны праваслаўны манарх, абаронца і апякун «бацькоўскай веры», а Масква — як адзіны праваслаўны цэнтр усіх усходнеславянскіх зямель.

У такіх умовах на працягу XIII—XIV ст. сфарміраваліся беларуская і ўкраінская народнасці са сваімі літаратурнымі мовамі. Яны вылучылі шэраг выдатных дзеячаў-гуманістаў, сярод якіх у эпоху Адраджэння найвялікшым быў Францыск Скарына.

У 1569 г. паміж Польшчай і Літвой на сейме ў Любліне была заключана другая палітычная (дзяржаўная) унія, якая ўвайшла ў гісторыю пад назвай Люблінскай. Вялікае княства Літоўскае (Княства) і Польскае каралеўства (Карона) аб'ядноўваюцца ў адзіную дзяржаву, якая прыняла назву «Рэч Паспалітая». Утварылася вялікая шматнацыянальная дзяржава, якая займала прыкметнае месца сярод буйнейшых краін Еўропы. У гэтым саюзе панавала Польшча як у палітычных, сацыяльна-эканамічных, так і ў нацыянальных адносінах. Фармальна Рэч Паспалітая была федэратыўнай дзяржавай. Для Кароны і Княства быў адзіны кароль і адзіны сейм (феадальны парламент). Гэтыя састаўныя часткі Рэчы Паспалітай мелі кожная свой апарат кіравання. Абедзве дзяржавы захоўвалі самастойныя назвы, свае законы, фінансы, органы ўлады, узброеныя сілы і да канца XVII ст. розную дзяржаўную мову. Беларусь засталася ў межах Княства, а Украіна адышла да Кароны.

У адпаведнасці з заключанай на сейме ўмовай было ўзаконена права польскіх дваран атрымліваць зямельныя ўладанні на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага. Каралі шчодра раздавалі беларускія і ўкраінскія землі сваім магнатам у пажыццёвае валоданне. У выніку феадальная эксплуатацыя беларускіх сялян стала яшчэ больш жорсткай, а самастойнасць Княства станавілася ўсё больш уяўнай.

Польскія феадалы імкнуліся да поўнага палітычнага замацавання ўсходніх земляў за сваёй дзяржавай. Важнейшы сродак для здзяйснення сваіх намераў яны бачылі ў пашырэнні на іх каталіцызму.

Вось тут перад пануючымі класамі і паўстала неабходнасць зрабіць гэта як мага хутчэй і найменш балюча. Выйсце са складанага становішча ўлады і іх верны памочнік — каталіцкае духавенства — бачылі ў паступовым пераходзе праваслаўнага насельніцтва ў «сапраўдную веру». На дапамогу ім прыйшоў Ватыкан, які здаў-

на марыў пашырыць каталіцкае веравызнанне на Усход.

У такіх гістарычных умовах на царкоўным саборы ў Брэсце (1596 г.) была прынята унія, якая па месцы яе абвяшчэння атрымала назву Брэсцкай, пад якой і ўвайшла ў гісторыю. Яна абвясціла аб'яднанне праваслаўнай царквы на тэрыторыі Рэчы Паспалітай з каталіцкай. Але гэты «саюз» не з'яўляўся раўнапраўным. Праваслаўнае насельніцтва Беларусі і Украіны павінна было прызнаць догматы каталіцкага веравызнання і падпарадкаванне праваслаўнай царквы рымскаму папе. Унія прадугледжвала не роўнасць бакоў, якія «ядналіся», а вяршэнства каталіцызму ў гэтым «саюзе». У праваслаўнага насельніцтва, якое прымала унію, заставалася ад ранейшага веравызнання толькі знешняе: стараславянская мова пры набажэнстве, выкананне абрадаў у адпаведнасці са звычаямі праваслаўнай царквы, жаніцьба «белага» духавенства (свяшчэннікаў). Усё гэта дзеячамі каталіцызму разглядалася як часовая з'ява. Яна дапускалася толькі для таго, каб было лягчэй прыцягнуць да уніі беларускае і ўкраінскае насельніцтва.

Уступкі праваслаўю ў час прыняцця уніі не былі выпадковымі. Яны дыктаваліся неабходнасцю лічыцца з рэзка адмоўнымі адносінамі праваслаўных да каталіцкай царквы і саюзу з ёй. Для ўцягнення іх у новае веравызнанне ксяндзам было неабходна праявіць пэўную гібкасць. Мелася на ўвазе, што насельніцтва, якое прыме унію, з цягам часу поўнасцю пяройдзе ў каталіцызм без сур'ёзных перашкод. Планы акаталічвання праваслаўнага насельніцтва Рэчы Паспалітай выношваліся і распрацоўваліся значна раней таго часу, калі была абвешчана Брэсцкая царкоўная унія.

Ідэя уніі, а потым і яе распаўсюджванне належала Ватыкану. Праводзілася яна пры актыўнай падтрымцы кіруючых колаў Рэчы Паспалітай. Беларускаму і ўкраінскаму насельніцтву, падпаўшаму ў выніку Люблінскай уніі пад уладу польскіх феадалаў, Брэсцкая царкоўная змова была навязана гвалтоўна.

Правядзенне уніі, такім чынам, з'яўлялася адным з найважнейшых напрамкаў усходняй палітыкі Ватыкана. Яе актыўна падтрымлівалі езуіты — галоўная сіла і апора апостальскай сталіцы. Ватыкан у той час адкрыта намагаўся аб'яднаць хрысціянства, утварыць з яго адно цэлае на чале з каталіцкай царквой. Папы рымскія здаўна імкнуліся падпарадкаваць сабе ідэйна і палітычна як мага больш народаў. Яны заўсёды марылі стаць

на чале «цывілізаванага свету», «духоўнымі айцамі» чалавецтва.

Поўнасцю падтрымліваючы царкоўную унію, урад Рэчы Паспалітай меў свае планы — праз яе дабіцца паланізацыі беларускай і ўкраінскай народнасцей для замацавання свайго палітычнага панавання ў гэтых рэгіёнах.

Паводле планаў езуітаў, насельніцтва гэтых зямель павінна быць акаталічана, і таму гвалтоўны перавод карэнных жыхароў у гэтае веравызнанне распачаўся адразу пасля заключэння Люблінскай уніі. Але такая жорсткая палітыка поспеху не мела. Больш таго: яна сустрэла моцнае супраціўленне простага люду.

Апостальская сталіца і яе адданыя паслугачы — езуіты, а таксама ўрад Рэчы Паспалітай сталі супольнікамі ў навязванні Беларусі і Украіне Брэсцкай царкоўнай уніі. Польскія феадалы, у інтарэсах якіх яна праводзілася, былі ўпэўнены, што гэта дапаможа ім замацаваць сваё панаванне над карэнным насельніцтвам Беларусі і Украіны, стрымаць іх антыфеадальную барацьбу. Вялікія надзеі ўскладаліся на унію і з разлікам на тое, што яна будзе спрыяць паслабленню і нават разрыву рэлігійных сувязей мясцовага насельніцтва з адзінаверцамі ў Маскоўскай дзяржаве. Кіруючыя колы Рэчы Паспалітай лічылі, што гэта аддаліць беларусаў і ўкраінцаў ад рускіх, ад якіх яны чакалі вызвалення (нельга забываць, што ў той час рэлігія была пануючай ідэалогіяй).

Ажыццяўленню планаў Ватыкана і польскага ўрада спрыяла і пазіцыя, якую займала праваслаўнае духавенства, асабліва вышэйшае. Яго прадстаўнікі, як на першы погляд гэта ні дзіўна, разам з езуітамі былі ініцыятарамі і асноўнымі праваднікамі уніі.

Праваслаўныя іерархі ў Рэчы Паспалітай больш за ўсё клапаціліся аб умацаванні свайго становішча; яны імкнуліся да таго, каб ураўняцца ў палітычных правах з вярхамі каталіцкага духавенства.

Пасля Люблінскай уніі праваслаўная царква ў Беларусі і на Украіне была ў стане цяжкага заняпаду. Кароль, урад Рэчы Паспалітай у лепшым выпадку былі абыякавымі да яе, найчасцей жа ставіліся варожа.

Прызначэнне на вышэйшыя пасады праваслаўнай царквы поўнасцю залежала ад волі манарха. Іх атрымлівалі людзі, якія здолелі выслужыцца перад каралём асабіста або перад дзяржавай. Ніхто не клапаціўся, каб чалавек, прызначаны на епіскапскую кафедру або ігуме-

нам [1] манастыра, адпавядаў у маральных адносінах высокім афіцыйным і заканадаўчым патрабаванням царкоўнага статута, меў адпаведную адукацыю. Сярод высокіх праваслаўных іерархаў не часта сустракаліся падзвіжнікі ад веры. Звычайна гэта былі людзі, прагныя да багацця, бессаромныя рабаўнікі сялян і гараджан, прайдзісветы і грабіцелі царкоўных маёнткаў сваіх калег і суседзяў-шляхцічаў. Часта гэта былі людзі з невысокімі маральнымі якасцямі, распуснікі, дваяжэнцы і нават траяжэнцы, заклапочаныя не ў поспехах рэлігіі, а толькі ў павелічэнні сваіх асабістых багацця. Такім, напрыклад, быў мнагажэнец мітрапаліт кіеўскі — першая асоба сярод праваслаўнага духавенства Рэчы Паспалітай — Анісіфор Дзевачка. І гэта ў той час, як пасаду нават епіскапа ці ігумена манастыра меў права займаць толькі манах. Быў выпадак, калі кароль Стэфан Баторый прызначыў на праваслаўную епіскапскую кафедру католіка. Часам адну і тую ж царкоўную пасаду адначасова атрымлівалі дзве асобы, і паміж імі пачыналася барацьба, нярэдка ўзброеная. Нядзіўна, што царкоўная дысцыпліна была крайне аслаблена, моцна адчуваўся заняпад адукацыі ў асяроддзі духавенства. У справы царквы былі вымушаны ўмешвацца асобы, якія не належалі да духавенства. Сярод прадстаўнікоў свецкага праваслаўнага насельніцтва Беларусі і Украіны сустракаліся асобы, якія з'яўляліся членамі магутных, высокапастаўленых феадальных родаў. Перад Люблінскай уніяй і неўзабаве пасля яе гэтыя кланы моцна дапамаглі царкве. Але ў той самы час яна ўзмацнілася і з боку так званага сярэдняга саслоўя — рамеснікаў, гандляроў, якія жылі ў гарадах і аб'ядноўваліся ў брацтвы. Апошнія вялі барацьбу за сваю нацыянальную культуру, праваслаўную веру супраць магутных ворагаў — польскіх духоўных і свецкіх феадалаў, якіх падтрымлівала дзяржава. Брацтвы не толькі абаранялі правы царквы перад урадам, сачылі за выкарыстаннем і захаваннем царкоўнай маёмасці, але і пратэставалі супраць злоўжыванняў духавенства, у тым ліку і высокапастаўленага.

Такое ўмяшанне параджала незадавальненне ў большасці вышэйшых праваслаўных іерархаў. Яны пастаянна вышуквалі сродкі пазбавіцца ад апекі брацтваў і нярэдка вялі з імі зацятую барацьбу. Гэта была адна з грунтоўных прычын, чаму многія епіскапы без значных ваганняў прызналі мэтазгоднасць уніі.

Некаторыя беларускія і ўкраінскія епіскапіі [2] мелі ве-

лізарныя зямельныя багацці. Так, Уладзімірская, што на Валыні, валодала ўмацаваным замкам у горадзе Уладзіміры і некалькімі маёнткамі. Апрача гэтага ёй належалі: мястэчка Квасаў, шаснаццаць паселішчаў у Луцкім і Уладзімірскім паветах, Купетаўская воласць з мястэчкам Азарычы, адзінаццаць іншых паселішчаў і рыбных лоўляў, востраў Валаслаўль на рацэ Лузе, на якім знаходзіўся манастыр святога Ануфрыя.

Вялікія зямельныя багацці мелі Луцкая і Астрожская епіскапіі: чатыры мястэчкі, з іх два (Харлуп і Жабча) мелі надзейныя замкі з гарматамі і гакоўніцамі [3], трыццаць чатыры паселішчы ў Луцкім і Уладзімірскім паветах. Наогул епіскапскія рэзідэнцыі былі добра ўмацаваны і ўзброены. І гэта нядзіўна, бо іх гаспадарам трэба было заўсёды дбаць пра абарону сваіх уладанняў ад свецкіх, асабліва польскіх феадалаў.

У 1589 г. у Маскве быў створаны ўласны патрыярхат. Патрыярхам усея Русі стаў маскоўскі мітрапаліт Іаў. Для пасвячэння яго ў сан у Маскву прыбыў канстанцінопальскі патрыярх Іерамія. Гэтыя падзеі падштурхнулі езуітаў і польскага караля Сігізмунда III да больш рашучай і хуткай падрыхтоўкі уніі для беларусаў і ўкраінцаў.

Вяртаючыся з Масквы на радзіму, Іерамія ў 1589 г. наведаў Рэч Паспалітую. Веруючыя міране падавалі яму скаргі на разбэшчаных і нядбайных епіскапаў. Па просьбе князя К. Астрожскага Іерамія ўзяўся навесці парадак у царкоўных справах. Сігізмунд III пры садзейнічанні К. Астрожскага выдаў патрыярху грамату, паводле якой яму былі падпарадкаваны ўсе справы і асобы праваслаўнай царквы Рэчы Паспалітай. Карыстаючыся гэтым правам, уладыка пазбавіў царкоўных кафедр усіх жанатых епіскапаў, а таксама мітрапаліта кіеўскага. Канстанцінопальскі патрыярх устанавіў строгі парадак замяшчэння епіскапскіх кафедр толькі манахамі, даў вялікія правы брацтвам, пасвяціў мінскага мітрапаліта Міхаіла Рагозу ў сан мітрапаліта кіеўскага (па прадстаўленню і дамаганню ўрада).

Але новы мітрапаліт не атрымаў усёй паўнаты ўлады над праваслаўнай царквой у Рэчы Паспалітай. Поруч з ім Іерамія паставіў над праваслаўным духавенствам свайго экзарха (намесніка). Ім стаў луцкі епіскап Кірыл Цярлецкі, які атрымаў права нагляду і суда над праваслаўнымі свяшчэннікамі, а таксама звяржэння епіскапаў. Гэта выклікала незадавальненне ў М. Рагозы.

Гісторык С. М. Салаўёў наступным чынам характарызаваў К. Цярлецкага: гэта быў «разумны, адукаваны, спрытны і дзейны, здольны кіраваць епархіяй на тагачасных умовах, але далёка не здольны быць вартым епіскапскага сану»[4] (маецца на ўвазе нізкі маральны воблік К. Цярлецкага). Прагны да багацця, ён разлічваў, прыняўшы унію, павялічыць свае ўладанні. К. Цярлецкі вёў бясконцыя судовыя справы, часта рабіў узброеныя наезды на маёнткі сваіх праціўнікаў, разбураў вёскі, а для гэтага амаль заўсёды знаходзіўся сярод сваіх гайдукоў-грабежнікаў — адным словам, ён вёў спосаб жыцця, яўна супрацьпаказаны высокай духоўнай асобе і больш уласцівы тагачасным магнатам. Мітрапаліт М. Рагоза называў яго «райскім змеем» і «каварнай лісой».

Ідэю уніі ахвотна падтрымалі буйныя царкоўныя дзеячы Вялікага княства Літоўскага. Яны намагаліся ўмацаваць свае саслоўныя, палітычныя і эканамічныя пазіцыі, прыраўняцца ў правах да іерархаў каталіцкай царквы ў дзяржаве. Адразу прынялі праграму уніі і сталі яе зачыншчыкамі: епіскап львоўскі Гедэон Балабан, пінскі Лявонцій, луцкі Кірыл Цярлецкі, брэсцкі Іпацій Пацей, холмскі Дыянісій і мітрапаліт кіеўскі Міхаіл Рагоза. Гэта было вельмі важна для езуітаў — натхніцеляў і сапраўдных арганізатараў уніі. Яны лічылі патрэбным распаўсюджваць версію, што ініцыятыва змовы ідзе ад вышэйшага праваслаўнага духавенства.

Падтрымала ідэю уніі і значная частка праваслаўных свецкіх феадалаў Беларусі і Украіны (праўда, яны найчасцей пераходзілі непасрэдна з праваслаўя ў каталіцызм). Гэта давала ім магчымасць разам з польскімі магнатамі займаць у Рэчы Паспалітай высокія дзяржаўныя пасады і аб'яднанымі намаганнямі весці сумесную барацьбу супраць народнага руху. Такога роду пазіцыю У. І. Ленін характарызаваў наступным чынам: «Гісторыя вучыць, што пануючыя класы заўсёды ахвяроўвалі ўсім, абсалютна ўсім: рэлігіяй, свабодай, радзімай, калі справа ішла аб падаўленні рэвалюцыйнага руху прыгнечаных класаў»[5].

Супраць уніі асабліва актыўна выступілі прыгонныя сяляне, украінскія казакі, простае насельніцтва гарадоў Беларусі і Украіны, частка дробнай праваслаўнай шляхты, нізавое праваслаўнае духавенства. Толькі невялікая частка буйных украінскіх і беларускіх феадалаў засталася ў старой веры і вяла барацьбу супраць уплыву каталіцызму і насаджэння уніі. Немалую ролю тут адыгры-

вала фанатычнасць у адносінах да праваслаўнай веры некаторых магнатаў. Такім, напрыклад, быў адзін з буйнейшых украінска-беларускіх абшарнікаў князь К. Астрожскі (1527—1608 гг.), які карыстаўся значным уплывам у Вялікім княстве Літоўскім. Староста Уладзіміра-Валынскі, маршалак Валынскай зямлі, ваявода Кіеўскі — чалавек шырока адукаваны для свайго часу, ён быў віднейшым апекуном асветы ў Беларусі і на Украіне. Скарбы яго былі сапраўды незлічоныя. Уладанні К. Астрожскага (25 гарадоў, 10 мястэчак і 670 вёсак) знаходзіліся на Валыні, у Падоллі, Галіцыі. Яны штогод давалі прыбытку больш за 1 мільён злотых. Вялікае багацце давала яму магчымасць пашыраць асвету ў краі пры дапамозе друкавання кніг, апякунства над вучонымі і людзьмі культуры, адкрыцця школ. Пры ўсім гэтым К. Астрожскі быў жорсткім эксплуататарам падуладных яму прыгонных сялян, гарадскіх жыхароў. Ён непрымірыма варожа ставіўся да антыфеадальных народных выступленняў, удзельнічаў у падаўленні сялянска-казацкага паўстання С. Налівайкі.

У ліку праціўнікаў уніі засталіся і асобныя прадстаўнікі вышэйшага праваслаўнага духавенства: кіева-пячэрскі архімандрыт [6] Нікіфар Тур і яго пераемнік Елісей Плецянецкі, рэктар Астрожскай акадэміі Герасім Сматрыцкі. Вылучаўся сваімі выступленнямі супраць уніі ўкраінскі манах Іаан Вышанскі.

Трэба памятаць, што унія была ў першую чаргу з'явай палітычнай. У краіне простыя людзі — беларускія і ўкраінскія сяляне і гараджане вялі непрымірымую барацьбу супраць польскіх феадалаў і іх ідэйных памочнікаў у абарону нацыянальных і культурных традыцый. Ішла яна пад сцягам абароны веры бацькоў. Так сацыяльна-класавая барацьба ў Беларусі і на Украіне набыла рэлігійную афарбоўку. Змагаліся ўкраінцы і беларусы і за ўз'яднанне з адзінакроўнымі братамі Маскоўскай Русі.

ПАДРЫХТОЎКА І ПРАВЯДЗЕННЕ БРЭСЦКАГА САБОРА

Ватыкан і ўлады Рэчы Паспалітай надавалі вялікае значэнне ўмацаванню каталіцкай царквы ў краіне. Гэта было заканамерна. Польшчу апостальская сталіца разглядала як апорны пункт каталіцызму

на ўсходзе, што прызначаны адыграць рашаючую ролю ў пашырэнні «сапраўднай веры» сярод народаў Расіі. Урад быў заклапочаны ўнутраным становішчам у краіне. І ён паклікаў на дапамогу свайго вернага саюзніка — касцёл. Акрамя таго, у гэты час у Польшчы і Літве, як і ўсюды ў Еўропе, набірала моц Рэфармацыя. У такіх умовах і з'явіліся на Украіне і Беларусі езуіты — аддаяныя абаронцы каталіцкай веры.

У 1564 г. слугі Ісуса абаснаваліся ў Польшчы, а пасля заключэння Люблінскай уніі каталіцкі біскуп Валяр'ян Пратасевіч запрашае іх у Вільню (1569 г.). Галоўная мэта, з якой прыехалі езуіты ў Вялікае княства Літоўскае,— падпарадкаваць пад уладу Рыма беларусаў і ўкраінцаў. Ордэн адразу ж узяўся за справу. Ужо ў 1570 г. у Вільні адкрываецца школа (калегіум) для навучання ў ёй сыноў літоўскіх, беларускіх і ўкраінскіх феадалаў, а таксама праваслаўнага духавенства і гараджан. Неўзабаве гэты калегіум быў рэарганізаваны ў акадэмію (1579 г.), у якой навучалася да 700 слухачоў. Першым яе рэктарам быў ваяўнічы езуіт Пётр Скарга (1536—1612 гг.).

Ордэн у Рэчы Паспалітай перш-наперш захапіў у свае рукі адукацыю і выхаванне моладзі, каб зрабіць з яе ваяўнічых слуг каталіцызму. У хуткім часе ўзніклі агульнаадукацыйныя бясплатныя езуіцкія школы ў многіх гарадах Беларусі: Полацку, Оршы, Нясвіжы, Брэсце, Гродна, Бабруйску, Навагрудку, Мінску, Віцебску, Слуцку, Магілёве, Слоніме. У іх кожны, незалежна ад сацыяльнага паходжання, мог атрымаць першапачатковую адукацыю. Выкладчыкаў для школ рыхтавала віленская акадэмія. У 1581 г. была створана езуіцкая калегія ў Полацку. Галоўнай мэтай, якая ставілася перад навучаннем у гэтых установах, была падрыхтоўка з ліку мясцовага насельніцтва фанатычных католікаў, адданых польскай дзяржаве. Выхаванцы пагардліва і зняважліва ставіліся да ўсяго няпольскага і некаталіцкага і гатовы былі актыўна змагацца за далейшае распаўсюджванне на сваёй радзіме каталіцызму і польскай мовы. Але, як і раней, прапаганда гэтага веравызнання не мела поспехаў у асяроддзі шырокіх народных мас Беларусі і Украіны. Спатрэбіліся рашучыя захады да паступовага іх акаталічвання праз царкоўную унію.

Асабліва вялікую ролю ў падрыхтоўцы уніі адыграў духоўнік польскага караля Сігізмунда III П. Скарга, найбольш відны дзеяч ордэна езуітаў у Рэчы Паспалі-

тай. У сваіх пропаведзях ён палымяна выступаў супраць смуты ў дзяржаве і бачыў выйсце ў падпарадкаванні свецкіх феадалаў духоўным, а караля — рымскаму папе.

Раней езуіт вельмі дапамог польскаму каралю Стэфану Баторыю ў яго захопніцкай вайне супраць Маскоўскай дзяржавы. Хітры і спрытны палітык, ён здолеў угаварыць найбуйнейшых польскіх і літоўскіх магнатаў дапамагчы манарху. Дарэчы, і самі езуіты на чале з П. Скаргай прымалі актыўны ўдзел у вайне ў якасці капеланаў [1]. Яны арганізоўвалі шпіянаж, падтрымлівалі ў салдат ваяўнічы дух.

Пасля заканчэння вайны слугі Ісуса пачалі настойліва навязваць царкоўную унію беларусам і ўкраінцам. Так пытанні рэлігіі ў канцы XVI ст. набылі востры палітычны характар. Яны апынуліся ў цэнтры ўвагі грамадскай думкі і царкоўна-рэлігійнай палемічнай публіцыстыкі.

Знаходзячыся ў Вільні ў час актыўнай падрыхтоўкі уніі, П. Скарга ў 1577 г. выпусціў на польскай мове багаслоўскі трактат «Аб адзінстве царквы божай і аб грэчаскім ад гэтага адзінства адступленні...». Кніга была напісана па загаду галавы польскіх езуітаў Суньера і прысвечана князю К. Астрожскаму. Езуіты і нават папа рымскі надавалі вялікае значэнне прыцягненню на свой бок гэтага багатага і ўплывовага феадала. У 1590 г. П. Скарга перавыдаў кнігу, якая ідэалагічна падрыхтоўвала Брэсцкую царкоўную унію. На гэты раз аўтар прысвяціў яе каралю Сігізмунду-Аўгусту.

Першыя дзве часткі кнігі — багаслоўскае і гістарычнае даследаванне аб падзеле хрысціянскай царквы на рымска-каталіцкую і грэка-праваслаўную. Найбольш важнай у тагачаснай рэлігійнай барацьбе была трэцяя частка кнігі. У ёй аўтар праўдзіва паказваў заняпад праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай. Пры гэтым ён ставіў перад сабой мэту — давесці, што каталіцызм мае бясспрэчныя перавагі над усімі іншымі веравызнаннямі. Езуіт робіць вывад: у праваслаўнай царквы ёсць адзіны спосаб паправіць сваё становішча — заключыць унію з Рымам. Ажыццявіць яе можна пры трох умовах: 1) каб мітрапаліт кіеўскі прымаў бласлаўленне (г. зн., пасвячаўся і прызначаўся) ад папы, а не ад патрыярха; 2) каб усе прыхільнікі праваслаўя пагадзіліся з дагматамі рымскай царквы; 3) каб прызналі вярхоўную ўладу Рыма як «апостальскай сталіцы» хрысціянскага свету.

І ў той жа час царкоўныя абрады пакідаліся без

змен, мова набажэнства заставалася славянскай. Распаўсюджваць унію П. Скарга раіў прымусова: за ўпартае нежаданне змяніць веру — пазбаўляць духавенства і парафіян розных матэрыяльных выгод.

Езуіты рабілі ўсё магчымае, каб схіліць на свой бок праваслаўнае духавенства, галоўным чынам вышэйшае. Вельмі многа намаганняў і сілы паклалі яны і на тое, каб на чале праваслаўнай царквы Украіны і Беларусі былі пастаўлены іх патаемныя агенты. Свайго яны дабіліся. Мітрапаліт М. Рагоза і патрыяршы экзарх К. Цярлецкі былі цесна звязаны з ордэнам Ісуса.

Так паступова склаліся аб'ектыўныя і суб'ектыўныя ўмовы, пры якіх большасць вышэйшых праваслаўных іерархаў на тэрыторыі сучасных Беларусі і Украіны па розных прычынах былі схільныя да уніі праваслаўнай царквы з каталіцкай. Першымі выказалі намер прыняць унію львоўскі епіскап Г. Балабан і патрыяршы экзарх К. Цярлецкі. Удвух яны (хоць знаходзіліся ў варожых адносінах паміж сабой) пераконвалі мітрапаліта склікаць сабор духавенства без удзелу парафіян для абмеркавання шляхоў ліквідацыі непарадкаў у праваслаўнай царкве.

У пачатку 1593 г. на Уладзімірскую і Брэсцкую кафедры прызначаецца выхаванец Кракаўскай езуіцкай калегіі, сенатар, былы католік, потым кальвініст і, нарэшце, праваслаўны Адам Пацей. Мітрапаліт М. Рагоза, уступіўшы настойлівым патрабаванням езуітаў, пасвяціў яго ў сан епіскапа пад імем Іпація. Разам з К. Цярлецкім і Г. Балабанам, з якімі ён хутка сышоўся, Іпацій стаў адданым прыхільнікам уніі.

Актывізавалі дзеянні і праціўнікі уніі. К. Астрожскі заклікаў праваслаўных цвёрда трымацца сваёй веры. Пачаліся хваляванні беларускага і ўкраінскага насельніцтва. Настаўнік брацкай школы ў Вільні Сцяфан Зізаній (туды ён пераехаў са Львова) напісаў супраць уніі палемічны твор «Кніжыца на рымскі касцёл». У сваіх пропаведзях ён выкрываў бяздзейнасць, нерашучасць М. Рагозы.

У адказ езуіты пачалі адкрыта весці шырокую прапаганду уніі. Але арганізацыйная падрыхтоўка яе ішла пакуль што патаемна. Непрыязнасць да уніі і актыўны пратэст супраць яе насельніцтва перашкаджалі праваслаўным іерархам не тоячыся афіцыйна прызнаць яе. Мітрапаліт і епіскапы баяліся, што адкрытае ўхваленне уніі можа ўзняць беларусаў і ўкраінцаў на паўстанне.

І ўсё ж, калі наступіў час рашучых дзеянняў, езуіты пачалі настойваць на адкрытым абвяшчэнні уніі М. Рагозай, К. Цярлецкім і праваслаўнымі епіскапамі. Ад імя польскага караля яны запэўнівалі ўсіх іх ураўняць у правах і прывілеях з каталіцкім духавенствам. Уніяцкай шляхце езуіты абяцалі прадаставіць магчымасць займаць дзяржаўныя пасады нараўне з каталіцкай, а мяшчанам-уніятам дэкларавалі роўныя з мяшчанамі-каталікамі правы.

У 1591 г. найбольш высокапастаўленыя іерархі праваслаўнай царквы з'ехаліся ў Брэст і вырашылі адмовіцца ад падпарадкавання канстанцінопальскаму патрыярху. Кароль адобрыў гэта рашэнне і зразумеў яго як імкненне праваслаўных епіскапаў прызнаць уладу папы. У 1593 г. колькасць прыхільнікаў змовы павялічылася. Афіцыйна выказаўся за унію з рымскай царквой мітрапаліт М. Рагоза. К. Цярлецкі і І. Пацей у канцы 1594 г. накіравалі польскаму каралю грамату, у якой выказалі сваю згоду заключыць унію. Гэты дакумент падпісалі мітрапаліт і пяць епіскапаў.

15 чэрвеня 1595 г. у Брэсце адбыўся збор епіскапаў, якія падпісалі ліст рымскаму папе з просьбай далучыць іх да каталіцкай царквы. Не сумняваючыся ў поспеху, Сігізмунд III у верасні 1595 г. выдаў універсал [2], паводле якога праваслаўная царква ў Рэчы Паспалітай аб'яўлялася злучанай з каталіцкай. 26 верасня таго ж года пры пасрэдніцтве П. Скаргі епіскапы К. Цярлецкі і І. Пацей атрымалі ад караля грошы на падарожжа ў Рым. У хуткім часе яны ўжо былі ў апостальскай сталіцы з саборнай граматай заходнерускага (украінскага і беларускага) праваслаўнага духавенства Рэчы Паспалітай да папы. Паслы выказалі сваю пакорнасць Рыму і прысягнулі Клімент VIII, прынялі ўсе каталіцкія догматы і пакінулі без змен толькі праваслаўныя абрады.

Папа з радасцю прыняў паслоў. Ён блаславіў унію ў асобе К. Цярлецкага і І. Пацея, якія дзейнічалі, паводле іх слоў, ад імя ўсяго праваслаўнага духавенства Рэчы Паспалітай, і выдаў адпаведную булу [3]. Па загаду пантыфіка [4] быў адліты памятны медаль. На ім былі паказаны Клімент VIII і чалавек, які схіліўся перад папай. Гэта сімвалізавала праваслаўную царкву Рэчы Паспалітай. На медалі былі выбіты словы «Ruthenis receptis» (На прыняцце русінаў).

Так была абвешчана унія паміж праваслаўнай і каталіцкай царквой Рэчы Паспалітай. Пазней Клімент

VIII выдаў пасланне, у якім абавязаў мітрапаліта М. Рагозу склікаць сабор усіх епіскапаў для прыняцця прысягі рымскаму прастолу. У сваім асабістым лісце да Сігізмунда III папа прасіў караля ўраўняць уніяцкае духавенства ў правах з каталіцкім, даць уніяцкім епіскапам і мітрапалітам «годнасць сенатараў».

Вярнуўшыся з Рыма, К. Цярлецкі і І. Пацей горача ўзяліся за прапаганду уніі, не адступаючы пры гэтым ад насілля і інтрыг. Так, К. Цярлецкі жорстка расправіўся са свяшчэннікам Сцяфанам з Луцка. За адмаўленне прыняць унію спусціў яго пад лёд у раку Стыр. Актыўная падрыхтоўка уніі выклікала моцнае абурэнне праваслаўнага насельніцтва Вялікага княства Літоўскага.

6 кастрычніка 1596 г. у Брэсце быў скліканы памесны царкоўны сабор для канчатковага абвяшчэння уніі. Праўда, М. Рагоза аб'явіў, што ён пачнецца 8 кастрычніка. Гэты манеўр даваў магчымасць яго аднадумцам да часу, пакуль з'едуцца ўсе, хто меў намер прыняць удзел у саборы, закончыць фармальнасці, звязаныя з прыняццем уніі, у сваім вузкім асяроддзі. Тым самым яны атрымлівалі магчымасць паставіць яе праціўнікаў перад фактам.

Своечасова з'явіліся на сабор: галоўны арганізатар і нястомны прапагандыст уніі П. Скарга з трыма езуітамі, мітрапаліт М. Рагоза, архіепіскапы: полацкі, уладзіміра-валынскі, пінскі і прадстаўнік папы рымскага, а таксама тры прадстаўнікі польскага караля. Праціўнікаў уніі было ў Брэсце нямала: вялікая група праваслаўных на чале з К. Астрожскім, львоўскі і пярэмышльскі епіскапы, пасол усяленскага канстанцінопальскага патрыярха Нікіфар і александрыйскага — Кірыл.

Уніяты, каталіцкія епіскапы і каралеўскія прадстаўнікі сабраліся ў Мікалаеўскай царкве. Там, за зачыненымі дзвярыма, яны выпрацавалі тактыку адносін да сваіх праціўнікаў. Было вырашана запрасіць іх на сабор толькі ў тым выпадку, калі яны дадуць згоду не выступаць супраць уніі. Угаварыць К. Астрожскага ўзяў на сябе П. Скарга. Аднак зрабіць гэта ён не здолеў.

Перагаворы паміж прыхільнікамі і праціўнікамі уніі поспеху не мелі. Тады М. Рагоза аддаў анафеме[5] «адступнікаў», пазбавіў іх духоўнага сану. Ён заявіў, што царкоўныя пасады будуць аддадзены толькі тым, хто прызнае унію. Па загаду каралеўскіх прадстаўнікоў сабор хутка быў завершаны, але ўжо не ў Мікалаеўскай царкве, а ў касцёле. Там мітрапаліт і епіскапы, што пры-

нялі новае веравызнанне, прысягнулі на вернасць папе рымскаму і сумесна адслужылі набажэнства з каталіцкім духавенствам. У канцы яго П. Скарга выступіў з прамовай «Аб адзінстве божай царквы пад адным пастырам».

На Брэсцкім царкоўным саборы не было дыскусіі паміж духавенствам, якое збіралася прыняць унію, і тым, якое ад яе адмаўлялася. Прыхільнікі уніі засядалі разам з езуітамі, асобна ад яе праціўнікаў. Па сутнасці адбыліся два саборы, якія адзін аднаго праклялі і вынеслі кожны сваю пастанову. Такім чынам, пастанова аб уніі была прынята толькі яе прыхільнікамі, а воля другога боку ўлічана не была. Поўнага аб'яднання праваслаўя і каталіцызму на саборы не адбылося. Праваслаўная царква засталася існаваць разам з уніяцкай.

Пастанову Брэсцкага сабора падтрымалі кароль і ўрад Рэчы Паспалітай. Царкоўную унію было абавязана прыняць усё праваслаўнае насельніцтва на тэрыторыі краіны. Карыстаючыся падтрымкай дзяржавы, уніяцкае духавенства захоплівала храмы, праганяла свяшчэннікаў, прысвойвала маёмасць свайго канкурэнта. Актыўныя выступленні народных мас прымусілі польскі ўрад у 1633 г. фармальна прызнаць праваслаўную царкву і дазволіць ёй легальнае існаванне. Барацьба паміж прыхільнікамі і праціўнікамі уніі скончылася толькі ў канцы XVIII ст., калі Рэч Паспалітая перастала існаваць як незалежная дзяржава.

Вось так, подкупам, падманам, тэрорам, іншымі брудnымі захадамі, Ватыкан і ўрад Рэчы Паспалітай здолелі, нарэшце, стварыць новы абрад. Ён павінен быў стаць першай прыступкай да пераводу з цягам часу ўсяго праваслаўнага насельніцтва ў каталіцызм.

РАСПАЎСЮДЖВАННЕ НОВАГА АБРАДУ

Пасля Брэсцкага сабора барацьба паміж прыхільнікамі новай веры і рупліўцамі праваслаўя працягвалася. Нярэдка яна набывала вялікае напружанне, бо распаўсюджвалася унія прымусова. У гэты час актывізуецца багаслоўская палеміка. У Вільні ў 1597 г. на польскай мове выходзіць кніга П. Скаргі «Сінод Брэсцкі і яго абарона». Крыху раней (у 1596 г.) у Кракаве праваслаўныя ў сваю абарону ананімна выдалі кнігу «Эктэзіс, альбо Кароткае апісанне спрэчак, якія дзея-

ліся на памесным Берасцейскім саборы». У абедзвюх кнігах — у кожнай са свайго пункту гледжання — апісваўся Брэсцкі сабор 1596 г. і давалася яго ацэнка. Для абвяржэння твора П. Скаргі быў выпушчан на польскай мове палемічны трактат Хрыстафора Філалета [1] пад назвай «Апокрысіс, або Водпаведзь на кніжкі аб саборы Берасцейскім».

Аўтар гэтай кнігі быў чалавек адукаваны, знаёмы з грэчаскай і лацінскай мовамі, знаўца Бібліі, твораў «айцоў царквы», царкоўнай гісторыі, дзяржаўнага права, сучаснай айчыннай і заходнееўрапейскай літаратуры. Напісаў «Апокрысіс...» ён па даручэнню К. Астрожскага. Кнігу сваю Х. Філалет прысвяціў кароннаму гетману [2] Яну Замойскаму — каталіку, але даволі верацярпімаму. Прысвячэнне гэта зроблена, як сведчыў Х. Філалет, для таго, каб абараніць свой твор ад «агню чалавечай злосці».

Кніга Х. Філалета знішчалася езуітамі і неўзабаве стала бібліяграфічнай рэдкасцю. Але праз некаторы час (у 1598 ці 1599 г.— дата, месца выдання не пазначаны) яна была перавыдадзена ўжо на тагачаснай беларускай мове. Мэта паўторнага выдання кнігі выразна сфармулявана самім аўтарам: «паказаць нашу нявіннасць, а с супраціўнага боку — злачыннасць»; галоўная ж задача «Апокрысіса...» заставалася ранейшая — абвяржэнне кніг П. Скаргі.

Аўтар «Апокрысіса...» пераканаўча даводзіць, што падрыхтоўка і правядзенне уніі спатрэбіліся рымскаму папе, езуітам і каталіцкаму духавенству не для пошуку «боскіх ісцін», а для абагачэння за кошт парафіян. Ксяндзы і уніяцкія епіскапы паказваюцца Філалетам як людзі хцівыя, амаральныя. Гэты твор сведчыць аб вялікіх літаратурных здольнасцях аўтара. Пазней (Вільня, 1599 і 1600 гг.) супраць «Апокрысіса...» Х. Філалета каталікі і уніяты выступілі з кнігай «Антырызіс». Аўтарам яе быў І. Пацей.

«Апокрысіс...» адыграў важную ролю ў абароне праваслаўя. У ім пераканаўча абвяргаўся адзін з дагматаў рымска-каталіцкай царквы пра вяршэнства рымскага папы. Х. Філалет разумеў важнасць сваёй кнігі. Ён называў яе косцю, якою падавяцца уніяты.

Моцна хвалявалі і абуджалі віленчан, узбройвалі супраць каталіцызму і уніі пропаведзі С. Зізанія. Мітрапаліт адлучыў яго ад царквы, абвінаваціўшы ў ерасі. Але епіскапы, якія засталіся прыхільнікамі праваслаўя,

прызналі С. Зізанія нявінным. Каталіцкая царква актыўна змагалася супраць Сцяфана. Яшчэ ў 1595 г. у Вільні з'явілася кніжка Жаброўскага «Кукаль, які рассявае Зізаній». Але праз год С. Зізаній выдае ў Вільні «Казанні св. Кірыла, патрыярха іерусалімскага аб антыхрысце». Аўтар дасціпна развенчваў «святасць» рымскага папы. Кніга зрабіла моцнае ўражанне не толькі на праваслаўнае насельніцтва, але і на пэўную частку каталіцкага і таму выклікала вялікае абурэнне фанатыкаў. У тым жа годзе ў Вільні з'яўляецца новы адказ католікаў на твор С. Зізанія — «Плевелы Сцяфанкі Зізаня».

У 1597 г. адбыўся судовы працэс над Нікіфарам — паслом усяленскага канстанцінопальскага патрыярха, арыштаваным на Брэсцкім саборы. Кароль у сваёй грамаце назваў яго турэцкім шпіёнам (за непрымірымыя адносіны да уніі).

Пасля смерці М. Рагозы, чалавека нерашучага, яго пераемнікам на пасадзе мітрапаліта кароль прызначыў І. Пацея, энергічнага пашыральніка уніі. Ён адбіраў у праваслаўных епіскапаў маёнткі, пазбаўляў духоўных асоб звання і пасад, замяшчаў іх уніятамі. Улады заўсёды рашуча падтрымлівалі дзеянні мітрапаліта. Праўда, неаднаразовыя спробы І. Пацея авалодаць Кіева-Пячэрскай лаўрай — буйнейшым цэнтрам праваслаўя — не ўдаваліся. Затое паспяхова дзейнічаў ён у Вільні. Мітрапаліт прымусіў пакінуць Троіцкі манастыр праваслаўнае брацтва, якое ў Вільні было галоўным ворагам уніятаў, і паставіў на чале манастыра свайго паплечніка Іосіфа Руцкага. І. Пацей павёў рашучую барацьбу супраць С. Зізанія. Яго пазбавілі магчымасці весці прапаведніцкую дзейнасць.

У 1609 г. усе праваслаўныя цэрквы Вільні, за выключэннем царквы святога Духа (у Свята-Духавым манастыры ўсталявалася Троіцкае праваслаўнае брацтва), апынуліся ў руках уніятаў. Абурэнне супраць мітрапаліта было вялікае. Адзін віленчанін зрабіў замах на яго, але І. Пацей застаўся жывы.

Апрача самага непрыкрытага насілля сродкам барацьбы мітрапаліта супраць праваслаўя была і літаратура. Вядомы яго кнігі: «Унія грэкаў з касцёлам рымскім» (1605 г.), «Гармонія ўсходняй царквы з касцёлам рымскім» (1608 г.). Творы сведчылі аб адукаванасці аўтара.

Пераемнікам І. Пацея на мітрапалічай кафедры стаў І. Руцкі. Каб наблізіць уніяцтва да каталіцызму, ён за-

гадаў пераабсталяваць манастыры па ўзору васіліянскіх[3] — у цэрквах заводзіліся арганы, выкідваліся іканастасы. Скардзіцца на бясчынствы і нахабства уніятаў не было куды, бо суды Рэчы Паспалітай заўсёды прымалі іх бок. Праваслаўная царква знаходзілася ў цяжкім становішчы: парадзела духавенства; на тэрыторыі ўсёй дзяржавы некаторы час быў толькі адзін праваслаўны епіскап — Іосіф Цісароўскі ў Львове. Да яго і звярталіся за пасвячэннем праваслаўныя свяшчэннікі.

У першай трэці XVII ст. разгортваецца найбольш бурная дзейнасць Мялеція Сматрыцкага (каля 1572 г.— 1630 г.) — вядомага царкоўнага іерарха, спачатку праціўніка уніі, а потым яе прыхільніка. Мялецій (у міры — Максім) навучаўся ў Астрожскай школе, потым у езуіцкай акадэміі ў Вільні. Пасля сканчэння яе Максім слухаў лекцыі ў Лейпцыгу, Нюрнбергу і Вітэнбургу, падарожнічаў па Германіі.

У 1610 г. у Вільні пад псеўданімам Феафіл Арталог ён выдае на польскай мове палемічную працу, накіраваную супраць уніі і каталіцызму,— «Фрынас, або Плач усходняй царквы з тлумачэннем дагматаў веры». Таленавітая, напісаная з пачуццём шчырага хвалявання, кніга мела велізарны поспех у праваслаўных чытачоў.

М. Сматрыцкі пастрыгаецца ў манахі (у 1617 ці 1618 г.). У хуткім часе пасля гэтага канстанцінопальскі патрыярх Феафан узвёў Мялеція ў сан полацкага епіскапа. Тут ён неўзабаве праславіўся як таленавіты прамоўца. Аскет, ён займаўся толькі царкоўнымі справамі і карыстаўся вялікім аўтарытэтам.

Унія пашыралася прымусова. Неуніятаў пазбаўлялі маёмасці, праследавалі. Забойцу, які пераходзіў у новую веру, не каралі. У пастанове віленскага з'езда прадстаўнікоў праваслаўнай і евангелісцкай цэркваў, які адбыўся ў 1599 г., гаворыцца, што уніяты нападаюць на міран, асабліва з гарадскога саслоўя. Тых, хто заставаўся ў старой веры, выключалі з цэхаў, забаранялі займацца рамяством, гандлем і нават жыць у гарадах.

Брэсцкая царкоўная унія сустрэла асабліва рэзкае супраціўленне з боку гарадскога насельніцтва, якое аб'ядноўвалася ў брацтвы. Гэта своеасаблівая форма рэлігійна-палітычнага руху ўзнікла ў гарадах Беларусі і Украіны ў адказ на ўзмацненне націску касцёла. З цягам часу яна стала апорай у барацьбе супраць каталіцызму і уніяцтва.

Першыя брацтвы пачалі ўтварацца ў XV ст., а ма-

савае ўзнікненне іх прыпадае на канец XVI і пачатак XVII стст. У гэты перыяд яны з'явіліся ва ўсіх буйных гарадах Беларусі, а ў некаторых з іх дзейнічала па некалькі брацтваў (напрыклад, у Мінску да сярэдзіны XVII ст. іх было 7). Яны аб'ядноўвалі рамеснікаў, гандляроў, духавенства. Кожнае мела свой статут. Паводле яго гараджане пры ўступленні рабілі значныя грашовыя ўзносы, хоць памеры іх не вызначаліся.

Брацтвы разгарнулі шырокую дзейнасць: упрыгожвалі і ўзводзілі новыя цэрквы, манастыры, будавалі дамы прытулку і, галоўнае, вялі барацьбу супраць акаталічвання і апалячвання беларускага і ўкраінскага насельніцтва. Брацкае духавенства выступала перад насельніцтвам з пропаведзямі, заклікала яго супрацьстаяць уніі і ўплыву каталіцызму, адкрыта змагалася супраць свяшчэннікаў новага абраду. Пад уплывам брацтваў гараджане байкатавалі уніяцкі клір. Так, магістрат Мінска ў 1609 г. заявіў, што горад не будзе падпарадкоўвацца уніяцкаму мітрапаліту. Тое ж адбылося ў 1619 г. у Магілёве.

У Беларусі і на Украіне ў процівагу езуіцкім адкрываліся брацкія школы. Першымі такімі навучальнымі ўстановамі былі Львоўская і Віленская (узніклі ў 80-я гг. XVI ст.). Пазней з'яўляюцца школы ў гарадах: Брэсце (1591), Мінску (1592), Магілёве (1597), Шклове (каля 1625), Полацку і Пінску (1633), Оршы (1648) і іншых. Выкладчыкамі гэтых школ члены брацтваў выбіралі прадстаўнікоў духавенства і свецкіх людзей. Тут бясплатна набывалі пісьменнасць дзеці простых гараджан, царкоўнаслужыцеляў, праваслаўнай шляхты. Выкладанне вялося на царкоўнаславянскай і тагачаснай беларускай мовах.

Асветніцкая дзейнасць брацтваў адыграла значную ролю ў развіцці культуры беларускага і ўкраінскага народаў. Пры многіх з гэтых аб'яднанняў адкрываліся друкарні, якія выдавалі царкоўныя кнігі, падручнікі, а таксама палемічныя творы, накіраваныя супраць каталіцызму і уніі.

Брацтвы мелі значныя грашовыя і матэрыяльныя сродкі, якія набываліся за кошт уступных узносаў і ахвяраванняў. Апрача грошай члены брацтваў перадавалі ім на вечнае карыстанне землі, дамы. Многія аб'яднанні кантралявалі цэрквы, іх уладанні, маёмасць, даходы — выбіралі свяшчэннікаў, абмяжоўвалі ім плату за адправы, патрабавалі ад іх прыстойных паводзін, не дапускалі

закладу царкоўнай маёмасці. Здараліся выпадкі, калі брацтвы трымалі пад сваім кантролем нават вышэйшае духавенства.

Аднак не трэба забываць, што брацтвы, якія ствараліся пры цэрквах, былі ў першую чаргу рэлігійнымі ўстановамі. Яны неслі ў масы ідэі міру паміж прыгнечанымі і прыгнятальнікамі, насаджалі і ахоўвалі рэлігійную ідэалогію. Аб'ектыўна яны служылі інтарэсам пануючых класаў, і тут другараднае значэнне мае тое, быў феадал каталік ці праваслаўны.

З другой паловы XVI ст. рэзка ўзмацняюцца класавыя супярэчнасці — вынік узмацнення феадальна-прыгонніцкага і нацыянальна-рэлігійнага ўціску. Першыя формы пратэсту і барацьбы народных мас былі пасіўныя. Гэта ўцёкі прыгонных сялян ад лютых паноў «на ніз» — на Украіну і ў Расію. Колькасць такіх уцёкаў з сярэдзіны XVI да 50-х гг. XVII ст. значна павялічылася і яны прыносілі вялікую шкоду гаспадаркам феадалаў.

У канцы XVI ст. узмацняюцца і актыўныя формы выступлення сялян супраць магнатаў, шляхты, феадальнай адміністрацыі ў форме лакальных стыхійных выступленняў і паўстанняў.

Беларускія сяляне і нізы гарадскога насельніцтва змагаліся супраць прыгнёту магнатаў і шляхты ў саюзе з народнымі масамі і казацтвам Украіны. Многія беглыя падаваліся на Днепр, на востраў Хорціца і ўліваліся ў рады запарожскага войска.

Казацкі рух моцна перашкаджаў панаванню магнатаў і шляхты на Украіне, і ўрад Рэчы Паспалітай усяляк імкнуўся раскалоць казацтва, каб аслабіць яго. Найбольш заможных казакаў (6 тысяч чалавек) урад залічыў на каралеўскую службу, даў ім некаторыя льготы і, вылучыўшы з радавога саставу, запісаў у спецыяльны рэестр. Абвастрылася барацьба паміж казацкімі вярхамі і нізамі. Урад Рэчы Паспалітай якраз і намагаўся выкарыстаць казацкія вярхі супраць антыфеадальнай барацьбы сялянства на Украіне.

У 1595 г. на Украіне пачалося антыфеадальнае казацкае паўстанне пад кіраўніцтвам Севярына Налівайкі. Неўзабаве яно ахапіла і значную тэрыторыю Беларусі. Казакі і сяляне грамілі маёнткі паноў, займалі гарады. 13 снежня штурмам быў узяты Магілёў. Потым, пакінуўшы горад, паўстанцы рушылі на поўдзень у напрамку Быхава, Рагачова, Рэчыцы, на хаду адбіваючы атакі шляхецкіх войск. Ад Рэчыцы яны пайшлі на Петрыкаў,

потым занялі Давыд-Гарадок, Тураў, Лахву, Пінск. У Пінску захапілі каштоўнасці, што належалі К. Цярлецкаму. У ваколіцах горада разграмілі маёнткі яго брата. Паўстанцам аказвалі сур'ёзную дапамогу беларускія сяляне і гарадская бедната, якія далучыліся да казакаў.

У чэрвені 1596 г. пад Лубнамі (на Валыні) С. Налівайка са сваімі атрадамі пацярпеў паражэнне. Яго, разам з бліжэйшымі паплечнікамі, выдалі ворагам заможныя казакі. Паўстанцаў прывезлі ў Варшаву і пасля жорсткіх катаванняў пакаралі смерцю.

Так быў разгромлены народны рух, які адчувальна пахіснуў Рэч Паспалітую, ахапіўшы амаль усю Украіну і значную частку Беларусі. Але працоўныя масы не склалі зброі. 20 чэрвеня 1606 г. у Магілёве ўспыхнула паўстанне рамеснікаў пад кіраўніцтвам Стахора Мітковіча. Гараджане захапілі ратушу, разагналі старую раду і выбралі новую пад старшынствам С. Мітковіча. Барацьба працягвалася да 1610 г. Для падаўлення бунту былі выкарыстаны войскі. Найбольш актыўных удзельнікаў паўстання аддалі пад суд — адных з іх павесілі, другіх пасадзілі ў турму.

Тым часам улады Рэчы Паспалітай і Ватыкан усё больш настойліва праводзілі палітыку акаталічвання і паланізацыі. У ход ішлі найбольш агідныя і жорсткія прыёмы. Нядзіўна, што ўнутранае становішча ў краіне было выключна напружаным і няўстойлівым. У гэтых абставінах восенню 1623 г. у Віцебску даведзены да адчаю прасты люд падняўся на паўстанне і забіў полацкага уніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча.

Паходзіў Іасафат (у міры Іаан) Кунцэвіч з Уладзіміра-Валынскага. Адукацыю ён атрымаў у езуітаў, уступіў у ордэн васіліян, у 1617 г. быў прызначаны епіскапам, а праз год — полацкім уніяцкім архіепіскапам. І. Кунцэвіч — ваяўнічы фанатык — гвалтоўна насаджаў унію. Каб прыдаць сваёй дзейнасці законны выгляд, здолеў атрымаць ад караля грамату, паводле якой усе праваслаўныя цэрквы і манастыры ў межах полацкай епархіі падпарадкоўваліся яму. Распаўсюджваючы унію, І. Кунцэвіч ужываў катаванні, фізічныя пакаранні.

Калі на полацкую праваслаўную кафедру быў прызначаны М. Сматрыцкі, І. Кунцэвіч страшэнна абурыўся. У яго з'явіўся сапернік — высокаадукаваны, таленавіты прамоўца і духоўны пісьменнік, да якога звярнуліся сімпатыі нават тых парафіян, якія лічыліся уніятамі.

У 1619 г. І. Кунцэвіч адправі̆ўся ў Магілёў, каб гвал-

тоўна навязаць яго жыхарам унію. Але яны замкнулі гарадскія вароты; засеўшы на вале, навялі на «душахвата» (так называлі І. Кунцэвіча простыя людзі) гарматы. Гараджане пагражалі яму смерцю, калі не пакіне думку пранікнуць у горад. Прагналі Іасафата і жыхары Оршы, куды ён паехаў з Магілёва з той жа мэтай.

Крайне бесчалавечная рэлігійная палітыка І. Кунцэвіча была настолькі небяспечнай для яго і нават для ўрада Рэчы Паспалітай, што выклікала сур'ёзныя папрокі уніяцкага мітрапаліта І. Руцкага і літоўскага канцлера[4] Льва Сапегі, якіх нельга западозрыць у прыхільнасці да праваслаўя.

З ліста Л. Сапегі (ад 12 сакавіка 1622 г.) да І. Кунцэвіча відаць, што гэта быў адказ архіепіскапу на яго зварот да канцлера, у якім уладыка скардзіўся на вялікія цяжкасці пры гвалтоўным насаджэнні уніі ў Полацку. І. Кунцэвіч патрабаваў ад улад узаконіць бясчынствы і жорсткасці ў адносінах да жыхароў горада, якія ўпарта трымаліся праваслаўя. У прыватнасці, ён прасіў Л. Сапегу ўзаконіць у якасці пакарання нежадаўшых прымаць унію выгнанне з дзяржавы. Канцлер у сваім адказе заявіў, што гэта было б найвялікшым беззаконнем і здзекам, і, у сваю чаргу, запатрабаваў ад неўтаймаванага архіепіскапа хрысціянскага цярпення пры распаўсюджванні уніі. Скардзіўся І. Кунцэвіч і на небяспеку для свайго жыцця ад варожа настроенага праваслаўнага насельніцтва. Канцлер недвухсэнсоўна заяўляе уніяту, што ў гэтым ён вінаваты сам. Л. Сапега быў моцна раздражнёны бясчынствамі архіепіскапа і таму не клапаціўся аб падборы слоў для змякчэння свайго абурэння. Ён перасцерагаў «душахвата» і заявіў, што сваімі жорсткасцямі уніяты наносяць вялікія маральныя страты і сабе і каталіцызму. Канцлер прама заяўляе архіепіскапу, што неспакойная уніяцкая царква прынесла вялікія турботы каталіцкай царкве і дзяржаве. З яго ліста відаць, што Л. Сапега шмат зрабіў для пашырэння уніі, але нават ён быў вымушаны рэзка стрымаць фанатыка.

Папрокі, папярэджанні і перасцярогі канцлера не спынілі лютых праследаванняў І. Кунцэвічам праваслаўнага насельніцтва. Ён адабраў у Полацку ўсе праваслаўныя цэрквы ад брацтваў і перавёў іх у унію. Меў намер зрабіць гэта І. Кунцэвіч і ў Віцебску. Калі ён туды прыехаў, то адразу ж загадаў схапіць, збіць і кінуць у турму праваслаўнага свяшчэнніка за тое, што той патаемна адпраўляў набажэнствы. Гараджане, выведзеныя з цяр-

пення здзекамі І. Кунцэвіча, 12 лістапада 1623 г. паднялі паўстанне. Натоўп у некалькі тысяч чалавек захапіў архірэйскі дом, дзе спыніўся архіепіскап. Труп І. Кунцэвіча правалаклі па вуліцах, потым, з каменем на шыі, кінулі ў Дзвіну. Расправіліся віцябчане і са слугамі ненавіснага «душахвата», разграмілі рэзідэнцыю архірэя.

Вельмі хутка па свеце разнеслася вестка аб смерці І. Кунцэвіча. Урад Рэчы Паспалітай арганізаваў лютыя рэпрэсіі ў адносінах да жыхароў горада. Папа Урбан VIII заклікаў да самых жорсткіх распраў з народам. У сваім лісце да польскага караля ад 10 лютага 1624 г. ён пісаў: «...наймагутнейшы кароль! Ты не павінен утрымлівацца ад мяча і агню. Няхай адчуе ерась, што за злачынствамі следам ідуць пакаранні. Пры такіх агідных злачынствах літасцівасць ёсць жорсткасць»[5].

Аналагічныя пасланні папа рассылаў многім сваім епіскапам, уплывовым свецкім людзям, дзяржаўным дзеячам. Ён асабліва засяроджваў увагу на тым, якую шкоду польскай дзяржаве і каталіцызму можа нанесці сувязь праваслаўных епіскапаў з казакамі.

Старшынёй каралеўскай камісіі для суда над забойцамі І. Кунцэвіча і пакарання іх быў прызначаны Л. Сапега. У Віцебск камісія прыбыла пад моцнай аховай войск. Улады баяліся казакаў, да якіх за дапамогай звярнуліся жыхары горада. Камісіі на расследаванне, суд і выкананне яго рашэнняў хапіла трох дзён. Да смяротнага пакарання было прыгаворана 120 віцябчан: з іх казнілі 20, бо астатнія паспелі ўцячы; больш за 100 гараджан былі пасаджаны ў турму, а 200 — збіты бізунамі. Сядзібы і іншая маёмасць ахвяр канфіскаваліся. Горад быў пазбаўлены ўсіх сваіх прывілеяў, у тым ліку і магдэбургскага права, разбурана ратуша і дзве цэрквы, зняты званы, якія заклікалі народ на паўстанне. За свой кошт жыхары Віцебска былі абавязаны адбудаваць і ўпрыгожыць саборную царкву, перад якой быў забіты І. Кунцэвіч.

У 1643 г. Урбан VIII прызнаў Іасафата блажэнным, а ў 1867 г. Пій IX кананізаваў яго і абвясціў патронам Русі і Польшчы.

Пасля забойства «душахвата» уніяцкае і каталіцкае духавенства аб'явіла яго саперніка М. Сматрыцкага арганізатарам і падпальшчыкам народнай расправы. Гэта адбылося галоўным чынам таму, што творы М. Сматрыцкага былі вострай сацыяльнай сатырай. Натуральна, што яму варта было падумаць аб сваім паратунку ад

праследаванне польскага ўрада. Ён выязджае ў Кіеў і адтуль (у канцы 1623 г.) накіроўваецца на Усход — у падарожжа па святых месцах (у Грэцыю, Палясціну, Егіпет). Тагачасны праваслаўны мітрапаліт кіеўскі Іаў Барэцкі даў М. Сматрыцкаму бласлаўленне на падарожжа. Толькі ў 1625 г. той вярнуўся ў Кіеў. Тут паломнік быў прыняты вельмі варожа. Архімандрыт Кіева-Пячэрскай лаўры Захарыя Капысценскі, аўтар рукапіснага палемічнага трактата «Палінодыя», накіраванага супраць езуіцка-уніяцкай агрэсіі ў абарону праваслаўя, нават не дазволіў яму спыніцца ў сваім манастыры. Разам з І. Барэцкім М. Сматрыцкі быў названы адступнікам і уніятам. Гэта было выклікана наступным. М. Сматрыцкі прывёз з сабой граматы канстанцінопальскага патрыярха, якія адмянялі незалежнасць брацтваў ад мясцовага духоўнага кіраўніцтва і іх непасрэднае падначаленне патрыярху. Абурэнне гарадскога праваслаўнага насельніцтва яшчэ больш узрасло, калі Мялецій апублікаваў іх.

Каб адвесці несправядлівасць абвінавачанняў у свой і М. Сматрыцкага адрас, мітрапаліт (а разам з ім і Мялецій) абвясціў анафему уніятам і католікам. Але гэта не заспакоіла братчыкаў, якія ўпарта лічылі М. Сматрыцкага здраднікам. Віленскае і львоўскае брацтвы паслалі патрыярху багатыя падарункі і просьбу растлумачыць з'яўленне грамат у Мялеція. Патрыярх адпісаў, што ўсе ранейшыя правы брацтваў застаюцца ў сіле.

Пасля гэтых падзей М. Сматрыцкі не адважыўся ехаць у Вільню і жыў у Кіеве ў цяжкім матэрыяльным становішчы. Ён просіць караля прызначыць яго настаяцелем Дэрманскага манастыра. Яму было аб'яўлена, што пасаду ён атрымае, калі пяройдзе ва уніяцтва, што і зрабіў М. Сматрыцкі ў 1627 г. Улады згадзіліся для «карысці справы» прыняць прапанову Мялеція аб тым, каб яго ўчынак трымаўся ў сакрэце. Але абмануць народ не ўдалося. Многія манахі пакінулі манастыр толькі таму, што на чале яго стаў адступнік. У сваёй новай кнізе «Апалогія падарожжа да краёў Усходніх» (Львоў, 1628 г.) М. Сматрыцкі адкрыта раіць далучыцца да саюзу з каталіцызмам.

Але народныя масы Украіны і Беларусі мужна адстойвалі свае нацыянальныя правы, стойка змагаліся з феадальнымі прыгнятальнікамі. Класавая барацьба ў той час зліваласа з процідзеяннем захадам Ватыкана і каталіцкай царквы. Так, у XVI—XVII стст. некалькі

разоў успыхвалі казацкія паўстанні. Іх рашуча падтрымлівалі народныя масы. Гэтыя выступленні мелі непасрэдны ўплыў на абарону праваслаўя, хоць і былі выразнай формай класавай барацьбы. Ф. Энгельс адзначаў, што ў эпоху сярэдневякоўя класавая барацьба ў выглядзе сялянскіх войн і паўстанняў нярэдка прымала рэлігійную афарбоўку. Казацкія выступленні пад лозунгам «За праваслаўную веру!» былі вострай праявай класавай і нацыянальнай барацьбы. Змаганне паўстанцаў супраць свайго лютага ворага — паноў — ідэалагічна выглядала як барацьба супраць каталіцызму і уніі.

Вызваленчая вайна ўкраінскага народа 1648—1654 гг. пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага, якая ахапіла і Беларусь, пацвердзіла адвечнае імкненне ўкраінскага і беларускага народаў вызваліцца з-пад улады польскіх паноў, іх мару аб дзяржаўным адзінстве з рускім народам. Вынікі вызваленчай барацьбы былі замацаваны на Пераяслаўскай радзе, якая адбылася ў 1654 г. Яна аднадушна прыняла рашэнне аб уз'яднанні Левабярэжнай Украіны з Расіяй. Пасля гэтага ў Рэчы Паспалітай прыціхла каталіцкая рэакцыя. Але ў хуткім часе яна зноў набрала сілу. Прадстаўнікі ваяўнічага каталіцызму паставілі перад сабой задачу — канчаткова знішчыць праваслаўе. У той час класавыя супярэчнасці паміж сялянамі і панамі сталі асновай супярэчнасці паміж Украінай і Беларуссю, з аднаго боку, і Рэччу Паспалітай — з другога. Гэта, як і імкненне народаў узнавіць дзяржаўнае адзінства захопленых беларускіх і ўкраінскіх земляў з Расіяй, было асноўнай прычынай барацьбы. Ідэалагічна гэты рух выліваўся ў форме патрабавання нацыянальнага і рэлігійнага адзінства з рускім народам.

У 1686 г. Расія і Рэч Паспалітая заключылі паміж сабой «вечны мір». У адпаведнасці з дагаворам Кіеў, Левабярэжная Украіна, Запарожжа былі прызнаны тэрыторыяй Вялікай Русі, а Правабярэжная Украіна адышла да польскай дзяржавы. Апошняя абавязалася не чыніць перашкод карэнным жыхарам, што трымаліся праваслаўя. Апрача таго за Расіяй агаворвалася права заступацца за праваслаўных (што аблягчала ёй весці барацьбу са сваімі працiўнікамі), якія і раней прасілі аб гэтым (праўда, такія прэтэнзіі Расіі да ўрада Рэчы Паспалітай асабліва адчувальнага ўплыву не мелі).

Нягледзячы на гэты дагавор, кароль Ян Сабескі падтрымліваў езуітаў і уніятаў, якія арганізоўвалі пагромы праваслаўных, адбіралі цэрквы, рабавалі і разбуралі іх.

Уніяцкі мітрапаліт Леў Кішка ў 1720 г. у Замосці склікаў сабор, ходам якога кіраваў папскі нунцый[6] у Польшчы Грымальдзі. Сабор прызнаў адзіна законнай царквой у Рэчы Паспалітай уніяцкую (апрача каталіцкай). Для ўмацавання яе пазіцый было вырашана адкрыць у епархіях духоўныя семінарыі не толькі каб рыхтаваць свяшчэннікаў, але і каб выхоўваць веруючых у духу адданасці каталіцызму. Важнейшая роля ў гэтай справе ўскладалася на манашаскі уніяцкі ордэн васіліян. Пасля сабора езуіты і уніяты яшчэ больш рашуча сталі пераводзіць праваслаўнае насельніцтва ў новую веру. Як і раней, рабілася гэта гвалтоўна. Рымска-каталіцкае духавенства не грэбавала наездамі (рабаўніцтвам) і катаваннем праваслаўных. Над імі былі дазволены ўсялякія здзекі.

Насілле і тэрор дзяржаўных і царкоўных улад (на сацыяльна-класавай аснове) у адносінах да праваслаўнага насельніцтва выклікалі на Правабярэжнай Украіне адчайнае супраціўленне сялян. Яны ўзнімалі грозныя паўстанні, накіраваныя супраць польскіх паноў і касцёла. Найбольш масавыя выступленні адбыліся ў 1734 і 1750 гг.

На сейме ў 1764 г. пры абранні на прастол Станіслава Панятоўскага зноў было пастаўлена пытанне аб праваслаўных. У 1765 г. кароль выдаў грамату, якая вызначала рэлігійныя правы ўкраінцаў. У некалькіх сваіх лістах да уніяцкіх іерархаў кароль загадваў спыніць ганенні на праваслаўных. Але пасля гэтага рэлігійны тэрор яшчэ больш узмацніўся. На варшаўскім сейме 1776 г. была прынята ў якасці закона прапанова кракаўскага епіскапа Солтыка, якая патрабавала аб'яўляць ворагам айчыны кожнага, хто на сейме падыме голас у абарону іншаверцаў. Былі адвергнуты ўсе патрабаванні дзяржаў (у тым ліку і Расіі) аб спыненні праследаванняў дысідэнтаў[7]. Усё гэта выклікала на Украіне народны рух, які ўвайшоў у гісторыю пад назвай «Коліўшчыны» (1768 г.). Гэта было магутнае паўстанне гайдамакаў пад кіраўніцтвам Максіма Залізняка і Івана Гонты. Задушыць паўстанне дапамаглі рускія войскі пад камандаваннем Крачэтнікава і Рэпніна (дарэчы, гэтыя адзіноверцы-дваране разглядалі яго як разбой). Польскія паны люта расправіліся з гайдамакамі. Зноў на Украіне з'яўляюцца уніяты, зноў праследуюцца праваслаўныя свяшчэннікі і веруючыя.

У Расійскай імперыі, з якой у канцы XVIII ст. уз'яд-

наліся Беларусь і Украіна, пануючай рэлігіяй было праваслаўе. Вось чаму, калі перастала існаваць Рэч Паспалітая як дзяржава, уніяты (і сярод іх епіскапы) былі схільны вярнуцца ў праваслаўе. Адразу пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) беларускае насельніцтва з уніяцтва ў праваслаўе не пераходзіла. Імператрыца Кацярына II абвясціла, што ў далучаных да Расіі спрадвечных землях усталёўваецца свабода веры. Адначасова былі дадзены адпаведныя тайныя загады губернатарам. Такой жа лініі прытрымліваўся і праваслаўны беларускі архіепіскап Георгі Канінскі. Гэта было выклікана пэўнымі палітычнымі разлікамі.

Але неўзабаве (у 1780 г.) праваслаўнае духавенства на тэрыторыі Беларусі пачало наступленне на уніятаў. На імя беларускага намесніка Чарнышова (праціўніка уніі) імператрыца выдала рэскрыпт [8], у якім указвалася аб змяшчэнні з пасады уніяцкага архіепіскапа Іасона Смагаржэўскага. Для прызначэння духоўных асоб на пасады ў парафіі ўтваралася спецыяльная кансісторыя [9]. Пры гэтым парафіяне апытваліся, якога свяшчэнніка яны хочуць мець — уніяцкага ці праваслаўнага. Пачалося масавае вяртанне насельніцтва ў старую веру. Гэты рух яшчэ больш узмацніўся пасля канчатковага ўз'яднання Украіны і Беларусі з Расіяй. Амаль усе уніяцкія епархіі былі ліквідаваны. Беларускі уніяцкі архіепіскап І. Лісоўскі ачышчаў падначаленую царкву ад каталіцкіх абрадаў і тым спрыяў пераходу насельніцтва ў праваслаўе. Пасля яго смерці (1809 г.) уніяцкім мітрапалітам стаў луцкі епіскап Г. Кахановіч, а полацкім епіскапам — І. Красоўскі. Г. Кахановіч (памёр у 1814 г.) не здолеў зрабіць што-небудзь істотнае для паступовай ліквідацыі уніі — перашкодзіла Айчынная вайна. Пасля яго мітрапалітам быў прызначаны І. Булгак — заўзяты прыхільнік апостальскай сталіцы.

Уніяцкую царкву ў 1825 г. складалі чатыры епархіі: Брэсцкая, Віленская, Полацкая і Луцкая. Кіраваў яе справамі ў Расіі другі дэпартамент рымска-каталіцкай калегіі. У 1827 г. пратаіерэй [10] і асэсар калегіі ад Луцкай епархіі Іосіф Семашка падаў у названы дэпартамент запіску, якая стала зыходным дакументам для ліквідацыі уніі. У 1829 г. І. Семашка быў пасвячоны ў епіскапы і пастаўлены на чале Брэсцкай епархіі.

Пасля падаўлення польскага паўстання 1830 г. узмацніўся ўплыў праваслаўя. На адміністрацыйныя пасады дазвалялася прызначаць асоб толькі рускага пахо-

джання, а свяшчэннікамі — выхаванцаў рускіх і ўкраінскіх семінарый. Закрываліся многія васіліянскія манастыры, некаторыя з іх (напрыклад, Пачаеўскі) ператвараліся ў праваслаўныя. Была арганізавана Полацкая праваслаўная епархія, на чале якой пастаўлены Пецярбургскі вікарый [11] С. Крыжаноўскі. Разам са свецкімі ўладамі ён стаў актыўна праводзіць уніятаў у праваслаўе.

Урад царскай Расіі быў зацікаўлены ў скасаванні уніі. 13 студзеня 1834 г. адбылося так званае Найвысачэйшае павяленне. Да яго праваслаўным епіскапам давалася сакрэтная інструкцыя, якая патрабавала далучаць уніятаў да праваслаўя асцярожна і няспешна. Уніяцкім епіскапам прадпісвалася неадкладна ачышчаць царкву ад каталіцкіх абрадаў. У 1835 г. з духоўных саноўнікаў быў створаны спецыяльны сакрэтны камітэт па уніяцкіх справах. Ён прыняў пастанову, зацверджаную імператарам, якая патрабавала аднаўляць і ўстанаўліваць ва уніяцкіх храмах іканастасы і выкідваць арганы і званочкі. Пасля смерці мітрапаліта І. Булгака і пінскага епіскапа І. Жарскага (1838 г.), упартых праціўнікаў праваслаўя, старшынёй грэка-каталіцкай калегіі стаў І. Семашка. Яго актыўнымі памочнікамі, якія спачувалі справе ўз'яднання, былі епіскапы А. Зубко (брэсцкі) і В. Лужынскі (аршанскі).

Пытанне аб тым, жадае народ ці не жадае перайсці з уніі ў праваслаўе, нікога не цікавіла. Улічвалі толькі жаданне ці нежаданне уніяцкага духавенства, ды і то, галоўным чынам, вышэйшага. Каб зламаць апазіцыю радавых свяшчэннікаў, іх — па плану І. Семашкі — праводзілі з аднае епархіі ў другую, пры нязгодзе пазбаўлялі прыходаў, высылалі ў рускія губерні, знявольвалі ў манастыры.

12 лютага 1839 г., сабраўшыся ў Полацку, епіскапы і прадстаўнікі духавенства падпісалі так званы «Саборны акт». І. Семашка накіраваў яго ў Найсвяцейшы сінод. Обер-пракурор перадаў гэты акт на разгляд імператара. Апошні даручыў сіноду абмеркаваць справу. 25 сакавіка ён зацвердзіў «Сінадальнае дзеянне». У ім змяшчалася пастанова аб зліцці уніяцкай царквы з праваслаўнай у Беларусі і на Украіне (апрача Галіцыі, якая ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай апынулася ў складзе Аўстрыйскай імперыі).

УНІЯЦКАЯ ЦАРКВА ЗАХОДНЯЙ УКРАІНЫ

Насельніцтва Заходняй Украіны апошнім было вымушана прыняць уніяцтва ў Рэчы Паспалітай. Як і ўсюды, улады і каталіцкае духавенства (асабліва езуіты) рабілі стаўку на здраду, подкуп, насілле, здзекі і нават катаванне. Нарэшце ў 1703 г. быў завершаны перавод мясцовага насельніцтва ў «сапраўдную веру».

У 1772 г., калі Аўстрыя далучыла да сябе Галіцыю, уніяцкая царква ў ёй была ў стане крайняга заняпаду. Духавенства знаходзілася ў поўнай матэрыяльнай і сацыяльнай прыніжанасці. З гэтай прычыны аўстрыйскі ўрад палічыў неабходным правесці шэраг рэформ. Так, у 1777 г. быў адменены абавязак уніяцкіх сельскіх святчэннікаў адбываць нараўне з сялянамі паншчыну. Былі значна ўзбуйнены вельмі дробныя да гэтага часу парафіі, вызначаны грашовыя субсідыі найбольш беднаму духавенству, зменшана залежнасць сельскага кліра ад памешчыкаў (1784 г.).

Паклапаціўся ўрад Аўстрыі і пра адукацыю уніяцкіх святчэннікаў. Яшчэ ў 1777 г. у Вене была ўтворана так званая «Імператарская генеральная грэка-каталіцкая семінарыя» (Барбарэум). Пазней амаль усе прадстаўнікі мясцовага ўкраінскага духавенства былі выхаванцамі гэтага «Барбарэума». Пры Львоўскім універсітэце ў 1784 г. была створана такая ж навучальная ўстанова. У сувязі з гэтым ранейшыя епіскапскія семінарыі ў Львове і Пярэмышлі былі ліквідаваны. Выкладанне ў «генеральных семінарыях» вялося на ўкраінскай мове.

Рэформы значна павысілі прэстыж, матэрыяльны і адукацыйны ўзровень уніяцкага духавенства ў Заходняй Украіне. Аўтарытэт яго быў значна ўзняты і прызначэннем асобага галіцыйскага мітрапаліта. Пазней (у 1856 г.) мітрапаліту М. Лявіцкаму Ватыкан надаў годнасць кардынала. І ўсё ж уніяцкае духавенства не атрымала роўных правоў з каталіцкім. Рымская курыя [1] і ўрад Аўстрыі, а пазней і Аўстра-Венгрыі заўсёды глядзелі на унію як на штосьці непараўнальна ніжэйшае за каталіцызм, хоць і падтрымлівалі яе аўтарытэт.

Наступае XIX ст., на гістарычную арэну выходзіць рабочы клас. Паступова ён узначаліў рэвалюцыйны рух усіх прагрэсіўных сіл грамадства. У гэтых умовах незвычайна актывізуецца дзейнасць уніяцкай царквы на

тэрыторыі Заходняй Украіны. Афіцыйна яна называлася грэка-каталіцкай і была адной з самых рэакцыйных сіл, варожых рэвалюцыйнаму руху. Уніяцкая царква па-ранейшаму была падпарадкавана непасрэдна Ватыкану, які адной з найважнейшых задач лічыў барацьбу супраць камунізму. У той жа час з яе не знімаліся і іншыя задачы, галоўная — быць плацдармам для наступлення каталіцызму на Усход.

Узмацненне экспансіянізму уніяцкай царквы, спробы духавенства развянчаць камуністычную ідэалогію, якая ўсё больш і больш авалодвала чалавецтвам, патрабавалі, каб яе ўзначаліў ваяўнічы рэакцыянер, непрымірымы вораг рэвалюцыі, палітычны авантурыст самага высокага класа. Ватыкан здолеў знайсці адпаведную кандыдатуру. Ім стаў мітрапаліт Андрэй (да пастрыжэння — Раман) Шаптыцкі (1865—1944 г.). Амаль паўстагоддзя ён узначальваў уніяцкую царкву. Гэта быў не толькі першаіерарх, але і буйны памешчык, банкір. Ён належаў да найбагацейшай апалячанай арыстакратычнай сям'і, якая па традыцыі памятала аб тым, што па свайму паходжанню звязана з украінскімі феадальнымі вярхамі. Сярод яго продкаў былі і вядомыя дзеячы грэка-каталіцкай царквы. У маладосці ён быў афіцэрам Аўстра-Венгерскай арміі, нязменным наведвальнікам арыстакратычных салонаў Вены і Парыжа. На прагнага да ўлады, славалюбнага графа вялікі ўплыў у выбары кар'еры аказала яго маці — рэўнасная каталічка, а таксама сябры і блізкія, у тым ліку кардынал Чацкі і родны дзядзька граф У. Ледахоўскі (пазней ён стаў генералам ордэна Ісуса).

На прыёме ў Льва VIII Р. Шаптыцкі паведаміў яго свяцейшаству аб сваім намеры стаць уніяцкім свяшчэннікам, каб праводзіць палітыку Рыма на Украіне, а потым і ў Расіі, з тым каб пашырыць Брэсцкую царкоўную унію. Пачынаць сваю «высокую» місію Р. Шаптыцкі збіраўся ў Галіцыі. Папа меў прыемнасць блаславіць маладога чалавека.

Яшчэ да прыняцця духоўнага сану Р. Шаптыцкі па прапанове езуітаў наведвае Расію, каб азнаёміцца на месцы са становішчам на Усходзе. Апрача таго граф меркаваў аднавіць старыя і наладзіць новыя сувязі, а таксама выканаць заданне разведкі аўстрыйскага генеральнага штаба. Будучы мітрапаліт выявіў выдатныя шпіёнскія здольнасці — сабраў каштоўную інфармацыю для абодвух сваіх гаспадароў.

Любімец аўстрыйскай імператрыцы Р. Шаптыцкі ў 1888 г. пакідае вайсковую службу, мяняе веравызнанне і пастрыгаецца ў манахі ў Дабрамільскім манастыры ордэна васіліян. З гэтага часу пачынаецца яго хуткая духоўная кар'ера. А. Шаптыцкі атрымлівае прызначэнне на пасаду ігумена Львоўскага васіліянскага манастыра. У 1898 г. памёр уніяцкі мітрапаліт кардынал Сембратовіч. Заняць вакантную высокую пасаду Ватыкан рыхтаваў А. Шаптыцкага. З гэтай мэтай у 1899 г. ён становіцца епіскапам Станіслаўскай епархіі. Потым, у 1901 г., Ватыкан і імператарскі ўрад Аўстра-Венгрыі прызначылі графа мітрапалітам.

У далёка ідучых палітычных задумах А. Шаптыцкага планы нацыяналістаў спалучаліся з намерам пашырэння уніі на Усход. На думку маладога уніяцкага першаіерарха, гэта давала магчымасць утварыць украінскую буржуазна-нацыяналістычную дзяржаву (на тэрыторыі ўсёй Украіны) пад вярхоўным апякунствам габсбургскай імперыі. Ён падтрымлівае цесную сувязь з украінскімі буржуазнымі нацыяналістамі, бласлаўляе іхнія варожыя народу дзеянні. Яго рэзідэнцыя ў Львове была не толькі рэлігійным цэнтрам, але і сапраўдным штабам нацыяналізму. Дзейнічаў мітрапаліт настойліва і даволі спрытна. Ён упарта прэтэндаваў на званне духоўнага бацькі ўкраінскага народа, абаронцы яго правоў, выстаўляў сябе прыхільнікам навукі, літаратуры і мастацтва. Так, у 1905 г. пры саборы святога Юра па ініцыятыве А. Шаптыцкага быў урачыста адкрыты царкоўны музей. Тут былі сабраны, па яго ўказцы, старыя абразы з гарадскіх і сельскіх цэркваў, каштоўныя ўзоры візантыйскага іканапісу і народнага ўкраінскага мастацтва. Па загаду мітрапаліта на іх месца былі адпраўлены зробленыя ў Ватыкане вобразы святых. Мэту, з якой ствараўся музей, А. Шаптыцкі тлумачыў сваім жаданнем захаваць культурныя каштоўнасці і такім спосабам абагаціць духоўнае жыццё народа. Неўзабаве па яго падказцы царкоўны музей быў перайменаваны ва «Украінскі нацыянальны музей». Буржуазныя нацыяналісты ў сваім друку на ўсе лады хвалілі мітрапаліта, падкрэслівалі яго заслугі ў стварэнні музея, усхвалялі яго дзейнасць у «адраджэнні культуры ўкраінскага народа» і ператварылі музей у адзін са сваіх цэнтраў.

На шум, які паднялі гэтыя «сябры ўкраінскага народа» вакол «выдатнага» ўкладу А. Шаптыцкага ў развіццё нацыянальнай культуры, звярнуў увагу У. І. Ленін.

У сваіх нататках ён пісаў: «У Львове заснаваны царкоўна-археалагічны музей, які Рада называе «нацыянальным» (украінскім). Заснавальнік — Андрэй Шаптыцкі, мітрапаліт уніяцкі, «правадыр клерыкальнай партыі ў Галіцыі»[2]. Выкрываючы сапраўдную сутнасць лозунга нацыянальнай культуры ў эпоху імперыялізму, У. І. Ленін сцвярджаў: «Лозунг нацыянальнай культуры ёсць буржуазнае (а часта і чарнасоценна-клерыкальнае) ашуканства. Наш лозунг ёсць інтэрнацыянальная культура дэмакратызму і сусветнага рабочага руху»[3].

Лозунг нацыянальнай культуры ў эпоху класавых баёў пралетарыяту аказваецца буржуазным, а то і чарнасоценна-клерыкальным з той прычыны, што нацыянальная культура ў класавым грамадстве не можа быць аднароднай. Тут нельга не прыгадаць класічную фармуліроўку У. І. Леніна: «У *кожнай* нацыянальнай культуры ёсць, хоць бы не развітыя, *элементы* дэмакратычнай і сацыялістычнай культуры, бо ў *кожнай* нацыі ёсць працоўная і эксплуатуемая маса, умовы жыцця якой непазбежна параджаюць ідэалогію дэмакратычную і сацыялістычную. Але ў *кожнай* нацыі ёсць таксама культура буржуазная (а ў большасці яшчэ чарнасоценная і клерыкальная) — прытым не ў выглядзе толькі «элементаў», а ў выглядзе *пануючай* культуры. Таму «нацыянальная культура» наогул *ёсць* культура памешчыкаў, паноў, буржуазіі»[4]. Вось чаму можна гаварыць толькі пра клопаты А. Шаптыцкага аб развіцці буржуазна-клерыкальнай культуры на Украіне.

Вядома, што ў музеі сабрана багатая калекцыя ўкраінскага жывапісу і іншых культурных помнікаў. Але гэтым музей абавязаны не А. Шаптыцкаму, а дырэктару музея прафесару І. Свянціцкаму і яго паплечнікам. Грашовыя сродкі на ўтрыманне музея і службоўцаў былі мізэрныя. І. Свянціцкі два разы пабываў у СССР. Ён захапляўся бурным развіццём навукі і мастацтва Савецкай Украіны. Прафесар, сумленны вучоны марыў аб шырокім развіцці культуры ў Заходняй Украіне.

На самай справе для мітрапаліта ўся гэтая культурніцкая дзейнасць была толькі тактычным ходам, толькі сродкам набыцця папулярнасці. Верны абаронца інтарэсаў свайго класа, ён прыкладаў усе намаганні, каб стрымліваць рэвалюцыйны рух народных мас, адцягнуць іх увагу ад барацьбы за сваё вызваленне. Спрытны дэмагог, мітрапаліт прапагандаваў нацыяналістычныя ідэі, заклікаў да экспансіі на Усход. Яго марай было

стварыць «самасційную Украіну» і перавесці праваслаўных у лона рымска-каталіцкай царквы.

Як спрытны палітык, ён ужо ў 1905 г. прадказваў непазбежнасць рэвалюцыі ў Расіі. Выконваючы сакрэтны загад Пія X, А. Шаптыцкі робіць спробы ўстанавіць сувязь з найбольш аўтарытэтным рускім праваслаўным духавенствам, асабліва епіскапамі, пераканаць іх, што толькі з дапамогай каталіцкай царквы дзяржаўная ўлада зможа стрымаць і задушыць разбуральныя сілы рэвалюцыі. Ён ніколі не забываўся аб распаўсюджванні уніі на тэрыторыі Расійскай імперыі.

17 красавіка 1905 г. царом быў падпісаны «Найвысачэйшы ўказ аб умацаванні асноў верацярпімасці». Услед за ім з'явілася «Найвысачэйшае зацверджанае 17 красавіка палажэнне Камітэта міністраў аб умацаванні асноў верацярпімасці».

Памятаючы пра гэтыя ўрадавыя дакументы, А. Шаптыцкі інкогніта неаднаразова наведваў Расію, дзе займаўся стварэннем не толькі ўкраінскай, але і «рускай уніяцкай царквы». У час паездак ён завербаваў некаторых праваслаўных свяшчэннікаў (у іх ліку Уладзіміра Абрыкосава) і некалькіх прадстаўніц арыстакратычных колаў. Аб сваіх поспехах А. Шаптыцкі інфармаваў Пія X. Пры гэтым мітрапаліт выклаў папе свой план: у «дзень X» (так умоўна называлі ў Ватыкане дзень падзення царскага самаўладства ў Расіі і ўстанаўлення буржуазнай рэспублікі) арганізаваная ім, А. Шаптыцкім, руская уніяцкая царква будзе легалізавана ў форме рускіх экзархатаў і ўкраінскага патрыярхату ў Кіеве.

Пій X быў задаволены дакладам мітрапаліта і вусна даў яму паўнамоцтвы на стварэнне адпаведных царкоўных устаноў. У Ватыкане А. Шаптыцкі атрымаў сакрэтны дакумент, у якім зафіксоўваліся яго паўнамоцтвы ў межах Расіі. Папа паведаміў галаве уніяцкай царквы аб падрыхтоўцы некаторых еўрапейскіх краін да вайны з Расіяй і ўдакладніў планы пашырэння уніі на яе тэрыторыі. Ажыццяўленню гэтых задум поўнасцю спачуваў і імператар Франц-Іосіф. У спецыяльным мемарандуме, які быў прадстаўлены імператару 15 жніўня 1914 г. праз міністэрства замежных спраў, А. Шаптыцкі развіў і абгрунтаваў гэтыя ідэі. Мітрапаліт актыўна падтрымліваў агрэсіўныя планы Аўстра-Венгрыі аб далучэнні да Галіцыі астатняй Украіны.

Мітрапаліт даўно ўжо шырока разгарнуў падрыхтоўку уніяцкага кліру да вайны з Расіяй. У першую чар-

гу ён павёў барацьбу супраць русафільскіх настрояў. Перад уніяцкім духавенствам ставілася задача выхавання моладзі ў духу ваяўнічага каталіцызму і нянавісці да рэвалюцыйна настроенага народа, распальвання рэлігійнага фанатызму. Па ўказанню А. Шаптыцкага былі створаны шматлікія жаночыя уніяцкія арганізацыі: «сясцёр-студытак», «святога Іасафата» (Кунцэвіча), «прасвятога сямейства», «міраносіц» і іншыя.

З бласлаўлення уніяцкага мітрапаліта ўкраінскія буржуазныя нацыяналісты ў 1913 г. стварылі шырока разгалінаваную па ўсёй Галіцыі вайсковую арганізацыю нацыяналістычна настроенай моладзі — «Украінскія січавыя стральцы» (УСС). Так яшчэ да першай сусветнай вайны А. Шаптыцкі збірае вакол сябе розных авантурыстаў з мэтай распаўсюджвання ў Расіі каталіцызму.

Клапаціўся мітрапаліт аб падрыхтоўцы каталіцкіх місіянераў і шпіёнаў. За кошт уніяцкай царквы ён накіроўвае найбольш здольных «січавікоў» у каталіцкія універсітэты Інсбрука, Вены, Рыма. Місіянераў у строгім сакрэце рыхтавалі таксама і львоўская духоўная семінарыя, манастыры ў Галіцыі. Засылка на Украіну і ў рускія губерні сваіх «місіянераў» дала магчымасць А. Шаптыцкаму напярэдадні першай сусветнай вайны стварыць сетку рэзідэнтаў, якія збіралі інфармацыю пра ўсё, што там адбывалася.

Мітрапаліт наведаў краіны, дзе жылі ўкраінцы, што раней пакінулі радзіму ў пошуках работы,— Германію, Данію, Канаду, а таксама уніяцкія епіскапіі ў Букавіне і Закарпацці. Рабіў ён паездкі і ў Расію (па заданню Ватыкана і аўстрыйскага генштаба), інструктаваў рэзідэнтаў. На чале сваёй агентуры А. Шаптыцкі паставіў езуіта Вярцінскага; праўда, у хуткім часе руская контрразведка выкрыла яго як нямецкага шпіёна. Для атрымання разведвальных матэрыялаў мітрапаліт заводзіць сувязі з арыстакратамі, прыдворнымі (напрыклад, з князямі Абаленскімі).

У царскай Расіі дзейнасць уніятаў была забаронена. З гэтай прычыны ўладыка дабіваўся дазволу ўрада на адкрыццё хоць бы аднаго прыходу. Ён здолеў у Пецярбургу зацікавіць асобы, якія належалі да ўплывовых колаў. З іх дапамогай ён гэты дазвол атрымаў. Паблізу сталіцы была пабудавана першая уніяцкая капліца. Яе настаяцелем стаў былы праваслаўны свяшчэннік Дзейбнер, які меў некаторы поспех у справе павелічэння сваёй паствы, агітуючы за пераход ва уніяцкую веру пецяр-

бургскіх арыстакратаў. Капліца стала цэнтрам, у якім Дзейбнер збіраў каштоўную шпіёнскую інфармацыю. Уважліва і клапатліва А. Шаптыцкі інструктаваў свайго рэзідэнта.

Найбольш актыўным шпіёнам уніятаў у Расіі быў свяшчэннік Леанід Фёдараў, які стварыў шырокую разведвальную сетку. Сярод завербаваных ім агентаў у Пецярбургу былі блізкія да царскага двара арыстакраткі. Самымі дзейнымі супрацоўнікамі мітрапаліта былі княгіня Валконская, двое яе сыноў, княгіня Наталля Ушакова, манашкі патаемнага манастыра ордэна дамініканак [5] у Маскве і яго ігумення Абрыкосава, яе былы муж — свяшчэннік Уладзімір Абрыкосаў. Н. Ушакова, напрыклад, па заданню А. Шаптыцкага сустракалася ў Рыме з папай.

Галоўнай жа даверанай асобай А. Шаптыцкага ў Расіі быў энергічны і спрытны Л. Фёдараў, які займаўся збіраннем інфармацыі для аўстрыйскай разведкі. Каштоўныя звесткі Л. Фёдараву перадавалі прыбліжоныя царыцы. З ім, напрыклад, патаемна супрацоўнічала фрэйліна Юлія Данзас. Яна шмат чаго ведала пра царскую сям'ю, была дасведчана аб махлярстве міністраў, прыгодах Распуціна.

Калі 1 жніўня 1914 г. Германія аб'явіла вайну Расіі, А. Шаптыцкі выпусціў адозву, у якой заклікаў украінцаў «аддаць усе свае матэрыяльныя і маральныя сілы» на вайну за перамогу Германіі над Расіяй. «...Святаюрскі будынак,— пісаў Я. Галан,— робіцца адным з аддзелаў нямецкага генеральнага штаба. Тут за таўшчэзнымі сценамі праводзіцца карпатлівая работа: устанаўліваюцца маршруты для будучых місіянераў-канквістадораў; тут дэталёва абмяркоўваюцца захады для разлажэння рускага тылу; тут дзень і ноч ідзе падрыхтоўка для нанясення смяротнага ўдару праваслаўнай царкве»[6]. І адначасова «над усім гэтым дамінуе адна ідэя, якая даўно ўжо выпрацавана і самым дэталёвым чынам прадумана ва ўрадавых кабінетах Ватыкана, Берліна і Вены: Шаптыцкі ў ролі уніяцкага экзарха ўсёй Украіны і ўсёй Расіі, ад Збруча да Уладзівастока»[7]. Мітрапаліт акрапіў «святою вадой» сцяг украінскіх січавых стральцоў і блаславіў іх на смерць за аўстрыйскага імператара і папу рымскага.

Аўстра-венгерская армія пад націскам рускіх войск панічна адступала. У жніўні 1914 г. яна здала Львоў.

Руская контрразведка добра ведала А. Шаптыцкага

як замежнага шпіёна. Камандаванне сачыла за яго захадамі, актыўнасць якіх усё ўзрастала. Каб пакласці канец падрыўной дзейнасці мітрапаліта, у яго рэзідэнцыі быў зроблен вобыск, а 19 верасня першаіерарха вывезлі са Львова ў Кіеў у салон-вагоне. Яго суправаджалі духоўнік, рэктар уніяцкай семінарыі Бацян, асабісты сакратар манах Іосіф Гродскі і слуга. Уладкаваўся «святы айцец» у лепшай гасцініцы горада.

У Кіеве ён павінен быў адбываць «ссылку». Тым не менш мітрапаліт-шпіён патаемна працаваў над пашырэннем каталіцызму і уніі. А. Шаптыцкага перавозяць у Курск, затым Суздаль і, нарэшце, у Яраслаўль. Але і там ён не пакідаў спроб арганізаваць уніяцкія прыходы. Усе гэтыя гады А. Шаптыцкі, якога папа і уніяцкія дзеячы імкнуліся выдаць за пакутніка, жыве ў фешэнебельных кватэрах без якога-небудзь зняволення. На ўтрыманне гэтага «пакутніка» царскі ўрад асігнаваў 4 тысячы рублёў у год — суму, якую атрымлівалі епіскапы ў Расіі ў якасці гадавога «жалавання».

Тым часам у Львове былі знойдзены дакументы, якія выкрывалі мітрапаліта як аўстрыйскага шпіёна. Царскі ўрад даў зразумець Ватыкану, што яго клопаты аб дазволе А. Шаптыцкаму выехаць у Рым або якую-небудзь нейтральную дзяржаву не будуць задаволены. Уніяцкі першаіерарх на працягу ўсяго часу «ссылкі» трымаў цесную сувязь са сваім памагатым Л. Фёдаравым. Апошняга А. Шаптыцкі разлічваў прызначыць экзархам руска-каталіцкай царквы на выпадак падзення самадзяржаўя і ўсталявання ў Расіі буржуазнай рэспублікі.

Пасля лютаўскай рэвалюцыі Ватыкан прызнаў Часовы ўрад. Папская курыя разлічвала, што ў Расіі будзе ўстаноўлена буржуазная рэспубліка, а з падзеннем царызму ўплыў праваслаўнай царквы будзе аслаблены і таму адкрыецца шырокая магчымасць для каталіцкай прапаганды ў краіне і для ажыццяўлення уніі цэркваў.

Часовы ўрад вызваляе А. Шаптыцкага з «ссылкі» (8 сакавіка 1917 г.) і дазваляе пакінуць Расію (1 красавіка). Але мітрапаліт не спяшаецца вяртацца ў Львоў. Ён лічыць за неабходнае легалізаваць руска-каталіцкую і ўкраінска-каталіцкую цэрквы ў Расіі. А. Шаптыцкі прыязджае ў Петраград. Там ён сустракаецца спачатку са сваім нелегальным экзархам Бацяном, а потым з Л. Фёдаравым, каталіцкім мітрапалітам у сталіцы баронам Э. Ропам, каталіцкім епіскапам Цепляком і ксяндзом Буткевічам. Нягледзячы на тое, што прыхіль-

нікаў тайна створанай руска-каталіцкай царквы было вельмі мала, А. Шаптыцкі вядзе перагаворы з Часовым урадам аб прызнанні яе і легалізацыі. Буржуазны ўрад згаджаецца даць ёй правы на існаванне ў межах Расіі. Даўні план апостальскай сталіцы аб стварэнні руска-каталіцкай царквы, хоць і з вельмі невялікай колькасцю веруючых, пачынае ажыццяўляцца.

З 29 па 31 мая 1917 г. у Петраградзе засядаў скліканы А. Шаптыцкім і пад яго старшынствам уніяцкі «сабор». На ім прысутнічала толькі восем свяшчэннікаў. Тым не менш дэлегаты выканалі патрабаванне ўладыкі і прызначылі Л. Фёдарава экзархам уніяцкай царквы ў Расіі. Палітыканы ад рэлігіі практычна нікога не прадстаўлялі. Колькасць парафіян была мізэрнай, прычым яна не павялічвалася. Так, у дакладзе Л. Фёдарава Пію X (ад 5 сакавіка 1922 г.) названы такія лічбы: у Петраградзе прыхільнікаў уніі было 70, Маскве — 100, Сарataве — 15 і каля 200 чалавек жыло ў іншых гарадах. «Сабор» у сваіх пастановах і ў прынятым ім статуце новага адгалінавання каталіцызму падкрэсліваў яго рускі нацыянальны характар. У статуце толькі ўпамінаўся рымскі папа як галава новага веравызнання, а набажэнства ў ёй і адпраўленне абрадаў нічым не адрозніваласа ад прынятых у праваслаўнай царкве. Нават святыя, што належалі толькі да праваслаўнай царквы (напрыклад, Аляксандр Неўскі, Сергій Раданежскі), былі прызнаны і руска-каталіцкай царквой.

Н. Бок, паверены ў справах Расіі пры Ватыкане, у дэпешы міністру замежных спраў Часовага ўрада М. Цярэшчанку ад 4 (17) ліпеня 1917 г. паведаміў аб уніяцкай палітыцы папства. Ён адзначыў, што мітрапаліт А. Шаптыцкі выкарыстаў сваё знаходжанне ў Расіі, асабліва пасля лютаўскай рэвалюцыі, для арганізацыі уніяцкай царквы і рукапалажэння свяшчэннікаў, а Л. Фёдарава пасвяціў у сан епіскапа. На Расію Ватыкан ніколі не пакіне глядзець, як на пустую ніву, якая можа даць яму калі-небудзь багатае жніво, пісаў у сувязі з гэтым Н. Бок.

Для стварэння асобнай, незалежнай ад рускай, украінскай каталіцкай царквы на чале з кіеўскім патрыярхам А. Шаптыцкі пакідае Петраград. Падзякаваўшы галаву Часовага ўрада князя Г. Львова, міністраў А. Керанскага, П. Мілюкова, М. Цярэшчанку, ён накіроўваецца на Украіну. Там першаіерарх спадзяваецца здзейсніць свае мары.

У Кіеве ў той час фарміравалася нацыяналістычная Цэнтральная рада. Таму ўкраінскія нацыяналісты былі заклапочаны значна больш тэрміновымі справамі, а не стварэннем украінскай каталіцкай царквы. Але А. Шаптыцкі і там знайшоў разуменне, падтрымку. Цэнтральная рада наладзіла яму ўрачыстую сустрэчу. Яе старшыня Грушэўскі заявіў, што ў асобе А. Шаптыцкага нацыяналісты бачаць свайго духоўнага бацьку і чакаюць прызначэння яго на пасаду мітрапаліта кіеўскага. Такім чынам, уладыка адразу знайшоў агульную мову з нацыяналістычнымі верхаводамі.

Цэнтральная рада ахвотна дала А. Шаптыцкаму дазвол на стварэнне уніяцкіх прыходаў у гарадах Украіны (Адэсе, Екацярынаславе, Вінніцы, Камянец-Падольску) і на дзейнасць генеральнага вікарыята грэка-каталіцкай царквы ў Кіеве. Мітрапаліт пачынае энергічна ствараць прыходы і вікарыят. У вельмі кароткі тэрмін у Кіеве быў пабудаваны уніяцкі храм. Першаіерарх сустракаецца з уплывовымі дзеячамі праваслаўя на Украіне і настойліва спрабуе пераканаць іх у неабходнасці саюза з каталіцкай царквой.

Першая уніяцкая епархія была ўтворана ў Кіеве. Яе ўзначальваў Цагельскі з намеснікам Шчапанюком — манахам ордэна васіліян. Яны і пачалі ствараць уніяцкія парафіі. Паколькі парафіян-уніятаў там не было, то вакол створаных прыходаў групаваліся січавыя стральцы. Уніяцкія парафіі хутка зрабіліся цэнтрамі контррэвалюцыі.

9 ліпеня 1917 г. А. Шаптыцкі выехаў з Расіі ў нейтральную Швецыю, а адтуль — у Швейцарыю. Тут ён сустрэўся з генералам ордэна езуітаў У. Ледахоўскім, якому папа рымскі Бенядзікт XV даручыў выслухаць А. Шаптыцкага аб яго знаходжанні і дзейнасці ў Расіі. Даклад быў аптымістычны. Мітрапаліт далажыў, што пасля лютаўскай рэвалюцыі ў Расіі склалася спрыяльная абстаноўка для пашырэння каталіцызму. Вялікія надзеі ўскладаў мітрапаліт на ўкраінскіх нацыяналістаў, якія рабілі ўсё для стварэння «самасційнай» Украіны пад аўстрыйска-нямецкім пратэктаратам. Праз некалькі дзён ён быў ужо ў Вене, дзе дакладваў імператару аб сваіх поспехах. Карл I быў задаволены дзейнасцю А. Шаптыцкага і ўзнагародзіў яго ордэнам Леапольда.

Ватыкан неадкладна распачаў актыўную адпаведную дзейнасць. Бенядзікт XV загадаў усім службам апосталь-

скай сталіцы прыняць удзел у акаталічванні Расіі. Тэрмінова рыхтаваліся каталіцка-уніяцкія агенты для пашырэння «сапраўднай веры» на Усходзе. Ужо 15 кастрычніка 1917 г. у Ватыкане быў створаны Папскі ўсходні інстытут, які павінен быў прыступіць да падрыхтоўкі місіянераў для Расіі.

У Львоў А. Шаптыцкі прыехаў толькі 10 верасня 1917 г. Тут яму была наладжана пампезная сустрэча. Прыблізна праз месяц пасля свайго вяртання А. Шаптыцкі наведвае січавых стральцоў. Сустрэлі яго з вялікай помпай. Мітрапаліт урачыста акрапіў «святой вадой» сцяг, на якім былі злучаны два гербы — Кіева і Галіцкай зямлі. Гэта сімвалізавала сабою «саборную Украіну», як любілі называць Украіну нацыяналісты.

Пасля працэдуры асвячэння А. Шаптыцкі выступіў з прамовай, у якой заклікаў січавікоў быць гатовымі да паходу ў складзе аўстра-нямецкіх войск на Украіну, дзе іх чакае трыумфальны ўезд у залатагаловы Кіеў. На самай жа справе многіх стральцоў, якіх мітрапаліт блаславіў на братазабойчую вайну, чакала бясслаўная смерць.

Пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі Ватыкан апынуўся ў адным лагеры з тымі, хто ставілі сваёй задачай звяржэнне Савецкай улады і рэстаўрацыю капіталізму. Ватыкан быў, як і ўся міжнародная рэакцыя, моцна ўстрывожаны няўхільным ростам уплыву камунізму ва ўсім свеце. Галоўнымі напрамкамі ў палітычнай дзейнасці апостальскай сталіцы сталі: антыкамунізм, антысаветызм і унія.

Каталіцкае духавенства прымала актыўны ўдзел у загаворах супраць Савецкай улады, абрушвала на яе з касцёльных амбонаў паток праклёнаў. Кіраваў падрыўной работай у маладой Савецкай краіне петраградскі мітрапаліт (з 1917 г.) барон Э. Роп, які разам з петраградскім каталіцкім епіскапам Цепляком і ксяндзом Буткевічам падтрымліваў цесныя сувязі з рускай рэакцыяй і англійскай разведкай. Існавала нават цэлая контррэвалюцыйная арганізацыя, якая складалася з каталіцкага духавенства і фанатычна настроеных верующых. Узначальваў яе Э. Роп, які атрымліваў указанні ад рымскага папы праз Варшаву. Антысаветчыкі былі выкрыты і панеслі заслужанае пакаранне, а барон быў высланы з Расіі.

Увесь апарат Ватыкана, які займаўся справамі Усходу, па ўказанню папы Бенядзікта XV быў перабудаваны.

Для барацьбы супраць народнай улады, а таксама акаталічвання Украіны, Беларусі, Расіі ствараецца Кангрэгацыя па справах усходняй царквы. Гэта быў сапраўдны штаб антысаветчыкаў на чале з непрымірымым ворагам Савецкай краіны кардыналам Яўгеніем Тысеранам, прафесіянальным ваенным разведчыкам, былым афіцэрам генеральнага штаба Францыі. Кангрэгацыяй Я. Тысеран кіраваў на працягу трыццаці гадоў. Ён нястомна распрацоўваў усё новыя і новыя планы распаўсюджвання каталіцызму на Усходзе. У той час касцёл у Краіне Саветаў падпарадкоўваўся папскаму нунцыю ў Варшаве Ахілу Рацці. Цэнтрам рымска-каталіцкай эміграцыі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі робіцца Варшава, куды перабралася і Петраградская рымска-каталіцкая акадэмія.

Актывізуе сваю дзейнасць Л. Фёдараў. Ён падтрымлівае цесныя сувязі з Ватыканам і А. Шаптыцкім. Экзарх робіць настойлівыя спробы далучыць да уніі праваслаўнае духавенства, піша для папы і Ватыкана справаздачы. Для больш надзейнай сувязі ён пасылае ў апостальскую сталіцу уніяцкага свяшчэнніка У. Абрыкосава. Апрача гэтага экзарх падтрымліваў зносіны са шпіёнамі імперыялістычных дзяржаў. Для згуртавання антысавецкіх сіл Л. Фёдараў з дапамогай Ю. Данзас стварае ў Маскве так званы «дом вучоных». Ён меркаваў, што ў ім могуць бяспечна збірацца розныя палітычныя авантурысты, праз якіх Ватыкан будзе мець магчымасць атрымліваць шпіёнскія матэрыялы. Але неўзабаве падрыўная дзейнасць экзарха была выкрыта органамі Савецкай улады. Ён быў асуджаны, Ю. Данзас выслана за межы краіны, а патаемны манастыр ордэна дамініканак распушчаны.

Мітрапаліт А. Шаптыцкі і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі па-ранейшаму не пакідае захадаў стварыць на Украіне уніяцкі патрыярхат: патрыярхам, як і раней, ён уяўляў толькі сябе. 9 снежня 1917 г. уладыка звяртаецца да уніяцкага духавенства з сакрэтным «пастырскім пасланнем», у якім паведаміў кліру, што набліжаецца наступленне аўстра-нямецкіх войск на Украіну, якое ставіць перад грэка-каталіцкім духавенствам новыя задачы і адкрывае новае поле дзейнасці. Мэта, якую мітрапаліт паставіў перад клірам на выпадак заваявання немцамі Украіны (у чым А. Шаптыцкі не сумняваўся), была нязменнай — пашырэнне уніі.

У лютым 1918 г. нямецкія войскі парушылі дагавор

аб перамір'і і захапілі значную частку Украіны. Разам з акупантамі прыйшлі стральцы. Січавікі заяўлялі, што іх легіён — зародак будучай «украінскай нацыянальнай арміі» і што яны з'явіліся з агрэсарам на Украіну быццам бы «закладваць асновы будаўніцтва ўкраінскай нацыі і дзяржавы пад фірмай «Украінскай Цэнтральнай рады». Так было запісана ў інструкцыі, выпрацаванай для іх у Львове.

Стральцы прымалі актыўны ўдзел у карных акцыях нямецка-аўстрыйскіх акупантаў. Асабліва іх скампраметавалі ўдзел у падаўленні ўзброенага паўстання рабочых кіеўскага завода «Арсенал» і шматлікія расстрэлы, павешанні камуністаў, сялян, рабочых. Чыніліся расправы пад камандаваннем былога афіцэра аўстра-венгерскай арміі Яўгенія Канавальца. Злачынствы січавікоў выклікалі да іх нянавісць шырокіх мас насельніцтва Украіны.

Пры падтрымцы працоўных Чырвоная Армія пачала рашучую барацьбу супраць акупантаў. Поспеху яе спрыяла і пранікненне ў акупацыйныя войскі рэвалюцыйных настрояў. Армія была дэмаралізавана. Салдаты кідалі зброю і ў беспарадку вярталіся на радзіму.

У хуткім часе на Украіне была адноўлена Савецкая ўлада. Ачысціўшы краіну ад контррэвалюцыйных «урадаў», нацыяналістычных банд, народ прыступіў да дзяржаўнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Перашкаджалі яму ў гэтым класавыя ворагі, якія пралезлі ў дзяржаўныя ўстановы. А. Шаптыцкі інструктаваў нацыяналістаў, блаславіў іх верхавода С. Пятлюру на падпісанне 21 красавіка 1920 г. у Варшаве здрадніцкай змовы з Польшчай. Паводле яе да II Рэчы Паспалітай адыходзілі заходнеўкраінскія землі.

У той час Ю. Пілсудскі карыстаўся поўнай падтрымкай Ватыкана. Палітыка папства па-ранейшаму была накіравана на каталізацыю Расіі. Але ў ёй з'явілася і новая рыса — барацьба супраць камунізму і яго ўплыву. Выстаўленне на першы план Ю. Пілсудскага не было чымсьці выпадковым. Махровы рэакцыянер, ён быў апантаны ідэяй адраджэння Польшчы ў межах ад Балтыйскага да Чорнага мора, Польшчы, у якую ўваходзілі б Украіна, Беларусь і Прыбалтыка. Нямецкія акупанты зрабілі Ю. Пілсудскага дыктатарам. Поўную згоду на гэта далі польскія памешчыкі і буржуазія. Бліжэйшым памочнікам Ю. Пілсудскага стаў генерал Станіслаў Шаптыцкі, родны брат мітрапаліта.

Цяпер свае надзеі на стварэнне уніяцкага патрыярхата на Украіне А. Шаптыцкі ўжо звязвае з паходам белапалякаў. Пасля кровапралітных баёў яны захапілі Кіеў, Мінск, значную частку тэрыторыі Украіны і Беларусі. Пачаліся расправы з камуністамі, рабочымі і сялянамі, якія ім спачувалі. Але неўзабаве (летам 1920 г.) Чырвоная Армія перайшла ў контрнаступленне. Гэта моцна напалохала кіруючыя колы II Рэчы Паспалітай, Ватыкана і самога Бенядзікта XV. Польшча была вымушана заключыць мірную ўмову з Расіяй. Вышэйшае польскае каталіцкае духавенства звярнулася, як пісаў Ф. Э. Дзяржынскі У. І. Леніну, «з адозвай да каталіцкага епіскапата ўсяго свету за дапамогай, характарызуючы нас як антыхрыстаў»[8]. Вярхі польскага каталіцкага духавенства заяўлялі, што калі Польшча акажацца пакоранай, то Еўропа, увесь свет апынуцца пад пагрозай бальшавізму.

У канцы 1920 г. паводле Рыжскага мірнага дагавора заходнія землі Украіны і Беларусі адышлі да Польшчы. А. Шаптыцкі накіроўваецца за інструкцыямі ў Рым. 2 лютага 1921 г. яго прыняў Бенядзікт XV. 24 лютага 1921 г. папа выдае брэвэ[9], згодна з якім узнаўлялася дзейнасць Русінскай калегіі ў Рыме, створанай яшчэ на ахвяраванні аўстрыйскага імператара. На яе ўскладалася падрыхтоўка уніяцкіх свяшчэннікаў для Усходняй Еўропы. А. Шаптыцкага папа накіроўвае ў вялікае падарожжа для прапаганды уніі і палітыкі Ватыкана. Мітрапаліт на працягу 1921 г. наведваў краіны Заходняй Еўропы, а таксама Канаду, ЗША, Паўднёвую Амерыку. У час падарожжа ўладыка актыўна выступаў з прамовамі, у якіх намагаўся пасеяць нянавісць сярод украінскіх рабочых-эмігрантаў да братняга рускага народа. Закончыўшы ваяж, уладыка вяртаецца ў Рым. Тут яго прыняў новы папа Пій XI. Ён пацвердзіў, што галоўным у палітыцы Ватыкана застаецца ўзброенае звяржэнне Савецкай улады і акаталічванне Расіі.

Кіруючыя колы каталіцкай царквы, як і многія дзяржаўныя дзеячы Заходняй Еўропы, настроеныя варожа супраць СССР, не здолелі правільна ацаніць становішча, сілы Савецкай Расіі. А. Шаптыцкі, напрыклад, усё яшчэ марыў аб пашырэнні на Усходзе каталіцызму, аб падпарадкаванні Ватыкану новых мільёнаў веруючых, аб патрыяршым прастоле ў Кіеве і нават у Маскве. У адозве да падпарадкаванага яму духавенства ў 1929 г. мітрапаліт пісаў: «...многім з нас бог яшчэ зробіць ласку

прапаведаваць у цэрквах Вялікай Украіны ... па Кубань і Каўказ, Маскву і Табольск»[10]. Тым часам уплыў уніяцкай, як і іншых цэркваў, слабеў.

Прыклад Савецкай краіны рэвалюцыянізаваў насельніцтва Заходняй Украіны, клікаў на барацьбу за вызваленне ад прыгнёту панскай Польшчы, за ўз'яднанне са сваімі братамі на Усходзе. Намаганні кліра прыпыніць вызваленчы рух, затармазіць рост класавай самасвядомасці працоўных поспеху не мелі. Выступленні працоўных рабіліся ўсё больш частымі. Польскі ўрад у адказ распачаў крывавы тэрор.

У 1928 г. рымскі папа ў сваіх энцыкліках [11] запатрабаваў павялічыць групу людзей, гатовых у выпадку крушэння Савецкага Саюза (у чым Ватыкан па-ранейшаму не сумняваўся) адразу заняцца арганізацыяй уніі праваслаўнай царквы з каталіцкай. У 1929 г. у Рыме ўрачыста адкрываецца Усходні інстытут, так званы «Русікум». Трохі раней (у 1928 г.) з гэтай жа мэтай у Львове пачала дзейнічаць «Украінская багаслоўская акадэмія». Яе ўзначаліў выхаванец езуітаў Іосіф Сліпы. Акадэмія выдавала часопіс «Багаслоўе». Апрача таго ў Рыме адчыніла дзверы Украінская семінарыя імя Іасафата Кунцэвіча. У ёй навучаліся пятлюраўцы, члены АУН (Арганізацыя ўкраінскіх нацыяналістаў). Найбольш «здольныя» з іх потым пераводзіліся ў «Русікум» для атрымання «вышэйшай кваліфікацыі» ў антысавецкай дзейнасці на тэрыторыі СССР.

У пачатку 1930 г. «Кангрэгацыя ўсходніх цэркваў» і «Камісія про Русія» дакладвалі Пію XI, што місіянеры падрыхтаваны. Папская курыя была ўпэўнена: прыйшоў час для «крыжовага паходу» супраць СССР. Да яго і заклікаў рымскі папа веруючых усяго свету, нават дату назначыў — 19 сакавіка 1930 г. (дзень нараджэння Ю. Пілсудскага: паводле задумы Ватыкана першай выступіць супраць СССР павінна была Польшча). Заклік рымскага папы падхапіла ўся міжнародная рэакцыя, якая рвалася «пакончыць з камунізмам». Паход гэты, як вядома, не адбыўся — кіруючыя колы Польшчы не забыліся пра паражэнні, якія яна атрымала ад Чырвонай Арміі.

І ўсё ж у ліпені 1930 г. у Святаюрскай рэзідэнцыі мітрапаліта сабраліся ўсе уніяцкія епіскапы на чале з А. Шаптыцкім, прадстаўнікі польскага і армянскага каталіцкага духавенства Львова. Яны абмяркоўвалі планы ўзброенага паходу супраць СССР. Старшынёй на

гэтай нарадзе быў прымас[12] Польшчы кардынал Хленд. Былі разгледжаны практычныя мерапрыемствы для пераводу «абальшавічаных» украінскіх і беларускіх сялян у каталіцызм, ліквідацыі праваслаўнай царквы ў Заходняй Украіне і Беларусі, фізічнага знішчэння камуністаў. Царкоўныя дзеячы поўнасцю апраўдвалі і ўсхвалялі тэрор тагачаснай прафашысцкай улады панскай Польшчы.

Па ўказанню Ватыкана ў кастрычніку 1930 г. ствараецца новая ўкраінская каталіцкая нацыяналістычная арганізацыя — «Украінская каталіцкая народная партыя» (УКНП). Праграма гэтай новай «народнай», як яна сябе называла, партыі асуджала тэорыю і практыку класавай барацьбы, выступала са сцвярджэннем нейкай «сацыяльнай гармоніі». У гэты ж час фарміруецца і маладзёжная арганізацыя — «Каталіцкая акцыя ўкраінскай моладзі». Яна тэрарызавала прагрэсіўных дзеячаў культуры, навукі, палітыкі, а таксама членаў прагрэсіўных рабочых і сялянскіх арганізацый. Кіраўніком КАУМ быў прызначаны адзін з верхаводаў украінскага нацыяналізму, былы палкоўнік пятлюраўскай арміі Андрэй Мельнік, а капеланам — прыбліжоны А. Шаптыцкага Іван Грыньёх. КАУМ выступала пад лозунгамі «абароны хрысціянскай маралі і рэлігіі» за «незалежнасць» Украіны, рыхтавала тэрарыстаў, правакатараў і катаў украінскага народа. Мітрапаліт аказваў КАУМ маральную і фінансавую дапамогу. Ён наведваў лагеры яе выхаванцаў, ахвотна фатаграфаваўся з імі, праводзіў «пастарскія» гутаркі. У сваю чаргу кіраўнікі ўкраінскіх фашыстаў уручылі яму ўзнагароду — ганаровы знак свастыкі. Задаволены ўладыка ў адказ заявіў аб сваім жаданні «аб'яднаць крыж і свастыку». Сваё слова ён стрымаў. Праз некалькі гадоў выпеставаныя А. Шаптыцкім КАУМ і іншыя нацыяналістычныя арганізацыі сталі ядром фашысцка-нацыяналістычных фарміраванняў — батальёнаў «Нахтыгаль»[13] і дывізіі СС «Галічына». Узнікае створаны уніяцкім першаіерархам «Украінскі каталіцкі саюз» (УКС). З першых дзён свайго існавання ён распачаў злосную кампанію супраць СССР, заклікаў пятлюраўскіх недабіткаў прыняць удзел у захопніцкім паходзе на Краіну Саветаў — «царства сатаны» (так называў яе уніяцкі епіскап Іван Бучко). Задачай УКС было — аб'яднаць усе нацыяналістычныя і клерыкальныя сілы на барацьбу супраць СССР і камуністычнага руху ў Заходняй Украіне.

А. Шаптыцкі быў адным з галоўных кіраўнікоў, палітычным дарадцам і «духоўным пастырам» найбольш актыўнай нацыяналістычнай арганізацыі АУН. Гэта была платная агентура нямецка-фашысцкай разведкі. Яе кіраўнікамі з'яўляліся: спачатку Я. Канавалец, а пасля яго смерці — А. Мельнік, С. Бандэра. У Савецкім Саюзе гэта арганізацыя бачыла свайго ворага нумар адзін.

Але ўсе гэтыя уніяцка-нацыяналістычныя (а па сутнасці, проста фашысцкія) намаганні не далі верхаводам грэка-каталіцкай царквы і ўкраінскага нацыяналізму жаданых вынікаў. Створаная ў лютым 1923 г. Камуністычная партыя Заходняй Украіны (КПЗУ) узначаліла рэвалюцыйны рух, мужна, настойліва і нястомна змагалася за правы народа, адстойвала яго карэнныя інтарэсы, вяла атэістычную прапаганду.

У сувязі з небывалым па глыбіні сусветным крызісам капіталізму ў 30-я гг. абвастраецца палітычнае становішча ў Польшчы. Рэвалюцыйны рух рабочых і сялян робіцца ўсё больш і больш масавым. У яго паступова ўцягваюцца ўсходнія раёны краіны. Запалалі панскія маёнткі, сядзібы асаднікаў, духавенства (каталіцкага і уніяцкага). Забастоўкі рабочых узнікалі нават на прадпрыемствах, якія належалі царкве і самому мітрапаліту. Такою, напрыклад, была стачка рабочых у друкарні «Бібльёс» у маі 1932 г. з прычыны чарговага зніжэння заработнай платы. Яна цягнулася 12 дзён. Яе падавіла паліцыя, да якой канцылярыя мітрапаліта звярнулася за дапамогай.

Тым часам на свет насоўвалася пагроза «карычневай чумы». Яшчэ ў 20-я, а потым і ў 30-я гады Ватыкан і Пій XI знайшлі сабе надзейнага саюзніка ў барацьбе супраць камуністычнай ідэалогіі і СССР — фашызм, спачатку італьянскі, а потым нямецкі. У ім папскі прастол бачыў выратавальніка капіталізму. У Ватыкане з радасцю сустрэлі прыход да ўлады Мусаліні. Папа рымскі нават узнагародзіў яго сваім найвышэйшым ордэнам «Залатой шпоры». Шчыра захапляўся фашысцкай ідэалогіяй і практыкай А. Шаптыцкі. У сваіх выступленнях, выданнях, зваротах і пасланнях, з якімі улады ка звяртаўся да падначаленага духавенства і «паствы», ён праклінаў камуністаў, запалохваў веруючых, якія мелі з імі сувязь, цяжкай адказнасцю, а пазней заклікаў да вернай службы нацысцкаму рэйху.

Яшчэ да вераломнага нападу Германіі на Савецкі

Саюз А. Шаптыцкі імкнуўся наладзіць цесную сувязь з уплывовымі дзеячамі германскага фашызму. Па ўказанню свайго мітрапаліта і з прычыны агульнасці палітычных перакананняў і планаў прадстаўнікі вышэйшых колаў уніяцкай царквы на працягу доўгага часу падтрымлівалі цесную сувязь з украінскімі фашыстамі. Уніяцкае духавенства прымала самы актыўны ўдзел у стварэнні АУН, аказвала ёй дзейсную дапамогу ў службе на карысць гітлераўскай разведкі.

Сам А. Шаптыцкі быў галоўным ініцыятарам стварэння клерыкальна-нацыяналістычных арганізацый у Заходняй Украіне. Па яго ўказанню уніяцкія газеты і часопісы ўсяляк апраўдвалі антыкамуністычную і антысавецкую накіраванасць нямецкага фашызму, яго антычалавечыя справы аб'яўлялі «богаўгоднымі», заклікалі ўкраінцаў знішчыць Савецкую ўладу.

Камуністычная партыя Заходняй Украіны разам з усёй перадавой грамадскасцю вяла актыўную барацьбу супраць уніяцкай царквы, яе антынароднай дзейнасці. Гэта была нялёгкая справа, бо рэлігійна-нацыяналістычныя арганізацыі на чале з уніяцкай царквой выступалі як моцны атрад ваяўнічай рэакцыі. Іх падтрымліваў урад даваеннай буржуазнай Польшчы. Царква мела ўласную моцную фінансава-эканамічную базу і разгалінаваны апарат.

Ватыкан і Польшча яшчэ ў 1925 г. падпісалі канкардат [14], паводле якога Польшча брала на ўтрыманне дзяржавы духавенства грэка-каталіцкай царквы, а яно давала прысягу на вернасць Польшчы. Але гэтае «дзяржаўнае ўтрыманне» было далёка не адзінай крыніцай даходаў уніяцкага духавенства, асабліва вышэйшага.

У трох галоўных епархіях грэка-каталіцкай царквы (Львоўскай, Станіслаўскай, Пярэмышльскай) у 1937 г. было 123 дэканаты [15], 2264 парафіі, 2704 цэрквы, 2275 свяшчэннікаў. У названых епархіях знаходзіліся: 41 манастыр, некалькі дзесяткаў манастырскіх дамоў, у якіх жыло 235 іераманахаў [16] (на 1937 г.), 462 манахі, 941 манахіня. Уніяцкія парафіі былі на тэрыторыі Чэхаславакіі, Югаславіі, Канады, ЗША [17].

Уніяцкія манахі належалі да трох ордэнаў — студытаў, рэдэмптарыстаў і васіліян. Перад аб'яднаннем Заходняй Украіны ў адзінай Савецкай дзяржаве яны ператварыліся ў разгалінаваныя, добра вымуштраваныя, дысцыплінаваныя духоўныя карпарацыі. Іх дзейнасць

была выразна накіравана супраць рэвалюцыйнага руху, ідэалагічнага ўплыву Савецкага Саюза. Найбольш значным быў ордэн васіліян — своеасаблівы грэка-каталіцкі варыянт «грамадства Ісуса».

У Заходняй Украіне уніяцкая царква была самым буйным землеўладальнікам. У 1925 г. толькі адна львоўская мітраполія валодала 26 879 гектарамі палёў, садоў, сенажацяў і 36 063 гектарамі лесу. Акрамя таго, царкве належала чыгунка Брошніў — Асмалода (працягласцю 112 кіламетраў), папяровая фабрыка і буйная друкарня «Бібльёс», даходныя дамы, здача якіх у арэнду давала вялікі прыбытак (у 1937 г. ён склаў 10 821 злоты і 60 грошаў).

Вялікімі капіталамі валодалі уніяцкія епархіі і манастыры. Ім падначальваліся прадпрыемствы («Народны гандаль», нафтаперапрацоўчы завод, кандытарская фабрыка «Фартуна»), банкі («Днестр», «Сельскі гаспадар», «Рызніца», «Дастава»). У складзе 16 заснавальнікаў «Зямельнага іпатэчнага банка» сярод найбуйнейшых прадстаўнікоў украінскай буржуазіі былі: мітрапаліт А. Шаптыцкі, епіскапы К. Чаховіч, Г. Хамішын і свяшчэннік Ц. Вайнароўскі. У банку вытвараліся буйныя валютныя аперацыі. Кіраваў ім так званы наглядальны савет, які складаўся з найбольш вопытных у фінансавых справах свяшчэннікаў, епіскапаў і дзеячаў украінскага буржуазнага нацыяналізму.

Мітрапаліт і яго бліжэйшыя памагатыя не безпадстаўна лічылі сябе ў Заходняй Украіне лідэрамі антыкамуністычнага руху. Яны заяўлялі, што іх сам бог блаславіў на ідэйнае кіраўніцтва ўкраінскімі нацыяналістычнымі арганізацыямі і ўсімі іншымі рэакцыйнымі палітычнымі партыямі, што вялі барацьбу з рэвалюцыйным рухам. На вайну з камунізмам, у адпаведнасці з указаннямі Ватыкана, святаюрскія цемрашалы мабілізавалі епіскапат, кансісторыю мітрапаліта, духоўныя навучальныя ўстановы, манашаскія ордэны і свецкія нацыяналістычныя арганізацыі. Уніяцкую царкву Ватыкан разглядаў як перадавы атрад распаўсюджвання каталіцызму па ўсёй Украіне, Беларусі, Расіі, на Далёкім Усходзе і ў Сярэдняй Азіі. Галоўнай задачай грэка-каталіцкай царквы яе іерархі лічылі выхаванне ўкраінскай моладзі ў нацыяналістычным духу, каб зрабіць яе служкай фашызму і катам свайго народа. Яшчэ да II сусветнай вайны загадзя былі створаны многія прафашысцкія рэлігійна-нацыяналістычныя арганізацыі, на-

прыклад, маладзёжныя — «Арлы», «Лугі», КАУМ, якія фінансаваліся кансісторыяй мітрапаліта.

Паводле ўказання А. Шаптыцкага, у Львове наладжваліся шумныя зборышчы-парады яго любімцаў — выхаванцаў КАУМ, а таксама ўдзельнікаў іншых антыкамуністычных маладзёжных арганізацый. Такія парады прымалі сам мітрапаліт і блізкі яго паплечнік — епіскап М. Будка. Яны бласлаўлялі нацыяналістычна настроеных юнакоў, якія выхоўваліся па фашысцкаму ўзору, як барацьбіты супраць камунізму, за «святыя ідэалы грэка-каталіцкай царквы».

На працягу 30-х гг. А. Шаптыцкі і яго клір надавалі шмат увагі таму, каб у асяроддзі простага люду не знікла вера ў звышнатуральныя сілы, розныя «цуды», «вылечванні», на якія быццам бы здольныя каталіцкая і уніяцкая цэрквы. Асабліва многа такіх «цудаў» адбылося ў 30-я гг., калі няўхільна расла рэвалюцыйная актыўнасць працоўных Заходняй Украіны. Пачынаюць часта «абнаўляцца» абразы, крыжы. З'яўляюцца так званыя стыгматыкі, г. зн. людзі, якія дзякуючы сваёй набожнасці і нават «святасці» здольныя вылечваць цяжка хворых людзей. Гэта адчувальна павялічвала даходы уніяцкай царквы, абагачэнне ішло за кошт народнай цемры. Кожны раз у час праверкі ўсіх гэтых афёр іх аўтары аказваліся выкрытымі як звычайныя авантурысты.

У 30-я гг. перад грэка-каталіцкай царквой і яе першаіерархам стаяла праблема кананізацыі Л. Фёдарава — новага уніяцкага «святога». Мітрапаліт, рыхтуючыся да кананізацыі «мучаніка», у 1935 г. аддае афіцыйнае ўказанне памінаць яго ў малітвах. Гэтую кампанію ўладыка ставіў у непасрэдную сувязь са сваімі далёка ідучымі планамі распаўсюджвання каталіцызму ў Савецкай Украіне і наогул у СССР. Вядома, кіравала ім у гэтай справе і больш блізкая мэта — узняцці прэстыжу уніяцкай царквы.

Малітвы, у якіх манахі і манахіні звярталіся да «святога мучаніка» Л. Фёдарава, выклікалі шматлікія «цуды», сфабрыкаваныя манастырскаю «браціяй». Па загаду мітрапаліта яго саветнік і рэферэнт кансісторыі Васіль Тамовіч «афіцыйнымі дакументамі» «афармляе» ў кляштары васіліянак гэтыя «цуды» і «вылечванні».

Давесці да канца кананізацыю Л. Фёдарава перашкодзіў вызваленчы паход Чырвонай Арміі ў верасні 1939 г., які выклікаў новыя, больш тэрміновыя і важныя клопаты уніятаў. Зноў гэтае пытанне мітрапаліт узняў

у маі 1942 г. Але і на гэты раз справа была адкладзена ў канцы 1942 г. з-за неспрыяльнай для фашыстаў абстаноўкі на фронце.

У святаюрскіх мурах панавалі правакацыі, змовы, сваркі, якія суправаджалі ўсю гісторыю грэка-каталіцкай царквы. У асяроддзі уніяцкага духавенства бытавалі інтрыгі і злоўжыванні, але іх заўсёды ўтойвалі ад грамадства. Да нас дайшлі дзённікі асабістага сакратара А. Шаптыцкага — манаха-васіліяніна І. Гродскага, які быў сведкам многіх інтрыг, што плялiся ў палацы мітрапаліта.

І. Гродскі супраць сваёй волі выкрывае двудушнасць і прадажнасць уніяцкага духавенства ўсіх рангаў і як адданы слуга ва ўсім апраўдвае свайго гаспадара.

Складаныя і агідныя інтрыгі пляліся ў святаюрскіх пакоях вакол выбрання суфрагана [18]. Многія высокія чыны грэка-каталіцкай царквы прэтэндавалі на гэтую пасаду. А. Шаптыцкі рабіў усё магчымае, каб яе атрымаў яго родны брат, ігумен манастыра студытаў Кліменцій Шаптыцкі. Аднак гэту кандыдатуру адхіліла рымская курыя. Пасля доўгай валтузні суфраганам быў прызначан рэктар малой уніяцкай семінарыі епіскап Іван Бучко. У гэтым прызначэнні важную ролю адыграў папскі нунцый у Варшаве Ляўры.

Даведаўшыся аб дамоўленасці паміж Ляўры і І. Бучко, мітрапаліт ужо не давяраў апошняму. А. Шаптыцкі і яго суфраган сталі непрымірымымі ворагамі. Дайшло да таго, што праверкай узаемаадносін паміж імі займаўся спецыяльны папскі візітатар [19]. Выявіліся шматлікія брудныя справы першаіерарха і яго намесніка, іншых «святых айцоў».

Пільна сачылі мітрапаліт і яго прыбліжаныя за падрыхтоўкай кадраў украінскай грэка-каталіцкай царквы. Сваім выхаванцам ва уніяцкіх вышэйшых і сярэдніх навучальных установах настаўнікі знарок імкнуліся прывіць ханжаства, двудушнасць. Людзі, у якіх развіты такія рысы характару, якраз і патрэбны былі А. Шаптыцкаму для місіянерскай дзейнасці на Усходзе. З году ў год вучэбны працэс «удасканальваўся». Пра навучанне і выхаванне ў Львоўскай духоўнай семінарыі яе былы гадаванец Андрэй Мароз расказваў наступнае: «У час нямецкай акупацыі я навучаўся ў Львоўскай духоўнай семінарыі... У семінарыі панавалі езуіцкія парадкі — падслухоўванне, шпіянаж, даносы. Галоўнае, чаго хацелі айцы-настаўнікі — гэта зрабіць з нас слуг каталіцкай

царквы, пасеяць у нашых душах лютую нянавісць да Савецкай улады, да савецкага народа. Нямала выхаванцаў гэтых навучальных устаноў сталі першымі добраахвотнікамі дывізіі СС «Галічына», а шэраг выкладчыкаў, «прафесараў» — вайсковымі капеланамі» [20].

Такім чынам, святаюрскія іерархі і клір няспынна і мэтанакіравана рыхтаваліся да здзяйснення сваіх экспансіянісцкіх планаў. Яны рабілі стаўку на самую змрочную сілу імперыялізму — фашызм. Найцяснейшую сувязь уніяцкая царква мела са сваімі аднадумцамі — украінскімі буржуазнымі нацыяналістамі. Яны з нецярплівасцю чакалі, калі наступяць спрыяльныя ўмовы для ажыццяўлення іх злавесных задум.

Шмат увагі ў тыя гады надавала апостальская сталіца і Заходняй Беларусі. Улады і каталіцкі клір былі аднадушнымі ў галоўным — яны намагаліся ператварыць захопленыя землі ў апорны пункт антыкамунізму, умацаваць пазіцыі касцёла, каб «сапраўдная вера» запанавала на цэлым свеце. Ну, а калі ўзнікалі непаразуменні паміж урадам і духавенствам, то яны мелі часовы характар і не былі глыбокімі. Абодва бакі добра разумелі, што лягчэй трымаць у цуглях працоўных, калі тыя прытрымліваюцца аднаго веравызнання.

У гады акупацыі Заходняй Беларусі буржуазна-памешчыцкай Польшчай духавенства ўсіх напрамкаў — і каталіцкага, і уніяцкага, і праваслаўнага, і іудзейскага — адыграла здрадніцкую ролю ў адносінах да працоўных. Яно падтрымлівала кіруючыя колы ў іх барацьбе супраць свайго галоўнага ворага — камунізму.

З далучэннем заходнебеларускіх земляў да буржуазнай Польшчы паводле Рыжскай ўмовы 1920 г., на думку ватыканскіх іерархаў, наступіў зручны момант для акаталічвання Заходняй Беларусі праз распаўсюджванне уніі. Схіліць да яе вышэйшага іерарха праваслаўнай царквы ў тагачаснай Польшчы (а разам з ёю і ў Заходняй Беларусі) мітрапаліта Георгія для царкоўных (каталіцкіх) і свецкіх улад краіны было няцяжка. Уладыка, яшчэ зусім нядаўна архіепіскап мінскі і тураўскі, вораг Савецкай улады, пакінуў сваю рэзідэнцыю ў Мінску і патаемна, праз дзяржаўную мяжу, перабраўся ў Польшчу. Буржуазны ўрад краіны прызначыў яго кіраваць Варшаўскай праваслаўнай мітраполіяй. Натуральна, што Георгій усяляк імкнуўся дагадзіць ураду, які разам з прадстаўнікамі вышэйшай каталіцкай іерархіі аказаў яму гасціннасць, даў цёплы прытулак і высокую паса-

ду. Таму нядзіўна, што ўдзячны душпастыр захапляецца думкай аб аднаўленні на тэрыторыі Польшчы Брэсцкай царкоўнай уніі. Пры гэтым ім кіраваў просты разлік — з прыняццем уніі стаць незалежным ад патрыярха Маскоўскага і ўсея Русі.

Адным з першых крокаў па шляху, які вёў да распаўсюджвання уніі ў Заходняй Беларусі, быў наступны: мітрапаліт прадпрыняў пераклад на беларускую мову малітваў, песнапенняў і ўсяго праваслаўнага набажэнства. Ён добра ведаў аб тым, што на тэрыторыі БССР беларуская культура атрымала неабмежаваныя магчымасці для свайго развіцця, а беларуская мова стала дзяржаўнай. На ёй друкаваліся кнігі, часопісы, газеты, ёю карысталіся школа, тэатр. Развіццё ўласнай нацыянальнай культуры было для беларускага насельніцтва захопленых тэрыторый адной з мэт, да якіх яно імкнулася ў сваёй барацьбе за ўз'яднанне з БССР.

Ідэі мітрапаліта Георгія аб перакладзе набажэнства на беларускую мову, і наогул ідэя аб аднаўленні ў Заходняй Беларусі Брэсцкай уніі, абсалютна не мела папулярнасці ў мясцовага праваслаўнага насельніцтва. Цікава адзначыць, што недарэчную задуму ўладыкі аб перакладзе малітваў высмеяў у пачатку 20-х гг. тады яшчэ малады беларускі паэт-сатырык К. Крапіва ў сваім цыкле дасціпных вершаў «Малітвы па-беларуску».

Задума Георгія аднавіць Брэсцкую царкоўную унію ў Заходняй Беларусі правалілася. Дарэчы і сам ён стаў ахвярай сваіх авантурных планаў. У момант, калі ў прысутнасці каталіцкіх і праваслаўных іерархаў Польшчы мітрапаліт збіраўся ўрачыста падпісаць акт аб уніі, ён загінуў як здраднік ад рукі аднаго з маладых праваслаўных епіскапаў.

У лютым 1932 г. міністэрствам унутраных спраў Польшчы быў складзены шырокі сакрэтны рэферат, у якім падкрэслівалася, што ідэя акаталічвання Усходу (г. зн. Савецкага Саюза), як сотні гадоў назад, застаецца для польскай дзяржавы «гістарычнай місіяй». «Таму,— гаварылася ў рэфераце,— апостальская сталіца размясціла пасты, якія ставяць сваёй мэтай падрыхтоўку працаўнікоў на уніяцкім полі дзейнасці, літаральна па ўсім свеце»[21]. Пад наглядам Усходняй кангрэгацыі ў Ватыкане знаходзіліся арганізаваныя ёю расійскія місіі ў Льежы, Шанхаі, Харбіне, Сан-Паўло. У дакументе названы тагачасныя кіраўнікі ўсёй гэтай «кампаніі», у іх ліку знаходзім А. Шаптыцкага, а таксама «рускіх ка-

толікаў», якія ў той час знаходзіліся ў Ватыкане,— князёў Валконскага і Трубяцкога.

Галоўную ўвагу, як адзначана ў рэфераце, Ватыкан надаваў акаталічванню насельніцтва Заходняй Беларусі праз прывядзенне яго да уніі. Работа гэта была даручана Ватыканам «каталіцка-езуіцкай групе ў Альберціне» (у наш час Альберцін — прадмесце Слоніма). Яна і вяла прапаганду уніі сярод беларусаў.

У дакуменце зазначаюцца зусім невялікія поспехі кампаніі, што не здолела прывесці да уніі насельніцтва Заходняй Беларусі. Вынікам дзейнасці «каталіцка-езуіцкай групы ў Альберціне» і ўсяго каталіцкага духавенства «было стварэнне толькі некалькіх парафій усходнеславянскага абраду»[22] — так назвалі езуіты нешматлікія уніяцкія прыходы. Ватыкан жа марыў аб стварэнні цэнтра «ўсходне-славянскага абраду» для пранікнення яго ў будучым у глыб Расіі. На самай жа справе распаўсюджванне новага абраду на «ўсходніх ускраінах Польшчы», г. зн. у Заходняй Беларусі, выклікала агульнае нежаданне і незадавальненне не толькі сярод беларускага насельніцтва, але і польскай грамадскасці.

Тым не менш 1—3 верасня 1931 г. у Пінску адбывалася другая канферэнцыя «па пытанню інфарміравання аб сутнасці уніяцкай кампаніі, якая праводзіцца, і ўмацаванні людзей у сапраўднай веры»[23]. У ёй прынялі ўдзел каля 100 свяшчэннаслужыцеляў — польскіх, беларускіх, украінскіх. У цэнтры ўвагі былі «пытанні актывізацыі уніяцкага руху ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне». У адпаведнасці з рашэннямі канферэнцыі з 1932 г. пачалося выданне на беларускай і рускай мовах рэлігійнага часопіса «К единению», быў выпушчаны «Беларускі каляндар на 1932 г.». У апошнім упарта прапагандавалася унія, якая быццам бы дапаможа беларусам «у справе нашага беларускага нацыянальнага адраджэння, бо адарве праваслаўную царкву ад маскоўшчыны і аб'яднае яе з душой народа»[24]. Далей у «Календары» сцвярджалася, што унія адасобіць беларусаў не толькі ад уплываў «маскоўшчыны», але быццам бы і Польшчы. Вось якая прапаганда вялася сярод карэннага насельніцтва місіянерамі каталіцка-езуіцкай групы ў Альберціне.

Для дасягнення сваіх мэт каталіцкія іерархі імкнуліся выкарыстаць нацыянальныя пачуцці беларусаў і маскіраваліся ў тогу «сяброў» беларускай нацыі. Але такая тактыка Ватыкана выклікала непакой і нават не-

задавальненне ўрада Пілсудскага, які баяўся росту нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва захопленых тэрыторый, вельмі непажаданай для буржуазна-памешчыцкай Польшчы.

Але Ватыкан не збіраўся адмаўляцца ад пашырэння уніі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, хаця карысць ад усіх захадаў езуітаў была мізэрнай. Для дасягнення поспеху ватыканскія дзеячы лічылі добрымі ўсе сродкі, нават подкуп пэўных колаў беларускага насельніцтва.

Справа ў тым, што беларускія рабочыя і сяляне ў панскай Польшчы былі абсалютна бяспраўнымі. У прыватнасці, не мелі яны ніякіх правоў на адукацыю. Так, пасля сканчэння пачатковай і так званай паўшэхнай сямігадовай школы беларускім дзецям рабочых і сялян былі закрыты дзверы для далейшага навучання і для атрымання спецыяльнай адукацыі. Таму езуітамі была зроблена «прыманка»: сялянскім юнакам пасля сканчэння паўшэхнай сямігодкі давалася магчымасць паступаць у сельскагаспадарчыя школы, дзе яны набывалі пачатковыя веды па аграноміі. Але прымалі туды беларускіх юнакоў з адною ўмовай — трэба было перайсці ва уніяцтва.

Аднак такое «мерапрыемства» плёну не дало і шырокага пераходу беларускай моладзі ў унію не адбылося. І не толькі таму, што гэтае веравызнанне было ў асяроддзі праваслаўных надзвычай непапулярным, але яшчэ і з той прычыны, што, скончыўшы сельскагаспадарчыя школы, беларускія юнакі не мелі ніякай перспектывы ўладкавацца ў панскай Польшчы на працу.

Так, амаль за 20 гадоў, на працягу якіх Заходняя Беларусь знаходзілася пад уладай буржуазна-памешчыцкай Польшчы, перавод насельніцтва ў унію, нягледзячы на намаганні Ватыкана, іерархаў каталіцкай царквы ў Польшчы і на падтрымку гэтых захадаў з боку польскіх улад, практычна не адбыўся.

Калі ж мець на ўвазе уніяцкую царкву ў Заходняй Украіне, то можна беспамылкова сцвярджаць, што міжваенныя гады — перыяд самай актыўнай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы сумесна з украінскімі буржуазнымі нацыяналістамі, а пазней фашыстамі.

Вернымі слугамі эксплуататарскіх класаў Заходняй Беларусі ў іх барацьбе супраць рэвалюцыйнага народа былі і беларускія буржуазныя нацыяналісты. Яны прадавалі інтарэсы народа, не прызнавалі БССР нацыянальнай дзяржавай, распальвалі варожасць да Краіны

Саветаў, старэйшага брата беларусаў — рускага народа і яго вялікай культуры. Нацыяналісты актыўна змагаліся супраць нацыянальна-вызваленчага руху працоўных, супраць ідэй камунізму і іх носьбітаў.

Верхаводы беларускага буржуазнага нацыяналізму — Р. Астроўскі, С. Станкевіч, В. Гадлеўскі, Ф. Акінчыц, У. Казлоўскі, В. Іваноўскі і іншыя — дапамагалі ўраду панскай Польшчы ў барацьбе з рэвалюцыйна настроеным народам Заходняй Беларусі, ствараліарганізацыі, мэтай якіх было бязлітаснае падаўленне імкнення працоўных мас да лепшай долі, нейтралізацыя ўплыву на іх КПЗБ. Адным з такіх аб'яднанняў быў, напрыклад, «Беларускі камітэт самапомачы». Яго ўзначальвалі шчырыя служкі буржуазнага ўрада, а пазней і нямецкага фашызму — Р. Астроўскі, М. Абрамчык і іншыя. Камітэт займаўся вярбоўкай беларускай моладзі ў спецыяльныя школы, якія рыхтавалі шпіёнаў і дыверсантаў для засылкі ў Савецкую Беларусь.

У сваёй газетцы «Раніца», як і ў іншых нацыяналістычных выданнях, заправілы «Беларускага камітэта самапомачы» распаўсюджвалі паклёпы на нацыянальную палітыку СССР і сацыялістычны лад жыцця ў нашай краіне.

Найбольш шырока беларускія контррэвалюцыянеры і нацыяналісты, як і ўкраінскія, разгарнулі сваю крывавую «работу» супраць савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

УНІЯЦКАЯ ЦАРКВА Ў ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ. СКАСАВАННЕ УНІІ Ў СССР

Пачатак II сусветнай вайны прынёс дзеячам уніяцкай царквы і ўкраінскім нацыяналістам непрытоеную радасць. Ім здавалася, што вельмі хутка ажыццявіцца іх запаветная мара аб стварэнні «самасційнай» Украіны (няхай сабе пад апекай Гітлера). Праўда, гэтыя планы ў хуткім часе аказаліся сарванымі: савецкі народ і яго ўрад працягнулі руку дапамогі братнім народам Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

Заправілы нацыяналізму і уніяцкай царквы былі вельмі ўстрывожаны энтузіязмам, з якім народ сустра-

каў вызваліцеляў — воінаў Чырвонай Арміі. Гэта красамоўна сведчыла аб тым, што амаль дваццацігадовая прапаганда нацыяналістаў і царкоўнікаў супраць адзінай у той час на свеце краіны сацыялізму пацярпела крах.

Адразу пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі пачаліся карэнныя сацыяльныя пераўтварэнні: канфіскаваны і перададзены сялянскай беднаце памешчыцкія, царкоўныя і манастырскія землі, нацыяналізаваны прамысловыя прадпрыемствы і банкі. Гэтая акалічнасць яшчэ больш узмацніла нянавісць і варожасць да народнай улады з боку ўкраінскіх нацыяналістаў і уніяцкіх клерыкалаў. Таму не выпадкова, што рэзідэнцыя мітрапаліта стала цэнтрам антысавецкіх інтрыг і правакацый.

Пасля ўз'яднання Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі з СССР уніяцкі першаіерарх, яго акружэнне і духавенства распачалі замаскіраваную антысавецкую дзейнасць. Яны распаўсюджвалі злосныя паклёпы на Камуністычную партыю, Савецкую ўладу, прадстаўнікоў адміністрацыі, займаліся дыскрэдытацыяй мерапрыемстваў дзяржаўных органаў, усяляк, у тым ліку і матэрыяльна, дапамагалі прафашысцкай АУН. Сваю актыўную, але нелегальную контррэвалюцыйную работу духавенства па-ранейшаму вяло адзіным фронтам з нацыяналістамі. У чаканні новых гістарычных падзей (і ў першую чаргу нападу фашысцкай Германіі на СССР) галава уніяцкай царквы патрабаваў ад кліра добра заканспіравацца і займацца антыдзяржаўнай дзейнасцю, асабліва зборам шпіёнскай інфармацыі.

У канцы 1939 г. састарэлы ўладыка звярнуўся ў Ватыкан з лістом, у якім прасіў прызначыць сабе каад'ютара [1], які змог бы замяніць яго, як пісаў А. Шаптыцкі, «на выпадак арышту і высылкі ў Сібір». Неўзабаве наследнікам мітрапаліцкага прастолу ў Львове Пій XII зацвердзіў рэктара духоўнай акадэміі Іосіфа Сліпога.

Савецкія і партыйныя органы Заходняй Украіны цярпліва і стрымана адносіліся да мітрапаліта і уніяцкага духавенства, хаця іх антысавецкая пазіцыя была добра вядома. Але царкоўныя дзеячы зразумелі гэта як «прыкмету слабасці Саветаў», а іх першаіерарх пачаў паводзіць сябе нават з выклікам. Так, ён выступіў з афіцыйным «пратэстам» супраць нацыяналізацыі царкоўных і манастырскіх земляў, банкаў і прадпрыемстваў, патрабаваў спыніць стварэнне піянерскіх і камсамоль-

скіх арганізацый у заходніх абласцях Украіны, а таксама дзейнасць Палаца піянераў у Львове і перадаць справу выхавання «дзяцей веруючых» уніяцкаму духавенству.

Ажывілася падрыўная дзейнасць кліра. Вялася яна патаемна. Духавенства хавала шпіёнаў і дыверсантаў з ліку нацыяналістаў, збірала і перадавала ім інфармацыю, дапамагала перабірацца праз дзяржаўную граніцу, супрацоўнічала з фашысцкай разведкай. Мітрапаліт і яго кліка забяспечвалі грашыма ворагаў Савецкай дзяржавы і прадстаўлялі ім канспірацыйныя сховы.

Уніяцкі клір запалохваў сялян, якія ўступалі ў калгасы, распаўсюджваў правакацыйныя антысавецкія чуткі. Святаюрскія дзеячы ўхітрыліся нават арганізаваць нелегальныя курсы для грэка-каталіцкіх «місіянераў» у Львове. На іх у канцы 1940 г. епіскап Мікіта Будка наступным чынам «прасвятляў» і павучаў свяшчэннікаў: «Нас часта пытаюць, ці будзе вайна паміж Саветамі і немцамі. Калі такая размова вядзецца з надзейнымі людзьмі, у вузкім сямейным коле, то мы павінны асцярожна падтрымаць надзеі нашых парафіян і выказаць сваё ўласнае, паўтараю, уласнае меркаванне, што такая вайна ўжо на парозе нашага краю. І вынік яе можа быць толькі адзін — немцы разаб'юць рускіх і прагоняць іх з Украіны»[2]. Сваіх выхаванцаў М. Будка вучыў «ні ў якім выпадку адкрыта не выступаць супраць Саветаў з амбону, бо гэтым наклічаце бяду...»[3].

Адчуваючы паталагічную нянавісць да Савецкай улады, дзеячы уніяцкай царквы вымушаны былі весці антыдзяржаўную работу замаскіравана. У сваіх лістах і зваротах А. Шаптыцкі заклікаў духавенства прыкідвацца прыхільнікамі новага ладу. Манахам і манахіням мітрапаліт дазволіў хадзіць у свецкай вопратцы і нават уладкоўвацца на працу ў савецкія ўстановы і на прадпрыемствы. Гэтак зручней было збіраць шпіёнскія звесткі, патрэбныя вышэйшым іерархам грэка-каталіцкай царквы.

Актыўна дзейнічалі уніяцкія місіянеры і нацыяналісты за мяжой. Напярэдадні нападу гітлераўскай Германіі на СССР па даручэнню фашысцкай разведкі аунаўскія бандыты пачалі ў красавіку 1941 г. у Кракаве фарміраваць батальён асобнага прызначэння пад назвай «Нахтыгаль». У яго ўвайшлі зацятыя члены АУН. Капеланам А. Шаптыцкі прызначыў свяшчэнніка І. Грыньёха, свайго адданага паслядоўніка. Поўным гаспадаром

гэтага батальёна быў нямецкі фашыст Т. Оберлендэр, загады якога былі абавязковыя для выканання ўсяго асабовага складу.

«Нахтыгаль» лютаваў у Львове, Цярнопалі, Вінніцы, а таксама ў гарадах і вёсках Беларусі. Грэка-каталіцкія іерархі на чале з мітрапалітам бласлаўлялі аунаўцаў на жорсткія расправы, масавыя забойствы і катаванні савецкіх патрыётаў. З духоўным настаўнікам галаварэзаў І. Грыньёхам А. Шаптыцкі падтрымліваў рэгулярную перапіску.

Антынародная накіраванасць дзейнасці уніяцкай царквы асабліва праявілася ў гады Вялікай Айчыннай вайны, калі ўвесь яе клір адкрыта стаў на службу гітлераўскаму фашызму. Шчырую радасць у А. Шаптыцкага і яго акружэння выклікаў напад Германіі на Савецкі Саюз. Яны былі ўпэўнены, што прыйшоў час здзяйснення даўніх планаў Ватыкана і уніяцкіх іерархаў, а таксама чаканай расправы з ненавісным камунізмам.

Устанаўленне «новага парадку» А. Шаптыцкі адзначыў урачыстым набажэнствам у Святаюрскім саборы ў акружэнні уніяцкіх епіскапаў і мноства свяшчэннікаў. На гэтай цырымоніі прысутнічалі высокія чыны вермахта, гестапаўцы, украінскія нацыяналісты. Мітрапаліт вітаў «перамаганосную армію фюрэра» і загадаў духавенству адпраўляць падзячныя набажэнствы.

Святаюрскага ўладыку даўно захапляла фашысцкая ваенная машына. Гітлер карыстаўся глыбокай пашанай не толькі яго эксцэленцыі[4], але і ўсіх бліжэйшых мітрапалітавых памагатых.

Адразу пасля нападу Германіі на СССР ажыўляецца дзейнасць украінскіх буржуазных нацыяналістаў, самых блізкіх паплечнікаў А. Шаптыцкага. У сваім «пастырскім пасланні» уніяцкаму духавенству ён выказваў шчырую радасць з прычыны звароту ў Заходнюю Украіну разам з акупацыйнымі войскамі іх верных прыслужнікаў і гадаванцаў — нацыяналістаў. Гэтыя ворагі народа заўжды трымалі моцную сувязь з уніяцкім духавенствам, заўсёды з ім раіліся аб сваіх злавесных антынародных справах, прасілі іх бласлаўлення. І мітрапаліт цёпла, «па-бацькоўску» прымаў нацыяналістычных шпіёнаў і дыверсантаў, натхняў іх на самыя цяжкія злачынствы супраць Савецкай улады і свайго народа. Поўнасцю ўхваляў усе дзеянні нямецкіх фашыстаў і іх памагатых Пій XII.

30 чэрвеня 1941 г. Львоў быў акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Разам з гітлераўцамі ў горад увайшоў і батальён «Нахтыгаль». Яго камандаванне, разам з адборнай сотняй «салаўёў», накіравалася на прыём да свайго «духоўнага бацькі». Мітрапаліт ласкава сустрэў «січавікоў» і блаславіў іх на «подзвігі» — знішчэнне савецкіх патрыётаў і сумленных людзей. Гучна білі святаюрскія званы, калі карнікі дэфіліравалі перад уніяцкім першаіерархам, вітаючы яго выкрыкамі «Слава!», «Хай жыве!». З першага ж дня свайго знаходжання ў Львове «салаўі» прымаюць актыўны ўдзел у расправах над савецкімі патрыётамі, іх сем'ямі, а таксама людзьмі, прозвішчы якіх былі ўключаны ў «чорныя» спісы. У ноч з 3-га на 4-е ліпеня была праведзена аперацыя па знішчэнню вялікай групы вядомых польскіх вучоных, запланаваная Г. Кохам і Т. Оберлендэрам. Галоўны капелан «Нахтыгаля» І. Грыньёх яшчэ загадзя поўнасцю адпусціў грахі галаварэзам.

У першы ж дзень акупацыі А. Шаптыцкі прыняў С. Бандэру. Апошні далажыў мітрапаліту аб стварэнні ўрада «самасційнай Украіны» на чале з Я. Стэцько. Вечарам адбылося ўрачыстае абвяшчэнне «украінскай дзяржавы» ў прысутнасці фашысцкага камандавання, уніяцкага духавенства, нацыяналістаў. Галава «самасційнай Украіны» ў сваёй «праграмнай» прамове заявіў аб палітычнай лініі «ўрада»: «Мы знішчым усіх без выключэння, хто атручаны савецкім бальшавізмам... Кіраўнікамі ва ўсіх галінах жыцця будуць украінцы, і толькі украінцы, а не ворагі-чужакі — маскалі, палякі, яўрэі. Наша ўлада будзе палітычнай і ваеннай дыктатурай АУН, дыктатурай для ворагаў страшнай і няўмольнай»[5].

Але «новая дзяржава» праіснавала зусім нядоўга. Неўзабаве Берліну стала вядома аб стварэнні ў Львове «нейкага ўкраінскага ўрада». Адбыўся вялікі скандал. Самасційны ўрад быў распушчаны. Украінская шпіёнская агентура, якую стварылі царкоўнікі і нацыяналісты, перададзена ў распараджэнне гестапа. Галіцыя стала асобнай акругай у складзе генерал-губернатарства польскіх земляў. Кіраваў ёю брыгадэнфюрэр СС Карл Ляш. З'явіўшыся ў Львове, ён нанёс візіт А. Шаптыцкаму, выклаў перад ім фашысцкі план «асваення» Галіцыі. Мітрапаліт запэўніў гітлераўца, што уніяцкая царква і ўкраінскія нацыяналісты падтрымаюць вялікую Германію ва ўсіх яе мерапрыемствах.

У сваіх «пастырскіх пасланнях» А. Шаптыцкі патра-

баваў ад духавенства, каб яно заклікала веруючых да паслушэнства фашысцкім уладам і арміі, цярпліва, без нараканняў і ў тэрмін здавала новай уладзе сельскагаспадарчыя прадукты. 10 ліпеня 1941 г. мітрапаліт рассылае адзін з найбольш ганебных сваіх загадаў уніяцкаму духавенству. Ён патрабуе ад прыходскіх свяшчэннікаў стаць арганізатарамі гітлераўскай адміністрацыі — абраць старастаў і начальнікаў мясцовай паліцыі, мець напагатове фашысцкі сцяг, трымаць на ўліку людзей, якія актыўна паводзілі сябе ў часы Савецкай улады.

6 верасня 1941 г. А. Шаптыцкі выступіў па Львоўскім радыё з пропаведдзю да веруючых і духавенства са словамі падзякі фашысцкай арміі «за вызваленне ад бальшавікоў» і заклікаў народ маліцца за армію фюрэра і перамогу над «бязбожным камунізмам». Звяртаўся мітрапаліт і да самога крывавага дыктатара Германіі. Калі фашысты захапілі Кіеў, ён накіраваў Гітлеру віншавальнае вернаподданніцкае пасланне. Вядомы і іншыя лісты — звароты за подпісам А. Шаптыцкага, адрасаваныя фюрэру.

Уніяцкі клір быў удзячны акупантам за іх абяцанні стварыць «незалежную» Украіну і шчыра ім служыў: дапамагаў рабаваць заходнеўкраінскае сялянства, абкладзенае непамерна вялікімі ваеннымі падаткамі і вымушанае ў абавязковым парадку здаваць заваёўнікам сельскагаспадарчыя прадукты. Святаюрскія іерархі далі «дазвол» сялянам працаваць на акупантаў па нядзелях і нават у хрысціянскія святы, што раней строга забаранялася.

Духавенства па ўказцы мітрапаліта з царкоўных амбонаў агітавала ўкраінскую моладзь ехаць на працу ў Германію. Яно нават удзельнічала ў аблавах на юнакоў і дзяўчат.

У першы перыяд вайны мітрапаліт і яго акружэнне былі аслеплены часовымі перамогамі фашысцкіх войск. Уніяцкія іерархі меркавалі, што наблізіўся час, калі ім трэба актыўна папрацаваць над ажыццяўленнем даўніх сваіх і ватыканскіх планаў акаталічвання СССР і стварэння ўкраінскага уніяцкага патрыярхату. А. Шаптыцкі нават падзяліў усю тэрыторыю Савецкага Саюза на «экзархаты апостальскай сталіцы». У сваім лісце ў Ватыкан на імя кардынала Я. Тысерана мітрапаліт прасіў «апостальскую сталіцу» зацвердзіць яго планы і прапановы.

Адказ прыйшоў у канцы снежня 1941 г. У ім кардынал выказваў вялікую радасць — сваю асабіста і Ваты-

кана — з прычыны таго, што, маўляў, наблізіўся час ажыццяўлення даўніх мар рымскіх пантыфікаў аб пашырэнні каталіцызму далёка на Усход. Кардынал паведаміў А. Шаптыцкаму, што Пій XII прыняў прапанову і дазволіў зрабіць наступныя прызначэнні: 1) уніяцкага епіскапа Мікалая Чарнецкага — экзархам Валыні і Палесся; 2) актыўнага дзеяча ордэна студытаў Клімента Шаптыцкага — экзархам усяе Расіі і Сібіры з месцам знаходжання ў Маскве; 3) Іосіфа Сліпога — экзархам усяе Украіны; 4) ксяндза А. Неманцэвіча — экзархам Беларусі. Усе чатыры экзархаты Пій XII падпарадкаваў А. Шаптыцкаму. Так быў створаны уніяцкі патрыярхат. Бясспрэчна, што ўсе гэтыя прызначэнні былі ўтапічнымі, бо не мелі пад сабой ніякага грунту.

Ватыкан і кіруючыя колы уніяцкай царквы распрацавалі планы «акаталічвання СССР» у той час, калі народы нашай Радзімы са зброяй у руках абаранялі сваю свабоду і незалежнасць. Гэтыя планы прымаліся глыбока патаемна, аб чым у сваім лісце кардынал Я. Тысеран строга папярэдзіў А. Шаптыцкага.

Адразу трэба адзначыць, што ўсе гэтыя задумы не здзейсніліся. Так, не мела колькі-небудзь сур'ёзных вынікаў дзейнасць А. Неманцэвіча. Экзарх спрабаваў ажывіць перавод беларусаў у лона грэка-каталіцкай царквы, зацікавіць гэтай справай акупацыйныя ўлады. Напрыклад, у студзені 1942 г. ён са сваёй рэзідэнцыі ў Альберціне паслаў вернаподданніцкі ліст гаўляйтэру Беларусі, у якім выказваў яму шчырую падзяку «як прадстаўніку вялікай Германіі і вялікага кіраўніка... А. Гітлера» за «вызваленне ад бальшавізма»[6]. Але экзарх так і не здолеў выкарыстаць дапамогу фашысцкіх акупантаў, на якую рабілі стаўку і папа, і мітрапаліт.

Грэка-каталіцкае духавенства цесна супрацоўнічала з гітлераўскімі разведвальнымі і карнымі органамі. Пры гэтым клір вінаваты ў безлічы злачынстваў, якія звязаны з выдачай акупантам савецкіх патрыётаў — партызан і проста незадаволеных «новым парадкам». Інфармацыю фашысцкай адміністрацыі пастаўлялі царкоўнікі рознага рангу: ад самых высокіх да радавых свяшчэннікаў. Нізавое духавенства займалася звычайнымі даносамі на парафіян, здабывала сваю інфармацыю выпытваннем у іх сакрэтаў, карысных для фашыстаў, у часе споведзяў; даводзілася яму і сачыць за падазронымі асобамі. Вышэйшыя іерархі уніяцкай царквы — А. Шаптыцкі, І. Сліпы, архіепіскапы, епіскапы, вядома,

не былі дробнымі даносчыкамі. Важныя для фашысцкай разведкі звесткі яны штодня чэрпалі ад уніяцкіх свяшчэннікаў, манахаў, нацыяналістычных заправіл. Акупацыйныя ўлады атрымлівалі ад іх шпіёнскія матэрыялы ў абагуленым выглядзе.

Асабліва гэтая двудушная, здрадніцкая дзейнасць грэка-каталіцкага кліра ўзмацнілася з развіццём партызанскага руху ў Заходняй Украіне. У гэты час (лета 1942 г.) усе уніяцкія дэканы і парафіяльныя свяшчэннікі атрымалі ўказанне канцылярыі мітрапаліта аб сістэматычнай інфармацыі кіраўніцтва царквы пра становішча ў парафіях. Такія справаздачы-інфармацыі радавое духавенства было абавязана рабіць не радзей аднаго раза ў месяц. У іх пастыры паведамлялі аб патрыятычнай дзейнасці камуністаў і падпольшчыкаў, пра стварэнне і дыслакацыю партызанскіх атрадаў, аб самых дробных праяўленнях незадаволенасці і пратэсту.

Працу А. Шаптыцкага і кліра на карысць рэйха фашысты ацэньвалі высока. У лютым 1943 г. на адной з нарад супрацоўнікаў абвера фашысцкі генерал Лахузен дакладваў, што мітрапаліт і яго прыспешнікі аказалі рэальную дапамогу гітлераўцам у іх барацьбе з савецкімі партызанамі.

Да самае смерці А. Шаптыцкі быў і заставаўся перакананым ненавіснікам Савецкага Саюза. Нават калі крах фашызму ўжо быў відавочны, ён усё яшчэ выступаў прыхільнікам рэйха. Савецкія воіны ў лістападзе 1943 г. вызвалілі Кіеў і паспяхова рухаліся на захад, набліжаючыся да Львова. У гэты час першаіерарх склікаў у горадзе архіепархіяльны сабор і выступіў на ім з прамовай, у якой перасцерагаў сваю паству «ад уплыву варожых камуністычных сіл».

Святаюрская кліка была аднадушна са сваім мітрапалітам, поўнасцю падтрымліваючы планы Ватыкана і Пія XII. Папа і яго акружэнне страшэнна баяліся перамогі СССР у вайне з гітлераўцамі і рабілі ўсё магчымае, каб прадухіліць яе. Яны намагаліся аслабіць і раскалоць сілы антыгітлераўскай кааліцыі, запалохвалі лідэраў заходніх дзяржаў «небяспекай камунізму», прапагандавалі (у канцы вайны) сепаратны мір з Германіяй і стварэнне адзінага фронту капіталістычных дзяржаў супраць СССР.

У час акупацыі Заходняй Украіны гітлераўцы стварылі паліцыю, якую называлі ўкраінскай. У акругах, валасцях і вёсках былі арганізаваны паліцэйскія каманды,

камісарыяты і ўчасткі. Яны падпарадкоўваліся непасрэдна мясцовым аддзелам гестапа і СД. На службу ў паліцыю пайшлі дэкласаваныя элементы, людзі, якія былі настроены варожа да Савецкай улады. Паліцэйскія разам з акупантамі, а часта і па ўласнай ініцыятыве, учынялі над украінскім народам страшэнныя злачынствы. Саўдзельнікам іх было уніяцкае духавенства. З бласлаўлення свяшчэннікаў фашысцкія паслугачы здзекаваліся з мірнага насельніцтва, катавалі тых, хто падазраваўся ў сувязях з падпольшчыкамі і партызанамі, актыўных будаўнікоў сацыялізму ў 1939—1941 гг. З ведама мітрапаліта некаторыя свяшчэннікі і манахі рабіліся паліцэйскімі. Яны ўзначальвалі адпаведныя ўчасткі і камісарыяты. І цяпер народ не можа забыцца пра іх актыўны ўдзел у рабаўніцтве сялян, масавых расстрэлах мірнага насельніцтва, барацьбе супраць партызан, адпраўцы моладзі на катаржныя работы ў Германію.

У пачатку 1943 г., паводле ўказання гестапа, украінскія нацыяналісты ствараюць свае вайсковыя фарміраванні, якія атрымалі назву «Украінская паўстанцкая армія» (УПА). Фарміравалася яна пры актыўнай дапамозе фашыстаў. Касцяк УПА склалі падраздзяленні «ўкраінскай» паліцыі і карнікі батальёна «Нахтыгаль» (да сакавіка 1942 г. ён дыслацыраваўся ў Беларусі). Галоўнай мэтай УПА была барацьба з гераічным партызанскім рухам на часова акупіраванай тэрыторыі СССР. Яна верна служыла акупантам, тэрарызавала і рабавала мірнае насельніцтва, па-зверску распраўлялася з савецкімі актывістамі і падпольшчыкамі, рабіла напады на партызанскія атрады, дапамагала акупантам ахоўваць ад народных мсціўцаў транспартныя камунікацыі, перадавала СД разведвальную інфармацыю. Кіруючае становішча ў УПА, як і ў АУН, займалі выхадцы з эксплуататарскага асяроддзя і духавенства. Так, верхаводы АУН — С. Бандэра, Я. Стэцько, С. Лянкоўскі — сыны уніяцкіх свяшчэннікаў; кіраўнікі УПА — Р. Шухевіч, А. Луцкі, Д. Грыцай — паходзілі з сем'яў буйных землеўладальнікаў; члены галоўнага провада[7] АУН — Н. Лебедзь і І. Грыньёх, шэф службы бяспекі (СБ) Н. Арсеніч — дзеці кулакоў; бацька члена галоўнага провада АУН Я. Рака — акруговы суддзя. «Галоўнакамандуючым УПА» загадам Гімлера быў прызначаны памочнік С. Бандэры Р. Шухевіч.

Стварэнне «арміі» з вялікай радасцю сустрэлі А. Шаптыцкі і вышэйшыя саноўнікі уніяцкай царквы.

Яны неаднойчы прымалі ў сваіх рэзідэнцыях яе камандны састаў, давалі ім сваё архіпастырскае бласлаўленне на барацьбу з савецкімі патрыётамі. У 1943 — пачатку 1944 гг. нярэдка наведваў першаіерарха І. Грыньёх. Мітрапаліт і яго памагатыя цікавіліся дзеяннямі УПА супраць партызан. Аб гэтым іх падрабязна інфармавалі заправілы АУН, якія камандавалі новастворанаым «войскам».

«Духоўны бацька» нацыяналістаў наступным чынам сфармуліраваў задачу УПА: «...зараз павінна быць усебаковая дапамога нямецкім уладам і падаўленне камуністычнага ўплыву на Галіцыю». Мітрапаліт раіў «шырэй абапірацца на духавенства, якое мае вялікі вопыт». Ён заявіў, што неабходна «...яшчэ раз падкрэсліць агульнасць інтарэсаў грэка-каталіцкага свяшчэнства і ўкраінскіх патрыётаў». Пад апошнімі меліся на ўвазе буржуазныя нацыяналісты. А. Шаптыцкі блаславіў бандэраўцаў «на актыўную работу ў імя бога, царквы і нашай справы»[8].

Вясной 1944 г. мітрапаліта наведаў Р. Шухевіч. «Галоўнакамандуючы» прасіў «яго эксцэленцыю» дапамагчы знайсці «правільную лінію паводзін» у сітуацыі, што склалася на гэты час. Р. Шухевіч прапанаваў наступны план дзеянняў: «...як толькі пройдзе Чырвоная Армія, трэба пачаць актыўныя дзеянні шырокага маштабу ў савецкім тыле. Для гэтага атрады УПА атрымліваюць вялікае папаўненне за кошт нашых надзейных людзей, якія зараз працуюць у сістэме нямецкай адміністрацыі. Немцы забяспечваюць нас узбраеннем і боепрыпасамі, а далей, па меры патрэбы, будуць папаўняць нашы запасы з самалётаў»[9].

А. Шаптыцкі падтрымаў гэтыя разлікі і пастараўся заспакоіць нацысцкага найміта: маўляў, рана гаварыць аб немінучым паражэнні фашыстаў. Мітрапаліт быў упэўнены, што саюзнікі СССР супраць канчатковага паражэння Германіі, але, калі нават гэта адбудзецца, то яны не дапусцяць Чырвоную Армію на прасторы Еўропы.

Верныя паслугачы Гітлера — нацыяналісты яшчэ напярэдадні карэннага пералому ў ходзе Вялікай Айчыннай вайны прапанавалі фашысцкаму камандаванню сфарміраваць украінскую дывізію для барацьбы з Чырвонай Арміяй. Гестапа адобрыла такое «мерапрыемства», ухваліў яго і уніяцкі мітрапаліт. 28 красавіка 1943 г. у Львове адбылася ўрачыстая цырымонія ў сувя-

зі з міласцівым дазволам фюрэра на стварэнне «ўкраінскай дывізіі» СС «Галічына». На яе ў поўным парадзе з'явіўся ўвесь святаюрскі капітул [10] на чале з каад'ютарам І. Сліпым.

Цырымонія закончылася ў саборы святога Юра. Грэка-каталіцкая царква не толькі натхніла нацыяналістаў на чарговае злачынства супраць украінскага народа. Яна прыняла найактыўнейшы ўдзел у стварэнні «ўкраінскага злучэння». А. Шаптыцкі асабіста блаславіў салдат гэтай дывізіі на братазабойчую вайну. У якасці капеланаў прызначаліся уніяцкія свяшчэннікі, якія прысягнулі на вернасць Гітлеру.

Мабілізацыя ўкраінскай моладзі праводзілася гвалтоўна. Царква поўнасцю падтрымала гэты метад набору. Была разгорнута шырокая прапагандысцкая кампанія. У маі — чэрвені 1943 г. у гонар дывізіі «Галічына» былі праведзены ўрачыстыя набажэнствы ва ўсіх храмах Заходняй Украіны. Іх спраўлялі епіскапы І. Сліпы, М. Будка, І. Лятышэўскі, І. Кацылоўскі, дэканы і парафіяльныя свяшчэннікі. Галоўны вярбовачны пункт быў арганізаваны ў памяшканні духоўнай семінарыі. У «мабілізацыйныя камісіі» ўваходзілі дзесяткі надзейных, г. зн. адданых фашызму, свяшчэннікаў. Яны не толькі агітавалі ўкраінскіх юнакоў, але і ўдзельнічалі ў аблавах на тых, хто хаваўся ад нацыстаў. Галоўным капеланам дывізіі быў прызначаны даверaны самога А. Шаптыцкага, прафесар уніяцкай духоўнай акадэміі В. Лаба. Яму было прысвоена званне «генеральнага вікарыя па вайсковых справах» і «рэферэнта душпастырства пры баявой управе стралковай дывізіі «Галічына».

Гэты фашысцкі прыспешнік у часы грамадзянскай вайны быў капеланам батальёна січавых стральцоў. Потым ён стаў прафесарам і выкладаў патралогію («творы святых айцоў»). У 1939 г. перад уступленнем Чырвонай Арміі ў Львоў уцёк ад ненавіснай яму Савецкай улады. В. Лаба жыў у гітлераўскай Германіі. Там, разам з іншымі ўкраінскімі нацыяналістамі, ён у хуткім часе пачаў супрацоўнічаць з фашысцкай разведкай. Разам з гітлераўскімі акупантамі В. Лаба вярнуўся ў Львоў і прымаў актыўны ўдзел у фарміраванні «Галічыны».

Добраахвотнікамі ў дывізію ўступілі многія манахі-васіліяне, якія і да гэтага верна служылі львоўскаму СД у якасці тайных супрацоўнікаў. Яны разгарнулі асабліва актыўную прапаганду за ўступленне ўкраінскіх юнакоў у дывізію СС «Галічына». Але маладыя людзі ўхіля-

ліся ад мабілізацыі. Іх лавілі і прымусова адпраўлялі на работы ў Германію. Каб пазбегнуць скандальнага правалу, уніяцкім свяшчэннікам было загадана паказаць «ахвярны прыклад» і «добраахвотна» запісаць у дывізію сваіх сыноў.

З дапамогай абману і прымусу гэтае злучэнне было ўсё ж сфарміравана. Яно афіцыйна называлася «14-я Грэнадзірэн вафен СС дывізіён «Галіцыен». Большасць каманднага саставу яе на чале з брыгадэнфюрэрам СС Ф. Фрэйтагам былі немцы. Камандзірамі прызначаліся і здраднікі з АУН, хаця гітлераўскія афіцэры ніколі не лічылі іх роўнымі сабе і глядзелі на афіцэраў-украінцаў як на людзей трэцяга гатунку (гэта падмацоўвалася распараджэннем гітлераўскага генералітэта).

Нямецкае камандаванне ў сярэдзіне 1944 г. кінула дывізію на савецка-германскі фронт. Пад Бродамі, разам з іншымі фашысцкімі злучэннямі, яна трапіла ў акружэнне і была разбіта.

Гітлераўскія наймиты — украінскія буржуазныя нацыяналісты і іх уніяцкія духоўныя айцы — не спынялі сваёй вернай службы фашыстам нават тады, калі апошнія панічна ўцякалі ад Чырвонай Арміі. Адны з іх рыхтаваліся працягваць сваю здрадніцкую дзейнасць за межамі СССР, а іншыя (напрыклад, бандыты УПА) — да «вялікіх акцый» у тыле савецкіх войск.

З бласлаўлення сваіх пастыраў нацыяналісты пакінулі на вызваленай тэрыторыі антысавецкае падполле. Яго ўдзельнікі вялі актыўную падрыўную дзейнасць: збіралі матэрыялы для фашысцкай разведкі, бязлітасна тэрарызавалі і рабавалі мясцовае насельніцтва, ажыццяўлялі дыверсіі ў савецкіх дзяржаўных і гаспадарчых установах, на прадпрыемствах, забівалі камуністаў і савецкіх работнікаў, актывістаў.

Атрады УПА, такім чынам, моцна перашкаджалі аднаўленню народнай гаспадаркі, наносілі вялікую шкоду Савецкай уладзе і ўкраінскаму народу. У бандах знаходзілася нямала уніяцкіх свяшчэннікаў. Многія з іх атрымалі адукацыю ў падапечнай І. Сліпому акадэміі, а большасць скончыла духоўныя семінарыі. Грэка-каталіцкія служыцелі культа нярэдка прымалі самы актыўны і непасрэдны ўдзел у справах УПА. Парафіяльныя свяшчэннікі, якія заставаліся на сваіх месцах, хавалі ў цэрквах і ўласных дамах зброю і ўкрывалі злачынцаў. І гэта ў той час, як, паводле царкоўных канонаў і правілаў, у хрысціянскія храмы катэгарычна забараняецца

ўносіць зброю. Даволі часта былі такія выпадкі, калі пасля забойстваў бандыты з'яўляліся да «святых айцоў», спавядаліся і атрымлівалі «дараванне грахоў».

Многія манастыры былі ператвораны ў логавы ворагаў народнай улады. У іх укрываліся не толькі тэрарысты з УПА, АУН, але і былыя ваякі дывізіі «Галічына». Хаваліся грамілы таксама ў духоўнай акадэміі і львоўскай семінарыі.

Такім чынам, уніяцкае духавенства, пачынаючы ад нізавога і канчаючы самымі буйнымі іерархамі, давала прытулак бандытам УПА, хавала іх, забяспечвала харчаваннем, інфармавала аб савецкіх актывістах, натхняла на забойствы, катаванні, рабункі, падпалы.

У выніку вялікай растлумачальнай работы, якую настойліва праводзілі партыйныя, савецкія і камсамольскія органы, большасць радавых УПА здалася органам Савецкай улады. Антысавецкае падполле распалася.

Так праваліліся планы грэка-каталіцкай царквы і Ватыкана аб пашырэнні уніі на Усход. Нямецка-фашысцкая ваенная машына была разгромлена. Парафіяне, якія на сабе адчулі ўсе «перавагі» палітыкі уніятаў і нацыяналістаў, рашуча ад іх адвярнуліся. Паступова стабілізавалася ў вызваленых заходніх абласцях Украіны жыццё, хоць яшчэ даводзілася змагацца з недабітымі рэшткамі банд УПА.

У лістападзе 1944 г. пераемнік А. Шаптыцкага І. Слі-пы паведаміў Ватыкану аб смерці мітрапаліта. Гэтая падзея «была сімвалам канца старой грэка-уніяцкай царквы ў Заходняй Украіне, на якую папы, пачынаючы з Урбана VIII у пачатку XVII ст., ускладалі так многа надзей у стварэнні уніі ўсходніх цэркваў. Смерць А. Шаптыцкага завяршыла гэты перыяд у гісторыі уніі ўсходніх цэркваў»[11].

Пасля паражэння гітлераўскай Германіі Ватыкан усё яшчэ не губляў надзеі на пашырэнне каталіцызму на тэрыторыі СССР. 23 снежня 1945 г. Пій XII выдае энцыкліку, у якой па-ранейшаму выказвае надзеі на правядзенне уніі з рускай праваслаўнай царквой. Але гэта спроба, як і папярэдняя, не мела поспеху. Унутры грэка-каталіцкай царквы ў Заходняй Украіне ўжо пачаўся працэс, які пазней прывёў яе да ўз'яднання з праваслаўем.

Мітрапаліт А. Шаптыцкі, а пасля яго смерці — І. Слі-пы, усе іншыя найвышэйшыя царкоўныя дзеячы і многія парафіяльныя свяшчэннікі сваёй прафашысцкай антынароднай дзейнасцю канчаткова скампраметавалі сябе ў

вачах веруючых. Парафіяне, большасць нізавога духавенства настойліва патрабавалі ліквідацыі Брэсцкай змовы. Гэты рух узмацніўся з вясны 1945 г. Яго ўзначалілі: ад Львоўскай архіепархіі — настаяцель львоўскай Прэабражэнскай царквы пратапрэсвітэр доктар Гаўрыіл Касцельнік, ад Драгобыча-Самборскай епархіі — генеральны вікарый доктар Міхаіл Мельнік, ад Станіслаўскай — дэкан доктар Антоній Пяльвецкі. Свяшчэннікі стварылі Цэнтральную ініцыятыўную групу па ўз'яднанню грэка-каталіцкай царквы з рускай праваслаўнай. Старшынёй яе быў абраны Г. Касцельнік. У звароце ініцыятыўнай групы да ўрада Украінскай ССР было запісана: «...уніяцкая царква ў новых умовах нашага дзяржаўнага і народнага жыцця з'яўляецца гістарычным перажыткам. Калі ўвесь украінскі народ аб'яднаўся ў адзін дзяржаўны арганізм, то яго царква павінна аб'яднацца ў адну царкву — сваю родную, незалежную ад іншаземнага ярма, у праваслаўную, якая з'яўляецца царквою нашых бацькоў»[12].

У 1945 г. Г. Касцельнік апублікаваў сваё праграмнае антыуніяцкае і антыпапскае сачыненне «Апостал Пётр і папы рымскія». Аўтар пераканаўча давёў, што Брэсцкая царкоўная унія 1596 г. была праведзена не з прычын чыста рэлігійнай неабходнасці, а па палітычных меркаваннях. У сваёй заяве прадстаўнікам улады Г. Касцельнік адзначыў, што уніяцкае духавенства было прыхільнікам нацыяналізму, які прынёс народу «самыя горшыя няшчасці». Стаўшы паслугачамі нямецкіх фашыстаў, нацыяналісты дапамагалі ім рабаваць украінскі народ, стварылі дывізію СС «Галічына». Г. Касцельнік сказаў і аб тым горы, якое прынёс нацыяналізм і яго сям'і: ён загубіў трох яго сыноў.

З мая 1945 па сакавік 1946 г. ва ўсіх дэканатах адбываліся так званыя «саборчыкі» грэка-каталіцкага кліру. На іх дэлегаты выказвалі свае адносіны да аб'яднання уніяцкай і рускай праваслаўнай цэркваў. У «саборчыках» удзельнічалі члены ініцыятыўнай групы. Гэтыя сходы вырашылі парваць з Ватыканам і ўз'яднацца з рускай праваслаўнай царквой.

Ватыкан, нацыяналістычнае атрэб'е, яго уніяцкія апалагеты прыкладалі ўсе намаганні, каб перашкодзіць рабоце ініцыятыўнай групы. Папа Пій XII у энцыкліцы, апублікаванай 23 снежня 1945 г., патрабаваў ад каталікаў падтрымаць унію і асудзіў думку пераважнай большасці грэка-каталіцкага духавенства аб вяртанні ў пра-

васлаўе як «богапраціўны і ерэтычны» акт. Ватыканскі друк і радыё хлусліва абвінавачвалі Савецкую ўладу ў быццам бы гвалтоўным вяртанні «гнаных» уніятаў «у лона праваслаўя». Г. Касцельніка, на якога сыпаліся найбольш злосныя напады, Ватыкан адлучыў ад царквы і аддаў анафеме. Гэта быў буйны падзвіжнік веры, які займаўся пытаннямі багаслоўя і гісторыі уніяцкай царквы. Безумоўна, што як гісторык ён стаяў на ідэалістычных пазіцыях, але дайшоў да правільнага разумення уніяцтва.

8—10 сакавіка 1946 г. у Львове адбыўся сабор грэка-каталіцкай царквы, скліканы ініцыятыўнай групай.

Колькасць уніяцкіх свяшчэннікаў у Заходняй Украіне за гады вайны значна паменшылася. Многія з іх пайшлі ў дывізію «Галічына» і банды АУН ці ў абозе адступаўшых акупантаў збеглі за мяжу. Некаторыя загінулі ад рук нацыяналістаў, нарэшце, частка свяшчэннікаў пасля сканчэння вайны адмовілася ад духоўнага сану. У гэты час былі пакараны многія гітлераўскія халуі. Так, за актыўнае супрацоўніцтва з фашысцкімі акупантамі і антысавецкую дзейнасць у 1946 г. да судовай адказнасці былі прыцягнуты: мітрапаліт грэка-каталіцкай царквы І. Сліпы і епіскапы Н. Чарнецкі, М. Будка, Г. Хамішын, І. Лятышэўскі. У ходзе следства іх віна была пераканаўча даказана.

Сабор грэка-каталіцкай царквы поўнасцю прадстаўляў яе духавенства. На ім было 216 дэлегатаў, якіх выбралі 986 свяшчэннікаў з Львоўскай, Цярнопальскай, Станіслаўскай і Драгобыцкай абласцей. Прысутнічала на саборы і 19 прадстаўнікоў ад веруючых з дарадчым голасам. Ад удзелу ў саборы адмовіўся 281 найбольш рэакцыйны свяшчэннік.

Пастанова Львоўскага сабора аб поўным і вечным разрыве з Рымам, уз'яднанні з рускай праваслаўнай царквой была прынята аднагалосна ўсімі яго ўдзельнікамі і падтрымана веруючымі. Сабор абвясціў спыненне дзейнасці грэка-каталіцкай царквы ў заходніх абласцях Украіны і Закарпацці. 7 красавіка 1946 г. патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Алексій аформіў прыём уніяцкай царквы ў склад рускай праваслаўнай. Г. Касцельнік, М. Мельнік і А. Пяльвецкі былі ўзведзены ў сан епіскапаў. Так унія была асуджана і скасавана ў Заходняй Украіне самімі веруючымі і духавенствам. Праз тры гады, у 1949-м, самаліквідавалася Мукачаўская уніяцкая епархія. Брэсцкая царкоўная змова перастала існаваць на тэ-

рыторыі СССР. Бясслаўны канец яе з'явіўся моцным ударам па Ватыкану: такіх страт ён не ведаў з гадоў Рэфармацыі. Таму ярасць яго заправіл добра зразумелая. Няспынныя клопаты на працягу стагоддзяў аб пашырэнні уніі на ўсю Украіну і Беларусь, а потым на Расію, праваліліся. Рым страціў не толькі паству, але і цэлую царкоўную арганізацыю з усім клірам.

Апостальская сталіца была добра інфармавана аб падрыхтоўцы Львоўскага сабора. Вышэйшыя дзеячы каталіцкай царквы рабілі адчайныя намаганні сарваць яго і не дапусціць ліквідацыі уніі. Удар гэты быў вельмі балючым яшчэ і таму, што унію ліквідавалі не «Саветы» ці «атэістычны камунізм», а само былое грэка-каталіцкае духавенства і веруючыя.

Але гэта не перашкодзіла ватыканскім фальсіфікатарам распачаць у друку і эфіры шалёную антысавецкую кампанію. Яны сцвярджалі, што Львоўскі сабор быў быццам бы непрадстаўнічым — складаўся толькі з некалькіх свяшчэннікаў-адшчапенцаў, якія дзейнічалі нібыта «па ўказцы Саветаў», што ў Заходняй Украіне многія пастыры, не згодныя парваць з яго рашэннямі, арыштаваны і расстраляны.

Страшэнна непакоілі Рым настроі веруючых украінцаў-эмігрантаў. Многія з іх ліквідацыю уніі на Украіне таксама сустрэлі з радасцю. Таму Ватыкан патрабаваў ад грэка-каталіцкіх епіскапаў Канады і ЗША арганізаваць масавыя пратэсты супраць пастановы сабора, даводзіць яго незаконнасць, узняць кампанію пратэсту супраць «праследавання рэлігіі ў СССР». Нават і цяпер украінскія буржуазныя нацыяналісты і клерыкалы ў капіталістычных краінах Еўропы і Амерыкі, хоць і без поспеху, але імкнуцца даказаць «неправамоцнасць» Львоўскага сабора, упэўніць эмігрантаў у тым, што рашэнні яго быцам бы «навеяны ўладамі».

У першыя пасляваенныя гады лютасць заправіл апостальскай сталіцы не абмяжоўвалася кампаніяй паклёпаў на СССР. На спецыяльнай нарадзе ў Ватыкане, як аб гэтым паведаміў І. Грыньёх вузкаму колу бандэраўцаў, абмяркоўвалася пытанне пра забойства доктара Г. Касцельніка. Вырашана было знішчыць яго рукамі фанатыка уніі, каб не было падазрэння на Ватыкан і справа выглядала так, быццам самі веруючыя пакаралі адступніка.

Аператыўнае кіраўніцтва нацыяналістычных арганізацый у канцы 40-х гг. знаходзілася ў амерыканскай і

англійскай зонах акупацыі Германіі. Завадатары АЎН вельмі высока ацэньвалі антынародную дзейнасць уніяцкай царквы і добра разумелі, што страцілі свайго самага вернага і шчырага саюзніка. У Заходняй Украіне недабіткі нацыяналістычных галаварэзаў, у адпаведнасці з указаннямі замежных верхаводаў, па начах вылазілі са сваіх «схронаў» для крывавых распраў, рабаўніцтва, каб прымусіць свяшчэннікаў парваць з праваслаўем і працягваць ранейшую дзейнасць. Асабліва люта помсцілі бандыты тым асобам, якія садзейнічалі ўз'яднанню грэка-каталіцкай царквы з праваслаўнай.

З ведама і бласлаўлення Ватыкана замежныя нацыяналістычныя цэнтры рыхтаваліся знішчыць Г. Касцельніка. Забойцы пачалі дзейнічаць задоўга да ўз'яднання уніяцкай царквы з праваслаўнай — з таго часу, як толькі стала актывізавацца работа Г. Касцельніка і яго аднадумцаў. Калі ж Львоўскі сабор усё ж такі адбыўся, нацыяналісты пачалі распаўсюджваць лістоўкі, у якіх узводзілі паклёпы на пратапрэсвітэра, заклікалі свяшчэннікаў пазбягаць яго, а веруючых — не хадзіць на набажэнствы, якімі правіць адступнік «святой веры» і «вялікага мітрапаліта» (г. зн. А. Шаптыцкага).

Замахі на Г. Касцельніка бандыты рабілі двойчы і ў абодвух выпадках няўдала. І толькі 20 верасня 1948 г. у Львове пры выхадзе з Прэабражэнскай царквы пасля набажэнства Г. Касцельнік быў забіты. Злачынец, убачыўшы, што ўцячы не ўдасца, застрэліўся.

Ахвярай нацыяналістычнага тэрору стаў і ўкраінскі пісьменнік-камуніст Яраслаў Аляксандравіч Галан. Непрымірымы да падкопаў Ватыкана, злачынстваў уніі і ўкраінскага буржуазнага нацыяналізму, ён зброяй сваёй выкрывальнай сатыры вёў з імі бязлітасную барацьбу. Газета «Правда» з глыбокім жалем пісала: «Яраслаў Галан належыць да той перадавой групы заходнеўкраінскіх пісьменнікаў, якія яшчэ ў чорныя дні панавання ў Галіцыі польскіх капіталістаў і памешчыкаў узнялі свой голас за ўз'яднанне Заходняй Украіны з Савецкай Украінай»[13]. Яго вострыя палітычныя памфлеты «З крыжам ці з нажом?», «Што такое унія?», «Я і папа», «Апостал здрады», «На службе ў сатаны» і многія іншыя былі накіраваны на выкрыццё антынароднай і антысавецкай дзейнасці заправіл Ватыкана і грэка-каталіцкай царквы, а таксама буржуазных украінскіх нацыяналістаў. Нядзіўна, што шалёная нянавісць кіравала не склаўшымі зброю нацыяналістамі і уніятамі, якія арганізавалі рас-

праву з палымяным пісьменнікам-камуністам. Яны доўга сачылі за Я. Галанам, вывучалі яго кватэру, падбіралі непасрэдных забойцаў. Такімі аказаліся Іларый Лукашэвіч, сын уніяцкага свяшчэнніка, і Міхаіл Стахур, тэрарыст з УПА. М. Стахур нанёс пісьменніку ў яго кватэры адзінаццаць удараў сякерай па галаве, прычым кожны, паводле сцвярджэння экспертызы, быў смяротны. Гэта адбылося 24 кастрычніка 1949 г. Рукамі злачынца кіраваў Ватыкан.

Не толькі да тэрору звярталіся ворагі ўкраінскага народа. Вядомы спробы ажывіць унію. Так, група фанатыкаў-уніятаў актыўна намагалася стварыць на Львоўшчыне адпаведны нелегальны епіскапат. Праваліліся і іншыя планы, звязаныя з імкненнем даць другое жыццё Брэсцкай змове на тэрыторыі СССР яе рэўнаснымі прыхільнікамі з ліку нацыяналістычна настроеных прадстаўнікоў былога уніяцкага духавенства. Але ўсе яны былі бясплённымі. Веруючыя ўкраінцы без хістання перайшлі ў праваслаўе. Крывавы тэрор у адносінах да Я. Галана, Г. Касцельніка, а таксама парафіяльных свяшчэннікаў, якія перайшлі ў праваслаўе, іншых патрыётаў, не змог адрадзіць унію ў СССР.

Грэка-каталіцкая царква заўсёды дзейнічала ў інтарэсах ворагаў украінскага, беларускага і рускага народаў. Служба на карысць заклятых праціўнікаў сацыялізму прывяла яе да дыскрэдытацыі ў вачах веруючых. Таму нядзіўна, што яе былыя парафіяне ў Заходняй Украіне, Закарпацці, Букавіне або зусім адышлі ад рэлігіі, або вярнуліся да праваслаўя, і толькі нязначная частка іх засталася вернай уніі. Іх колькасць настолькі невялікая, што рэлігійныя перакананні іх ужо не маюць ніякага ўплыву ў савецкім грамадстве.

ВЫВАДЫ ТАК І НЕ ЗРОБЛЕНЫ

У час наступлення Чырвонай Арміі многія дзеячы уніяцкай царквы, пачынаючы ад епіскапаў і канчаючы парафіяльнымі свяшчэннікамі, разам з гітлераўскімі акупантамі і вернымі іх служкамі — буржуазнымі нацыяналістамі — уцяклі на Захад, каб пазбегнуць пакарання за сваю крывавую службу фашызму і актыўны ўдзел у нацыяналістычных бандах.

Восенню 1945 г. збегшыя з Радзімы ў абозе вермахта

здраднікі апынуліся ў Мюнхене, Аўсбургу, Міттэнвальдзе, Рэгенбургу, Новым Ульме — у амерыканскай і англійскай зонах акупацыі Германіі. Былыя саюзнікі ўзялі пад ахову ўцекачоў і прадаставілі ім статус «перамешчаных асоб», арганізавалі адпаведныя лагеры. Гітлераўскія пасобнікі ахвотна пайшлі на службу новым гаспадарам, якія ўкрылі іх ад адказнасці за найцяжэйшыя злачынствы.

Недабіткі з дывізіі «Галічына» разам са сваімі капеланамі знайшлі прытулак у Італіі пад апекай англійскіх ваенных улад. Уніяцкія свяшчэннікі праводзілі набажэнствы, заклікалі ўкраінцаў не вяртацца на Радзіму і за мяжой працягваць барацьбу супраць бальшавізму. Адміністрацыя лагера ўсялякімі спосабамі не дапускала рэпатрыяцыі ваеннапалонных. Яна мела намер выкарыстаць іх у барацьбе супраць СССР. Савецкая ваенная місія запатрабавала ад англійскай акупацыйнай адміністрацыі рэпатрыіраваць рэшткі асабовага складу злучэння. Каб не дапусціць гэтага, урад Вялікабрытаніі ў маі 1947 г. перавёў былых вайскоўцаў у Англію, а адтуль у якасці «перамешчаных асоб» яны атрымалі магчымасць выехаць у ЗША, Канаду, Аўстралію і іншыя капіталістычныя краіны.

Найбольшая колькасць нацыяналістычных і уніяцкіх элементаў асела ў амерыканскай зоне акупацыі Германіі. Іх верхаводы прапанавалі разведцы ЗША свае паслугі. На чале закардоннага прадстаўніцтва так званага Украінскага галоўнага вызваленчага савета — гэтага нацыяналістычна-уніяцкага фарміравання, галоўнай задачай якога была падрыўная работа на тэрыторыі СССР, апынуўся шпіён і забойца ў сутане І. Грыньёх. Знаходзілася ЗП УГВС на ўтрыманні амерыканскай разведкі.

У красавіку 1946 г. у Мюнхене адбылося зборышча былых пасобнікаў фашыстаў — украінскіх, беларускіх, літоўскіх, армянскіх, татарскіх, венгерскіх, балгарскіх, харвацкіх і іншых нацыяналістаў. Утварыўся Антыбальшавіцкі блок народаў. Узначаліў яго кат украінскага народа Я. Стэцько, выгадаваны ў сям'і уніяцкага свяшчэнніка ў духу асабістай любові і адданасці А. Шаптыцкаму.

Выхаванцы «вялікага мітрапаліта» і яго пераемніка І. Сліпога пасля вызвалення заходніх раёнаў Украіны ўцяклі на захад і засталіся перакананымі нацыяналістамі. Яны, разам са сваімі аднадумцамі, сабраліся ў Мюнхене. Былыя нашы саюзнікі са спачуваннем прымалі тлу-

мачэнні уніятаў-эмігрантаў аб прычынах, якія прымусілі іх пакінуць Радзіму,— маўляў, баяліся «праследаванняў» Савецкай улады за «рэлігійную дзейнасць». На самай справе ім добра былі вядомы сапраўдныя матывы ўцёкаў грэка-каталіцкіх іерархаў. Уніяцкае духавенства мела поўную магчымасць весці за мяжой антысавецкую дзейнасць разам з украінскімі нацыяналістамі.

Пасля заканчэння II сусветнай вайны нянавісць да камунізму была па-ранейшаму асновай палітыкі Ватыкана. Рым, разам з рэакцыйнымі коламі ЗША, прымаў актыўны ўдзел у распальванні антысаветызму. Пій XII па-ранейшаму дамагаўся стварэння адзінага «хрысціянскага фронту супраць СССР». Таму апостальская сталіца падтрымлівала ваенных злачынцаў — украінскіх буржуазных нацыяналістаў, аказвала маральную і матэрыяльную дапамогу уніяцкім епархіям у Заходняй Еўропе і Амерыцы. Апрача таго Ватыкан спрабаваў стымуляваць варожую Савецкай уладзе дзейнасць рэшткаў уніяцкага духавенства ў СССР.

Гэтым займаліся Усходняя кангрэгацыя, якую ўзначальваў даўні апякун грэка-каталіцкай царквы кардынал Я. Тысеран, ватыканскі Усходні інстытут і Калегіум русікум. Дзякуючы дапамозе Я. Тысерана ў 1946 г. у Рыме ствараецца «Украінскі камітэт дапамогі бежанцам». Узначаліў яго епіскап І. Бучко, які меў цесныя сувязі з ваеннай адміністрацыяй ЗША, Англіі і Францыі. У складзе гэтага камітэта працавалі прадстаўнікі разведак названых дзяржаў.

У лагерах для «перамешчаных асоб» на тэрыторыі Заходняй Германіі ў маі 1947 г. арганізавана 118 уніяцкіх прыходаў, якія абслугоўваліся 186 свяшчэннікамі. «Святыя айцы» заклікалі сваіх парафіян працягваць антысавецкую дзейнасць і быць вернымі нацыяналістычным ідэалам. Ствараліся брацтвы (святога Івана Міласцівага, святога архангела Рафаіла і іншыя). Іх узначальвалі духоўныя асобы і фанатыкі-нацыяналісты. Гэтыя аб'яднанні апрацоўвалі ўкраінцаў, асабліва моладзь, у антысавецкім духу.

У першыя пасляваенныя гады грэка-каталіцкая царква падзялялася на тры пратапрэсвітэрыяты з кафедрамі ў Мюнхене, Гановеры і Фрэйбургу. Іх дзейнасцю кіраваў апостальскі візітатар у Заходняй Еўропе, стары прыспешнік нацыстаў Мікалай Ваякоўскі. Ён знаходзіўся ў непасрэдным падпарадкаванні Усходняй кангрэгацыі. Потым, у канцы 1947 г., паводле спецыяльнага дэкрэта

Пія XII яго змяніў І. Бучко — фактычны у той час галава уніяцкай царквы ў эміграцыі.

І. Бучко наведаў большасць буйных лагераў для «перамешчаных асоб». Апостальскі візітатар заклікаў украінцаў быць вернымі уніяцкай царкве, Пію XII, ідэалогіі нацыяналізму.

Мюнхен у тыя гады быў месцам, дзе знаходзіліся найважнейшыя ўкраінскія буржуазна-нацыяналістычныя арганізацыі. Таму І. Бучко і абраў горад месцам апостальскай візітатуры. У 1947—1948 гг. ён наведвае Англію, Францыю, Аўстрыю, Бельгію, Галандыю, Іспанію, неаднаразова — Ватыкан. Пры сустрэчы з прадстаўнікамі ўрадаў епіскап прасіў павялічыць падачкі «Камітэту дапамогі бежанцам», які ён узначальваў. Візітатар імкнуўся пераканаць афіцыйных асоб гэтых дзяржаў у тым, што нацыяналісты і уніяцкае духавенства быццам бы не маюць адносін да зверстваў фашыстаў, прапагандаваў думку аб неабходнасці адзінства ўкраінскай эміграцыі. Усюды ў сваіх выступленнях І. Бучко заяўляў аб тым, што ватыканская візітатура ў Заходняй Еўропе будзе падтрымліваць нацыяналістаў.

Па ініцыятыве гэтага легата [1] ў Льежы (Бельгія) у 1948 г. была створана «Украінская каталіцкая прэсслужба» (УКПС). Яна інфармавала кіраўніцтва каталіцкай і іншых цэркваў, урадаў заходніх дзяржаў і ўсяго «свабоднага свету» аб сучасным становішчы уніяцкай царквы, а таксама «аб праследаванні рэлігіі ў СССР». У 1948 г. пачаў выходзіць штомесячны друкаваны орган грэка-католікаў Заходняй Еўропы «Християнський шлях». З'явіліся і штодзённыя нацыяналістычныя газеты.

Фінансавалася антысавецкая дзейнасць здраднікаў за кошт субсідый Ватыкана, спецслужб ЗША, а таксама іншых капіталістычных дзяржаў, падачак рэлігійных і буржуазна-нацыяналістычных арганізацый Злучаных Штатаў і Канады.

На грошы Ватыкана ў горадзе Сарсель (каля Парыжа) быў набыты зямельны ўчастак і будынак для размяшчэння выдавецкага цэнтра імя Т. Р. Шаўчэнкі (дарэчы вялікі паэт-дэмакрат ненавідзеў унію) і створаны ўкраінскі свабодны універсітэт (УВУ) у Мюнхене. У гэтай «навучальнай» установе за некалькі месяцаў недавучкі — члены АУН рабіліся «магістрамі», «прафесарамі», «дактарамі» філасофіі, права, эканомікі. Нікога не хвалявала, што многія з іх не скончылі нават пачатковай

школы. Так, у гэтым «універсітэце» дыпломы атрымалі пераканаиы нацыяналіст і уніят І. Кашуба, жонка заправілы АБН С. Муха-Стэцько і іншыя прайдзісветы клерыкальна-уніяцкай «эліты».

Па ініцыятыве І. Бучко ў 1947 г. паблізу г. Вальгайма (Заходняя Германія) у замку Хіршберг Ватыкан стварыў уніяцкую духоўную семінарыю. Спачатку яе рэктарам быў ваенны злачынец В. Лаба, а пасля яго ад'езду ў Канаду — А. Маліноўскі, таксама былы фашысцкі прыслужнік. Выкладчыкі семінарыі складалі раней «гонар» прафесуры былой Львоўскай духоўнай акадэміі. Верныя паслядоўнікі А. Шаптыцкага, адданыя паслугачы гітлераўскіх акупантаў, яны пазбеглі заканнага пакарання за свае злачынствы. Першымі слухачамі семінарыі былі звыш 50 «перамешчаных асоб» — самая «краса» нацыяналістаў і уніятаў. Пазней гэтая навучальная ўстанова была пераведзена ў Галандыю.

З бласлаўлення І. Бучко некалькі дзесяткаў аўнаўцаў, якія мелі больш высокую адукацыю, былі накіраваны ў рымскі Калегіум русікум. Там з іх падрыхтавалі каталіцкіх «місіянераў» для СССР.

Буржуазныя нацыяналістычныя арганізацыі пастаўлялі краінам НАТО агентаў разведкі. Іх вучылі ў спецыяльных школах амерыканскай і англійскай спецслужбаў у невялікіх гарадах Заходняй Германіі. У 1951—1952 гг. былыя саюзнікі на самалётах закінулі на Украіну каля дзесяці шпіёнскіх і дыверсійных груп. Некаторыя з іх былі абясшкоджаны органамі дзяржаўнай бяспекі СССР. Астатнія добраахвотна здаліся, зразумеўшы ўсю бессэнсоўнасць барацьбы. Уніяцкія свяшчэннікі прымалі ўдзел, прычым самы непасрэдны, у падрыхтоўцы рэзідэнтуры, бласлаўлялі яе на падрыўныя акцыі супраць СССР.

Шмат было зроблена вышэйшай іерархіяй грэка-каталіцкай царквы для таго, каб нацыяналістычныя пасобнікі гітлераўцаў атрымалі прыстанішча ў ЗША, куды па першым часе пасля заканчэння вайны іх не пускалі. Але ўжо ў 1946 г. у Злучаныя Штаты пераехалі многія здраднікі і ўцекачы. У 1947 г. пачалося масавае перасяленне ваенных злачынцаў у ЗША і Канаду, а пазней — у Аўстралію. Паступова ў краінах Заходняй Еўропы (ФРГ, Вялікабрытаніі, Францыі, Бельгіі) засталася меншая частка эмігрантаў.

За акіянам ветэраны УПА і іншыя нацыяналістычныя злачынцы пачалі ствараць свае арганізацыі, у тым ліку і маладзёжныя. Актыўны ўдзел у рабоце гэтых аб'-

яднанняў прымала уніяцкае духавенства. Яго антыкамуністычную дзейнасць высока ацаніў Ватыкан, які стварыў новыя грэка-каталіцкія епархіі ў Чыкага, Філадэльфіі, Стэмфордзе. У жніўні 1948 г. папа зацвердзіў канадскую мітраполію. Апостальская сталіца надавала вялікае значэнне ўкраінскім нацыяналістычным арганізацыям, каб з іх дапамогай прасунуць каталіцызм на Усход.

У Вашынгтоне ў маі 1952 г. на сродкі Ватыкана быў узведзены будынак украінскай каталіцкай семінарыі імя святога Іосіфа. Абышоўся ён касцёлу ў 500 тысяч долараў. Выкладчыкамі новастворанай навучальнай установы сталі махровыя нацыяналісты, а слухачамі — удзельнікі маладзёжных нацыяналістычных арганізацый.

Уніяцкія свяшчэннаслужыцелі (з ліку актыўных пасобнікаў фашыстаў) паступова захапілі кіраўніцтва ва ўкраінскіх клерыкальных арганізацыях (некаторыя з іх узніклі яшчэ да другой сусветнай вайны). Так, у Амерыцы сярод новых лідэраў гэтых аб'яднанняў вылучаўся В. Лаба, адзін з самых блізкіх паплечнікаў А. Шаптыцкага.

Многія уніяцкія свяшчэннікі, якія ў гады фашысцкай акупацыі праславіліся жорсткасцю, бандыцкімі справамі і вернай службай нацыстам, пачалі рабіць выгляд сціплых «божых служак», быццам бы нічога агульнага не меўшых з гітлерызмам. Тэрарысты ў сутанах марылі вярнуцца на Украіну, каб зноў рабаваць і знішчаць працоўны люд.

Прагрэсіўная грамадскасць ЗША, Канады непрыхільна аднеслася да прадастаўлення прытулку тысячам крывавых пасобнікаў фашызму. Абурэнне перадавых дзеячаў Злучаных Штатаў і Канады выклікалі напады гэтых пазадкаў на членаў прагрэсіўных арганізацый украінскіх эмігрантаў, бязлітаснае збіванне тых, хто выказваў жаданне вярнуцца на Радзіму, цікавіўся жыццём бацькаўшчыны.

У часы «халоднай вайны» буржуазна-нацыяналістычныя і уніяцкія дзеячы, выконваючы загады сваіх гаспадароў, прымалі актыўны ўдзел у нагнятанні антыкамуністычнай істэрыі. Яны не грэбавалі ні грубай антысавецкай хлуснёй, ні паклёпам, шантажом і запалохваннем сумленных прадстаўнікоў эміграцыі.

Цэнтрам антысавецкай дзейнасці ў Рыме заставаўся папскі Усходні інстытут і Калегіум русікум. Галоўная ўвага гэтых устаноў была звернута на ўкраінцаў-эмігрантаў, якія выехалі за мяжу да II сусветнай вайны.

У жніўні 1948 г. папа зацвердзіў канадскі экзархат уніяцкай царквы. Новыя епіскапаты ўзніклі па ўсёй Амерыцы. Экзарх украінска-каталіцкай царквы І. Бучко карыстаўся асаблівым даверам Пія XII.

Каля 1954 г. Ватыкан пачынае распрацоўваць свой новы курс у адносінах да свету сацыялізму. У калядным пасланні ад 24 снежня 1954 г. папа рымскі ўжо закранае пытанне аб мірным суіснаванні, а праз год у аналагічным пасланні Пій XII выступіў супраць атамнай бомбы і гонкі ўзбраенняў. Так змена суадносін сіл у свеце запатрабавала ад Ватыкана новай тактыкі. Праўда, Пій XII быў няздольны да змены курсу. Ён рашуча адвяргаў супрацоўніцтва з сацыялістычнымі дзяржавамі.

Змена акцэнтаў у палітыцы Ватыкана звязана з дзейнасцю папы Іаана XXIII. Але гэта не азначала, што ідэі антыкамунізму былі адкінуты. Папа запатрабаваў ад Ватыкана нармалізацыі адносін з сацыялістычнымі краінамі, адмаўлення ад агрэсіўнага дэманстратыўнага антысаветызму. Тым не менш экспансіянізм па-ранейшаму адыгрываў важную ролю ў палітыцы апостальскай сталіцы.

Пасля ліквідацыі Брэсцкай царкоўнай уніі ў СССР галоўную сваю ўвагу Ватыкан аддае захаванню, умацаванню і пашырэнню грэка-каталіцкіх епархій у краінах, дзе асела ўкраінская эміграцыя. Іаан XXIII нават склікаў спецыяльную канферэнцыю уніяцкага епіскапата ў Рыме (12 кастрычніка 1959 г.). На ёй іерархі прысягнулі зноў на вернасць папскаму прастолу. Клятва была дадзена ў час «урачыстай архірэйскай літургіі» ў галоўным каталіцкім саборы святога Пятра. Гэтым самым епіскапы паўтарылі клятву, дадзеную рымскаму папу яшчэ І. Пацеем і К. Цярлецкім. Канферэнцыя вырашыла называць уніяцкую царкву не «грэка-каталіцкай» (яе ранейшая афіцыйная назва), а «ўкраінскай каталіцкай царквой» (УКЦ).

Для абмеркавання важнейшых праблем стратэгіі і тактыкі Ватыкана ў сучасных умовах апошні падрыхтаваў Усяленскі сабор, які адкрыўся ў Рыме 11 кастрычніка 1962 г. На яго сабралася дзве з паловай тысячы каталіцкіх іерархаў са ўсяго свету, у ліку іх былі і прадстаўнікі вышэйшага духавенства УКЦ на чале з мітрапалітам Іосіфам Сліпым. На саборы дэталёва разглядаліся пытанні ўзмацнення ўплыву касцёла ў сучасных умовах на рабочых; пошукі новых сродкаў рэлігійнага ўздзеяння на веруючых; прыстасаванне дагматаў ката-

ліцызму і «свяшчэннага пісання» да вялікіх дасягненняў навукі і тэхнікі ў наш час, для «абгрунтавання» адсутнасці супярэчнасцей паміж навуковым і рэлігійным светапоглядам. На саборы мелі месца і непрыкрытыя выпады супраць СССР, УССР, грубыя паклёпы, асабліва з боку уніятаў. І. Сліпы прапанаваў стварыць кіеўска-галіцыйскі патрыярхат украінскай каталіцкай царквы. Але гэта задума не была падтрымана ўдзельнікамі сабора.

Пасля сабора І. Сліпы зноў настойваў на сваім. Пры падтрымцы бліжэйшых памагатых ён здзейсніў свае кар'ерысцкія імкненні і ў красавіку 1975 г. аб'явіў сябе Кіеўска-Галіцыйскім патрыярхам Іосіфам І. Рымская курыя і Павел VI асудзілі гэтае самавольства. Супраць ілжэпатрыярха адкрыта выступілі многія уніяцкія епіскапы і свяшчэннікі. Усё часцей і часцей пачалі крытыкаваць Іосіфа І нават у яго бліжэйшым асяроддзі. Завязалася сварка паміж прыхільнікамі І. Сліпога і яго праціўнікамі.

Прыслужнікі фашыстаў у перыяд гітлераўскай акупацыі Радзімы, здраднікі свайго народа, украінскія нацыяналісты і іерархі уніяцкай царквы разам з беларускімі і іншымі буржуазнымі нацыяналістамі хацелі б, каб людзі забылі аб іхніх крывавых справах у гады II сусветнай вайны. Асабліва жадалі нацыяналістычныя пазадкі на чужыне, каб эмігранцкая моладзь не ведала аб іх мінулым. Таму яны фальсіфікуюць гістарычныя факты, падаюць іх у скажоным выглядзе. Абанкручаныя верхаводы нацыяналістычнай і клерыкальна-уніяцкай часткі эмігрантаў, сярод якіх значную большасць складаюць ваенныя злачынцы, сёння імкнуцца пераканаць грамадскасць у тым, што ў гады вайны яны быццам бы «адстойвалі нацыянальныя інтарэсы Заходняй Украіны».

Сёння уніяцкі клір у краінах Заходняй Еўропы і Амерыкі па-ранейшаму падтрымлівае падрыўныя дзеянні заходніх дзяржаў у адносінах да Савецкага Саюза і не пакідае сваіх планаў аднавіць пры дапамозе імперыялістаў старыя парадкі на яго тэрыторыі.

Нацыяналістычныя і ўкраінскія царкоўныя арганізацыі прыхільна адносяцца да ўсіх галоўных авантур ЗША ў адносінах да краін, якія змагаюцца за сваю незалежнасць. Так, былыя памагатыя гітлераўцаў спадзяваліся, што ваенныя дзеянні ЗША ў В'етнаме перарастуць у новую сусветную вайну і яны змогуць вярнуцца на радзіму. Яны віталі контррэвалюцыйны, фашысцкі пераварот у

Чылі. Нянавісць да СССР штурхае іх на кантакты і прыслужніцтва любым рэакцыйным сілам.

Украінскія нацыяналістычна-уніяцкія заправілы салідарны з сіяністамі і адзіным фронтам выступаюць супраць міжнароднага камуністычнага руху, СССР, краін сацыялістычнай садружнасці. Удзельнікамі вядомага антысавецкага шабашу 28 лютага 1978 г. каля будынка савецкага прадстаўніцтва пры ААН у Нью-Йорку былі разам з членамі сіянісцкай арганізацыі і ўкраінскія нацыяналісты і уніяты. Яны падтрымліваюць агрэсію Ізраіля супраць арабскіх народаў, перадаюць ізраільскаму ўраду «шчырыя пажаданні поспехаў», наладжваюць асабістыя кантакты з яго дзяржаўнымі дзеячамі.

Эмігранцкае нацыяналістычнае і грэка-каталіцкае ахвосце працягвае рабіць стаўку на разгортванне новай вайны супраць СССР і іншых краін сацыялізму. Яны стаяць за нарошчванне ядзернага патэнцыялу ЗША, падтрымліваюць фальшывы тэзіс аб «савецкай ваеннай пагрозе». Чалавеканенавісніцкія ідэі зусім адкрыта прапаведуюцца ў клерыкальна-нацыяналістычным друку.

Сучасныя верхаводы нацыяналізму і УКЦ, як і раней, прытрымліваюцца псеўданавуковай тэорыі адасобленасці ўкраінцаў ад іншых славянскіх нацый, у першую чаргу, ад рускага народа. Яны дэмагагічна заяўляюць аб тым, што Украіне быў неўласцівы капіталістычны лад.

Насуперак гістарычнай праўдзе уніяты прыпісваюць сабе вялікія заслугі ў развіцці эканомікі і культуры ўкраінскага народа, сцвярджаюць, што грэка-каталіцкая царква ў Заходняй Украіне спрыяла развіццю цывілізацыі, несла народу здабыткі заходнееўрапейскай культуры. Толькі ў адным яны не хлусяць — справядліва даводзяць думку аб натуральнасці супрацоўніцтва і аднадумства паміж уніяцкай царквой і ўкраінскім нацыяналізмам.

Сапраўды, украінскі буржуазны нацыяналізм з часу свайго зараджэння і да нашых дзён цесна і непарыўна супрацоўнічае з УКЦ. Іх аб'яднала і аб'ядноўвае нянавісць да «бязбожнага бальшавізму», неўтаймаванае імкненне знішчыць яго. На гэтай аснове перапляліся іх інтарэсы, сфарміраваўся і ўмацаваўся саюз верхаводаў АУН і заправіл УКЦ. Таму заканамерна, што ў кіруючых органах шматлікіх у наш час буржуазна-нацыяналістычных арганізацый у заходніх краінах поруч з мацёрымі нацыяналістамі мы сустракаем і клерыкалаў.

Уніяцкае духавенства праводзіць для бандытаў былой УПА ўрачыстыя набажэнствы, асвячае іх сцягі і штандарты, натхняе на новыя чорныя справы. Так, для асвячэння помніка загінуўшым пятлюраўцам, бандэраўцам і эсэсаўцам з дывізіі «Галічына» ў канадскі горад Эдмантон у кастрычніку 1976 г. спецыяльна прылятаў кардынал І. Сліпы. У прамове, звернутай да ўкраінскіх эмігрантаў, ён выказаў сваю ўпэўненасць у тым, што і зараз нацыяналісты будуць верныя сваім ідэалам.

Іерархі УКЦ разам з буржуазнымі нацыяналістамі ніяк не могуць адмовіцца ад сваіх шмат разоў пацярпеўшых крах планаў адрыву Украіны ад Савецкага Саюза і распаўсюджвання каталіцкай і уніяцкай веры на тэрыторыі нашай краіны. Яны мараць здзейсніць свае задумы пасля разгрому СССР у новай вайне. У тым, што гэта магчыма, «святыя айцы» нават не сумняваюцца. Яны адкрыта знаходзяцца ў адной кампаніі з падпальшчыкамі трэцяй сусветнай вайны.

Усе сродкі масавай інфармацыі імперыялістычных краін — друк, радыё, тэлебачанне — шмат гадоў распаўсюджваюць міфы аб уяўным парушэнні Савецкай дзяржавай правоў сваіх грамадзян — праследаванні веруючых за рэлігійныя перакананні, ганенні на духавенства, забароне дзейнасці рэлігійных арганізацый. У гэтым напрамку актыўна працуе і уніяцкае духавенства. Іх мэта — ачарніць сацыялізм, стварыць скажонае ўяўленне аб нашай Радзіме. Натуральна, што такія патугі не спрыяюць разрадцы міжнароднай напружанасці.

Напрыклад, прафесар Чыкагскага універсітэта В. Маркус у сваім артыкуле «Прыгнечаная царква: украінскія католікі ў Савецкім Саюзе» аб'явіў усіх украінцаў, якія жывуць у СССР, уніятамі, хоць на самай справе прыхільнікаў гэтай рэлігіі ў нас практычна няма. Ліквідацыю уніі ў СССР В. Маркус расцэньвае як палітыку русіфікацыі, якую Савецкі ўрад быццам бы праводзіць на Украіне і тым самым парушае правы чалавека.

Каб пераканаць масы ў сваіх выдумках, буржуазныя прапагандысты спасылаюцца на хлуслівыя заявы дысідэнтаў і турыстаў, якія варожа адносяцца да СССР. Пры гэтым поўнасцю ігнаруюцца сведкі сумленных людзей, у тым ліку прадстаўнікоў духавенства.

Падрыўная дзейнасць не абмяжоўваецца сродкамі масавай інфармацыі. Палітыканы ад рэлігіі спрабуюць выкарыстоўваць у барацьбе з СССР шпіянаж, ідэалагічныя дыверсіі, правакацыі. Так, у чэрвені 1976 г. заўзя-

тая прыспешніца І. Сліпога «турыстка» Сцепаніда Саламчак спрабавала (праўда, няўдала) патаемна правезці з Вялікабрытаніі на Украіну нацыяналістычную макулатуру і антысавецкія опусы І. Сліпога.

Правалілася і шпіёнскае падарожжа на Украіну другога падданага Вялікабрытаніі — дваццацідвухгадовага бандэраўскага эмісара Андрэя Клімчука (студзень 1978 г.). З дзіцячых гадоў убівалі яму ў галаву родны бацька, былы ваяка дывізіі СС «Галічына», уніяцкае духавенства і нацыяналісты з «Саюза ўкраінскай моладзі» нянавісць да СССР. Паездка А. Клімчука была арганізавана на сродкі бандэраўцаў, яны ж далі яму вялікую суму грошай для фінансавання варожай работы на Украіне. Была ў А. Клімчука і брудная фальшыўка, зробленая ў Англіі аунаўцамі. Называлася яна «Зварот падпольнай Украіны да ўрадаў краін Захаду і сусветнай грамадскасці на абарону нацыянальна-дзяржаўнай незалежнасці заняволеных у СССР народаў і асноўных правоў і свабод чалавека». Задачай эмісара было — сабраць на тэрыторыі СССР пад гэтай фальшыўкай хоць некалькі подпісаў і вярнуць яе сваім гаспадарам. Ну а дзеячы АУН выдалі б «зварот» за пасланне нацыяналістычнага падполля, якое ў сапраўднасці не існуе. Гэту задуму ідэалагічных дыверсантаў сарвалі савецкія органы бяспекі. А. Клімчук быў выдвараны за межы СССР.

Завадатары з АУН, выпешчаныя уніяцкай царквой, ні на хвіліну не пакідаюць падрыўную дзейнасць. Яны настойліва змагаюцца супраць свайго народа, упарта намагаюцца стварыць на Украіне антысавецкае падполле. Аб гэтым сведчаць шматлікія факты. Спынімся на апошнім, які ўжо стаў вядомы грамадскасці.

У жніўні 1983 г. у невялікім польскім горадзе Бытоме на канспіратыўнай кватэры была затрымана «турыстка» з Парыжа Ірына Зялене. Разлік антыкамуністаў быў просты: выкарыстоўваючы складаную сітуацыю ў ПНР, ажывіць падрыўную дзейнасць супраць гэтай краіны, стварыць плацдарм для пранікнення ў СССР. І. Зялене везла з сабою дзесяткі мікраплёнак, інструкцыі, некалькі тысяч долараў. У матэрыялах, якія былі ў функцыянеркі АУН, змяшчаліся заклікі да ажыццяўлення тэрарыстычных і дыверсійных актаў, планы падрыўных акцый супраць СССР і краін сацыялізму, паведамленне аб дамоўленасці з цяперашняй адміністрацыяй ЗША, якая абяцала падтрымаць усе дзеянні аунаўцаў.

На многіх дакументах стаіць подпіс Я. Стэцько. Бы-

лы гітлераўскі паслугач цяпер жыве ў ФРГ і на ўсю моц працуе на новых гаспадароў. Ён у захапленні ад кіраўнікоў ЗША, заклікае Р. Рэйгана разарваць усялякія сувязі з СССР. Дарэчы і прэзідэнту прыйшоўся да спадобы ваенны злачынец. Маючы на ўвазе Я. Стэцько, гаспадар Белага дома сказаў: «Ваша барацьба — гэта наша барацьба. Ваша мара — гэта наша мара... Вы з'яўляецеся сумленнем свабоднага свету»[2]. Стары аунавец намагаецца з дапамогай ЦРУ пераканаць эмігрантаў, што цяпер трэба: «...знішчаць камуністычную сістэму знутры»[3]. Я. Стэцько з лёгкім сэрцам ахвяруе сваёй радзімай (якую на словах любіць) дзеля дасягнення сваіх мэт і згодны, каб «...дзве трэці ўкраінскай тэрыторыі былі знішчаны атамнай вайной і толькі на адной трэці ўзнікла ўкраінская нацыянальная дзяржава»[4]. Таму былыя гітлераўскія паслугачы і іх аднадумцы лічаць, што трэба ствараць і пашыраць усялякія канфліктныя сітуацыі ў любым раёне свету.

Візіт замежнай «турысткі» таму не быў выпадковым. Яму папярэднічалі многія падзеі. Некалькі гадоў таму назад буржуазныя нацыяналісты, як ім здавалася, завербавалі жыхара Івана-Франкоўска, выкладчыка мед-інстытута М. Кухцяка. Першы эмісар з'явіўся да яго яшчэ ў 1979 г. У гэты час М. Кухцяк быў ужо прызначаны прадстаўніком АУН на Украіне. Якіх толькі заданняў ён не атрымліваў! І дыскрэдытацыя Алімпіяды-80, збор матэрыялаў аб эканамічным і абаронным патэнцыяле СССР, Савецкай Арміі, падрыхтоўка да партызанскай барацьбы ў адпаведны час. Была прапанова да яго зрабіць фальшывую заяву ад імя «краявога провада», прычым так, каб стала вядома замежным журналістам. Але дзякуючы савецкаму патрыёту доўгі час уся гэтая валтузня праходзіла марна.

Уніяцка-бандэраўскія верхаводы баяцца праўды, баяцца сустрэч з савецкімі людзьмі. Нядзіўна, што яны ставяць сваёй мэтай зрываць выступленні за мяжой савецкіх дзеячаў мастацтва, творчых калектываў, заклікаюць да гэтага сваіх аднадумцаў. Калі за акіянам гастраліравалі выдатныя ўкраінскія спевакі Дзмітрый Гнацюк і Яўгенія Мірашнічэнка, уніяцкая газета «Амерыка» аб'явіла ім байкот, а бандэраўскія малойчыкі імкнуліся сарваць канцэрты. І ўсё ж артыстаў слухалі і былі ім шчыра ўдзячны тысячы ўкраінскіх эмігрантаў.

Вялікай памылкай будзе лічыць эміграцыю нейкай аднароднай сілай, думаць, што ўся яна варожа настрое-

на супраць нашай краіны. Сучасны ўкраінскі пісьменнік Віталій Кароціч, які наведаў у 1978 г. і 1979 г. Канаду, сцвярджае, што нацыяналісты разгарнулі там выключна шырокую антысавецкую прапаганду сярод эмігрантаў. Яны папаўняюць украінскія бібліятэкі антысавецкай літаратурай, а таксама выданнямі, якія праслаўляюць дзейнасць нацыяналістаў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Так, В. Кароціч пісаў: «...я зноў наведаў бібліятэку, пайшоў ва ўкраінскі аддзел. Чаго там толькі не было! Успаміны эсэсаўцаў з дывізіі «Галічына», дэкларацыі ўсіх антысавецкіх арганізацый на свеце (калі ўжо не ўсіх, то, прынамсі, самых «калматых», заалагічных). Ляжала газета «Канадський фермер»: пераступіўшы за тры чвэрці стагоддзя свайго ўзросту, яна ведала многіх гаспадароў. Яе сімпатыя да нацызму, якая намеціласа ў яе гаспадароў у трыццатыя гады, аказалася невынішчальнай»[5].

Палітычная неаднастайнасць украінскай эміграцыі кідаецца ў вочы не толькі ў Канадзе, пра што пераканаўча гаворыць у сваім артыкуле пісьменнік, але і ва ўсіх іншых капіталістычных краінах. Побач з сумленнымі, прагрэсіўна настроенымі людзьмі сустракаюцца асобы, якія зганьбавалі сябе службай гітлераўскаму фашызму або цяпер шчырай працай на карысць самай крайняй рэакцыі. В. Кароціч аб такіх здраднікаў свайго народа гаворыць, што яны «запісваліся добраахвотнікамі ў амерыканскае воінства ў Карэі і В'етнаме. Зараз пасылаюць дэлегацыі да афганскіх басмачоў і пагражаюць прыступіць да тэрарыстычных акцый супраць савецкіх людзей. Гэта падобна на расстаноўку сіл на свеце — ад украінца да украінца бывае такая ж адлегласць, як ад рускага ўласаўца да рускага ж абаронцы Сталінграда»[6].

Нягледзячы на свае шумныя «справы», у наш час уніяцкае духавенства не ўяўляе ўжо той сур'ёзнай, рэальнай сілы, якою было ў гады I і II сусветных войнаў. Яно не карыстаецца былой безагаворачнай падтрымкай эмігрантаў. Сённяшняя уніяцкая царква перажывае глыбокі крызіс. Ён найбольш выразна праяўляецца ў адыходзе ад веры парафіян і нават духавенства, змяншэнні колькасці навучэнцаў у семінарыях, акадэміях, манахаў у манастырах. Моцны ўплыў на гэты працэс аказвае ўдзел украінцаў, якія жывуць за мяжой, у барацьбе за мір, агульны рост іх палітычнай свядомасці, а таксама крытычныя адносіны да духавенства. УКЦ знаходзіцца ў стане загнівання і дэмаралізацыі.

Яркім сведчаннем гэтага з'яўляецца, напрыклад, той факт, што паломніцтвы ў «святыя месцы» Італіі, Францыі, Партугаліі, іншых краін парафіяне робяць не столькі з прычыны глыбокай рэлігійнасці, колькі з-за жадання пазнаёміцца з гісторыяй і жыццём іншых народаў, а то і проста з мэтай пабавіць час. Уніяцкія архіпастыры хутка зразумелі, што «паломнікаў» з ЗША, Канады, Бразіліі, Аўстраліі, напрыклад, у Рыме цікавяць помнікі архітэктуры і жывапісу, а часам і начны горад з яго спакусамі. Многія з іх (у тым ліку і свяшчэннікі) катэгарычна адмаўляюцца наведваць сучасны цэнтр уніяцкай царквы, сабор святой Сафіі і ахвяраваць грошы на патрэбы кліра. Першаіерархі абрушваюцца на «суайчыннікаў» у прэсе і ў казаннях з раздражнёнай лаянкай. Але гэта не дапамагае — паствы становіцца ўсё менш і менш. Пусцее царкоўная каса, драбнеюць падачкі нацыяналістам і духавенству. Нягледзячы на тое, што заходнія спецслужбы адпускаюць нацыяналістычным і уніяцкім дзеячам даволі вялікія сродкі, тыя ўжо незадаволены. Апетыты «святых айцоў» увесь час растуць. Таму яны ўсё часцей і часцей звяртаюцца да «суайчыннікаў» з просьбамі ахвяраванняў. На розныя мэты нацыяналісты і клірыкі вывужваюць у эмігрантаў працоўныя грошы. Нярэдка такія паборы бываюць прымусовымі і робяцца ў абстаноўцы бессаромнай спекуляцыі на нацыянальных і рэлігійных пачуццях украінцаў. Іх стараюцца пераканаць, што гэта неабходна для падтрымкі вызваленчай справы. У сапраўднасці грошы ідуць на задавальненне ўвесь час узрастаючых асабістых патрэб дзеячаў нацыяналізму і «падзвіжнікаў» веры.

Верхаводы уніяцкага кліру і нацыяналізму прывыклі да бязбеднага жыцця. Таму яны так балюча ставяцца да значнага скарачэння даходаў, што выклікана няспынным змяншэннем колькасці веруючых. У сваім друку завадатары УКЦ папракаюць паству ў абыякавых адносінах да царквы, несвядомасці, якая выяўляецца ў нежаданні ахвяраваць грошы на яе ўтрыманне.

Аб глыбокім крызісе УКЦ красамоўна сведчыць масавы адыход ад яе ўкраінскай моладзі. Юнакі і дзяўчаты пераходзяць у лагер актыўных барацьбітоў за мір і дэмакратыю. Уніяцкія іерархі прапануюць немагчымае — адгарадзіць новыя пакаленні ад знешняга свету, прымусіць бацькоў сачыць, каб дзеці і падлеткі рэгулярна наведвалі царкву, спавядаліся, маліліся. Акрамя таго свяшчэннікі вядуць барацьбу супраць змешаных

шлюбаў. А ў сваіх выданнях (напрыклад, у катэхізісе [7]) адкрыта праводзяць антыкамуністычную прапаганду, каб падрыхтаваць моладзь да вайны за «вызваленне радзімы бацькоў і дзядоў».

Асаблівую ролю ў выхаванні сваёй змены нацыяналісты і уніяты надаюць шматлікім спецыялізаваным арганізацыям. Тыповая сярод іх — «Саюз украінскай моладзі» (СУМ). Галоўная задача яго — выхаванне юнакоў і дзяўчат у духу нянавісці да СССР, каб яны былі гатовы са зброяй у руках адстойваць ідэалы (і маёмасць таксама) буржуазіі. Нацыяналісты ствараюць у краінах капіталу спецыяльныя маладзёжныя лагеры. У іх юнакі займаюцца страявой падрыхтоўкай, вучацца валодаць стралковай зброяй, арыентаванню на мясцовасці, авалодваюць радыё- і дыверсійнай справай. Інструктарамі ў іх працуюць вопытныя майстры сваёй ганебнай справы — былыя бандэраўцы і аунаўцы, ветэраны вайны ў Карэі і В'етнаме. Так рыхтуецца змена састарэлым нацыяналістам для службы замежным разведкам.

Але эмігранцкая ўкраінская моладзь не жадае мець нешта агульнае ні з уніяцкім духавенствам, ні з буржуазнымі нацыяналістамі. Няма ахвотнікаў навучацца ў каталіцкіх універсітэтах, семінарыях. Вядома, напрыклад, што ва ўкраінскім каталіцкім універсітэце імя святога Клімента працуе добры дзесятак выхавацеляў, разы са тры больш — прафесароў, а навучаецца менш чым паўсотні студэнтаў. Катастрафічныя недаборы і ў духоўныя семінарыі. Чыкагскі епіскап Яраслаў Габро непакоіцца, што ў яго епархіі «пустуе» некалькі прыходаў і ў іх няма нават свяшчэннікаў. У васіліянскім манастыры святога Іасафата ў Атаве, дзе магло б свабодна размясціцца некалькі дзесяткаў манахаў, жывуць толькі некалькі чалавек.

Для ўзняцця прэстыжу УКЦ яе іерархі, многія з якіх — былыя памагатыя «вялікага мітрапаліта», паставілі перад Рымам пытанне аб беатыфікацыі [8] і наступнай кананізацыі А. Шаптыцкага за яго заслугі перад уніяцкай царквой.

Яны ўсяляк абяляюць А. Шаптыцкага, прыхарошваюць яго дзейнасць, імкнуцца прадставіць мітрапаліта чалавекам «вялікага духу», як «сапраўднага хрысціяніна» і фанатычнага «слугу божага», які рэўнасна адносіўся да спраў уніяцкай царквы, шчыра любіў украінскі народ, змагаўся за росквіт Украіны, «самасційнай і незалежнай ад Савецкага Саюза». Пры гэтым старанна

замоўчваюцца неабвержныя факты шчырай службы першаіерарха фашызму, якую ён нёс разам са сваімі аднадумцамі — нацыяналістамі, яго барацьба за інтарэсы памешчыкаў і капіталістаў.

Беларускія буржуазныя нацыяналісты, што пасля II сусветнай вайны атрымалі прытулак у капіталістычных краінах, мала чым адрозніваюцца ад сваіх украінскіх «калег». Здраднікі Радзімы, яны да сённяшняга дня мараць аб новай вайне, разгроме ў ёй СССР, адрыве ад яго Беларусі і ператварэнні яе ў буржуазную дзяржаву. Так разважаюць самыя лютыя ворагі беларускага народа М. Абрамчык, Ф. Кушаль, П. Урбан, А. Адамовіч, З. Тумаш, А. Надсон, Э. Ясюк і іншыя прайдзісветы. Аб гэтым марылі іх састарэлыя паплечнікі, якіх напаткала бясслаўная смерць на чужыне.

Уніяцкая царква і яе клір з'яўляюцца класічным узорам спалучэння клерыкалізму і нацыяналізму. Жудасныя вынікі гэтага «саюзу» добра вядомы. Сучасныя беларускія нацыяналісты не маюць непасрэдных адносін да уніяцтва, бо найчасцей лічаць сябе людзьмі «каталіцкага паходжання». Вось тут дарогі «сяброў» украінскага і беларускага народа як не трэба лепш сыходзяцца: і адны і другія — прыслужнікі Ватыкана ў яго намаганнях пад выглядам рэлігіі працягнуць у Савецкі Саюз і дзяржавы сацыялістычнай садружнасці палітычную кантрабанду. Акрамя таго яны вядуць шалёную антысавецкую і антыкамуністычную прапаганду праз радыёстанцыю «Радыё Ватыкана» на рускай, украінскай і беларускай мовах, а таксама ў сваіх газетах і часопісах. Адным з такіх выданняў з'яўляецца часопіс «Божым шляхам», які выходзіць у Лондане на беларускай мове.

Свае чорныя справы нацыяналісты ў саюзе са «святымі айцамі» робяць, як яны заяўляюць, каб несці на Радзіму «слова праўды, навукі, хрысціянства і неабходныя звесткі з жыцця рэлігійнага, беларускага і міжнароднага»[9]. Адзін з такіх дзеячаў — Леў Гарошка, езуіт і уніят, які паспявае супрацоўнічаць і на «Радыё Ватыкана» і ў названым часопісе. Гэта вопытны антысаветчык, вядомы сваёй антынароднай дзейнасцю яшчэ з гадоў Вялікай Айчыннай вайны. У той час ён працаваў у баранавіцкай акупацыйнай газетцы, праклінаючы народных мсціўцаў і на ўсе лады ўсхваляючы фашысцкія парадкі. Такія «літаратурныя» практыкаванні савецкія людзі расцэньваюць як злачынства. Каб пазбегнуць пакарання,

Л. Гарошка падаўся на Захад і з таго часу актыўна займаецца падрыўной дзейнасцю.

І ўкраінскія, і беларускія буржуазныя нацыяналісты «праславіліся» сваёй вернай службай гітлераўскім захопнікам. Адным з найбольш заклятых ворагаў свайго народа быў «прэзідэнт» беларускага марыянетачнага «ўраду» ваенны злачынец «спадар» Р. Астроўскі. У крыві рукі такіх фашысцкіх памагатых, як М. Абрамчык (начальнік паліцыі), Ф. Кушаль, які пасля вайны за мяжой атрымаў чын генерала і пасаду вайсковага міністра «беларускага ўраду» (на яго сумленні смерць 40 тысяч савецкіх грамадзян), Э. Ясюк (толькі за адзін дзень у Клецку пад яго кіраўніцтвам было знішчана 5 тысяч чалавек), бургамістр Мінска В. Тумаш (павінен у смерці 45 тысяч савецкіх грамадзян), і іншых забойцаў і катаў. Адзін з іх — А. Адамовіч, быў прыняты разведкай ЗША для работы на радыёстанцыях «Свабода» і «Свабодная Еўропа».

Усе гэтыя здраднікі і каты беларускага народа лічылі сябе католікамі (бадай, акрамя Р. Астроўскага, які быў праваслаўным) і таму, як і тыя ж самыя уніяты, зацікаўлены ў пашырэнні каталіцкай веры.

Усе сферы жыцця ў СССР нацыяналістычныя і клерыкальныя ватыканскія каментатары, як гэта практыкуецца на Захадзе, падаюць у сваіх радыёперадачах у скажоным выглядзе. Асаблівую нянавісць іх усіх выклікае вырашэнне ў СССР нацыянальнага пытання, ператварэнне інтэрнацыяналізму ў глыбокія і непахісныя перакананні савецкіх людзей, у норму іх паводзін. Дружба паміж народамі нашай краіны і дзяржавамі сацыялістычнай садружнасці моцна непакоіць нашых ворагаў. Іх галоўная мэта — унесці раскол у непахіснае адзінства народаў СССР і краін сацыялістычнай садружнасці з тым, каб па адной адрываць іх ад гэтага саюза. Тут зыходзяцца мэты не толькі клерыкальных і нацыяналістычных колаў імперыялістычных дзяржаў, але і іх разведвальных органаў.

Усе гэтыя цемрашалы і рэакцыянеры не здымаюць са свайго ўзбраення лжывы тэзіс аб праследаванні рэлігіі ў СССР. Вядома, што Іаан Павел II адносіцца да уніятаў куды больш прыхільна і ўважліва ў параўнанні са сваімі нядаўнімі папярэднікамі. Папа згадзіўся з прысваеннем І. Сліпому тытула патрыярха. Іаан Павел II неаднаразова цёпла прымаў І. Сліпога і яго бліжэйшых памагатых у сваёй рэзідэнцыі, звяртаўся да яго з па-

сланнямі. У адным з іх папа пісаў аб вялікіх пакутах і выпрабаваннях, якія быццам бы перажывае уніяцкая царква, аб тым, што ў СССР яна не карыстаецца рэлігійнай свабодай і «загнана ў глыбокае падполле». Тое, што царква гэтая не існуе ў СССР з 1946 г., пантыфік не прызнае. У ватыканскіх і уніяцкіх колах па сённяшні дзень упарта прытрымліваюцца версіі, што пастанова Львоўскага сабора 1946 г. аб самаліквідацыі Брэсцкай царкоўнай уніі з'яўляецца быццам бы незаконнай. Неўзабаве пасля свайго ўступлення на пост Іаан Павел II пацвердзіў сваю поўную прыхільнасць да уніяцтва і яго галавы І. Сліпога, хоць добра ведаў аб яго злачынным мінулым, ухваліў і падтрымаў яго прэтэнзіі выступаць у ролі уніяцкага патрыярха Украіны. Зроблена гэта было з тым, каб пашырыць на Украіне ўплыў каталіцкай царквы, ажывіць падрыўную дзейнасць. Папа згодны з хлуслівымі сцвярджэннямі ўкраінскіх і беларускіх нацыяналістаў аб тым, што грэка-каталіцкая царква ў гісторыі Украіны і Беларусі адыграла дабратворную ролю — далучыла іх народы да культуры Заходняй Еўропы. На самай жа справе унія не прынесла ім нічога, апрача найцяжэйшых пакут, маральных і фізічных. Яе роля ў гісторыі Украіны і Беларусі — самая злавесная і ганебная. Калі ж восенню 1984 г. І. Сліпы памёр, то Іаан Павел II абвясціў жалобу і назваў нябожчыка «пакутнікам веры».

Але ўсе спробы Ватыкана, дзеячаў УКЦ адрадзіць былую моц царквы або хаця б прыпыніць працэс яе разлажэння — дарэмныя. У наш час уніяцкая царква і яе прыхільнікі — буржуазныя нацыяналісты — выродзіліся ў кучку наймітаў заходніх спецслужбаў, ад якіх адварочваецца працоўная эміграцыя.

ЗАКЛЮЧЭННЕ

Барацьба рэакцыянераў усіх адценняў супраць СССР і ўсяго лагера сацыялізму не паслабляецца. У ёй адзіным фронтам выступаюць усе антысавецкія сілы. Па-ранейшаму адкрытымі і непрымірымымі ворагамі прагрэсу застаюцца верхаводы уніяцкай царквы, якая яшчэ дзейнічае ў заходніх краінах. У актыве УКЦ мы знаходзім састарэлых ужо «дзеячаў» украінскага буржуазнага нацыяналізму, зганьбаваных сваёй службай гітлераўскаму фашызму ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Парафіянамі уніяцкай царквы ў краінах Еўропы, Амерыкі, у Аўстраліі ў асноўным з'яўляюцца ўкраінцы. Яны маюць неаднолькавае грамадскае становішча і ідэалагічныя перакананні. Справа ў тым, што эмігравалі за мяжу ўкраінцы па розных прычынах і ў розныя гады. Большасць іх — гэта сумленныя працаўнікі, у першую чаргу, рабочыя і сяляне, бацькі і дзяды якіх яшчэ ў дакастрычніцкі час ці пры панскай Польшчы былі вымушаны пакінуць сваю бацькаўшчыну ў пошуках лепшай долі. Але сярод украінскіх эмігрантаў нямала і антысаветчыкаў. Яны ўцяклі з радзімы ў 1944—1945 гг. разам з нямецка-фашысцкімі акупантамі, каб пазбегнуць адказнасці за крывавую дзейнасць, накіраваную супраць свайго народа. Гэтыя асобы нічога агульнага не маюць з тымі, хто паехаў з Украіны ў пошуках кавалка хлеба.

Свядомая частка ўкраінскай эміграцыі — рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя — правільна разумее, што ліквідацыя уніі на Украіне выклікана гістарычнай неабходнасцю. Прагрэсіўна настроеная моладзь усё больш і больш вызваляецца ад путаў УКЦ і наогул адыходзіць ад рэлігіі. Гэта моцна непакоіць клерыкалаў, украінскіх нацыяналістаў, дзеячаў Ватыкана.

Сёння уніяцкае духавенства падтрымлівае меншасць украінскай эміграцыі — у асноўным былыя паслугачы фашыстаў і іх аднадумцы. Большая ж частка ўкраінцаў, што жывуць у многіх краінах свету, рашуча адмяжоўваецца ад антысавецкага нацыяналістычнага балота.

Сумленныя прадстаўнікі ўкраінскай эміграцыі шчыра любяць Савецкую Украіну, маюць з ёй цесныя сувязі, радуюцца яе вялікім дасягненням у эканоміцы і культуры, наведваюць радзіму сваіх бацькоў і дзядоў.

Справы УКЦ красамоўна сведчаць аб тым, што яна па-ранейшаму існуе і дзейнічае ў цеснай сувязі з рэшткамі ўкраінскіх нацыяналістаў. Ужо толькі гэта дае падставу зрабіць вывад, што поўны крах яе непазбежны. Трэба памятаць — уніяцкая царква ніколі не з'яўлялася самастойнай палітычнай сілай. Яе дзеячы былі, па-сутнасці, платнымі агентамі ўрадаў і спецслужбаў замежных дзяржаў.

Яшчэ і сёння ў заходніх абласцях Украіны жыве мізэрная колькасць савецкіх грамадзян, якія так і не здолелі зразумець усяго значэння скасавання Брэсцкай царкоўнай уніі ў нашай краіне. Сярод іх маюцца нават такія, што мараць аб яе аднаўленні. З імі салідарызуюцца рэакцыйныя сілы на Захадзе. Яны імкнуцца наладжваць сувязь з гэтымі асобамі, каб мець пэўныя зачэпкі для антысавецкай работы на тэрыторыі СССР.

Страціўшы пачуццё рэальнасці, ваяўнічае уніяцкае духавенства ўсё яшчэ спадзяецца дачакацца дня, калі Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік будзе разгромлены імперыялістычнымі дзяржавамі і яно разам з нацыяналістамі вернецца на Украіну для арганізацыі «самасційнай украінскай дзяржавы». Па-ранейшаму вышэйшыя іерархі УКЦ мараць распаўсюдзіць на Украіне, а потым на ўсёй нашай Радзіме каталіцызм. Поўная нікчэмнасць гэтых спадзяванняў з кожным годам робіцца ўсё больш і больш яўнай.

ЗАЎВАГІ

УСТУП

[1] Унія — *лат.* яднанне, саюз.

ШТО ПРЫВЯЛО ДА ЦАРКОЎНАЙ УНІІ

[1] Ігумен — манашаскі сан; настаяцель ці памочнік настаяцеля праваслаўнага манастыра.
[2] Епіскапія — г. зн. епархія — царкоўна-адміністрацыйная адзінка ў хрысціянскай царкве.
[3] Гакоўніца — старажытная агнястрэльная зброя.
[4] *Соловьев С. П.* История России с древнейших времен. М., 1961, т. 4, с. 381.
[5] *Ленин В. И.* Полн. собр. соч., т. 13, с. 302—303.
[6] Архімандрыт — найвышэйшае духоўнае званне ў манахаў праваслаўнай царквы; ганаровы тытул настаяцеля буйных мужчынскіх манастыроў.

ПАДРЫХТОЎКА І ПРАВЯДЗЕННЕ БРЭСЦКАГА САБОРА

[1] Капелан — вайсковы свяшчэннік, які праводзіць набажэнствы, сочыць за палітычным і духоўным станам ваеннаслужачых.
[2] Універсал — урачыстая грамата польскіх каралёў, змест якой даводзіўся да ўсеагульнага ведама.
[3] Була — найбольш важныя акты (звароты, пастановы, распараджэнні) папы рымскага.
[4] Пантыфік — папа рымскі.
[5] Анафема — у хрысціянстве царкоўны праклён, адлучэнне ад царквы; лічыцца найвышэйшай карай.

РАСПАЎСЮДЖВАННЕ НОВАГА АБРАДУ

[1] Хрыстафор Філалет — псеўданім Марціна Бранеўскага, аднаго з найвіднейшых праваслаўных багасловаў, выдатнага палеміста.
[2] Каронны гетман — галоўнакамандуючы войскамі Рэчы Паспалітай.
[3] Васіліяне — члены каталіцкага манашаскага ордэна, які быў створаны ў 361 г. З 1617 г. стаў уніяцкім; вёў актыўную барацьбу за акаталічванне ўкраінцаў і беларусаў.
[4] Літоўскі канцлер — старшыня ўрада Вялікага княства Літоўскага.
[5] *Соловьев С. М.* История России с древнейших времен, с. 437.
[6] Нунцый — пастаянны дыпламатычны прадстаўнік (пасол) Ватыкана.
[7] Дысідэнты — асобы, якія прытрымліваюцца іншых поглядаў, чым таго патрабуе пануючая царква. У гэтым сэнсе тэрмін асабліва шырока ўжываўся ў XVI—XVII стст.
[8] Рэскрыпт — ліст цара па таму ці іншаму пытанню, апублікаваны да ўсеагульнага ведама.

[9] Кансісторыя — орган царкоўнага кіраўніцтва пры епархіяльным архірэі (епіскапе). Вяла ўсе справы епархіі.
[10] Пратаіерэй — пратапрэсвітэр, пратапоп—старэйшы праваслаўны свяшчэннік, настаяцель саборнай царквы. Гэтае званне прысвойваецца свяшчэннікам за асабістыя заслугі перад царквой.
[11] Вікарый — намеснік духоўнай асобы.

УНІЯЦКАЯ ЦАРКВА ЗАХОДНЯЙ УКРАІНЫ

[1] Курыя — царкоўны ўрад у Ватыкане, які складаецца з розных кангрэгацый (дэпартаментаў, міністэрстваў).
[2] Ленинский сборник. М., 1973, т. 30, с. 14—15.
[3] *Ленин В. И.* Полн. собр. соч., т. 24, с. 120.
[4] *Там жа,* с. 120—121.
[5] Дамініканцы — члены каталіцкага жабрацкага ордэна, заснаванага ў 1215 г.; праяўлялі асаблівую жорсткасць і бескампраміснасць у абароне каталіцызму.
[6] *Галан Я.* З крыжам ці з нажом. Мн., 1954, с. 22.
[7] *Там жа,* с. 23.
[8] *Дзержинский Ф. Э.* Избр. соч. М., 1957, т. 1, с. 229.
[9] Брэвэ — кароткае пасланне папы рымскага па пытаннях другараднага значэння.
[10] *Дмитрук К. Е.* С крестом и трезубцем. М., 1979, с. 8.
[11] Энцыкліка — пасланне папы рымскага па найбольш важных грамадска-палітычных, рэлігійных ці маральных пытаннях.
[12] Прымас — у каталікаў тытул кіраўніка царквы той ці іншай краіны.
[13] «Нахтыгаль» — *ням.* салавей; такую назву батальён атрымаў таму, што меў добры хор.
[14] Канкардат — пагадненне паміж Ватыканам і ўрадам той ці іншай дзяржавы аб становішчы каталіцкай царквы ў краіне.
[15] Дэканат — група прыходаў, за дзейнасцю якіх назірае старэйшы свяшчэннік — дэкан.
[16] Іераманах — манах, які мае права самастойна весці набажэнства.
[17] *Дмитрук К.* Свастика на сутанах. Київ, 1973, с. 22—23.
[18] Суфраган — каталіцкі свяшчэннік, які займаецца гаспадарчымі справамі ў епархіі.
[19] Візітатар — часовы дыпламатычны прадстаўнік Ватыкана.
[20] Розплата. Документи і матеріали судового процесу над групою бандерівців. Львів, 1970, с. 119—120.
[21] Документы обличают. Реакционная роль религии и церкви на территории Белоруссии. Мн., 1964, с. 7.
[22] *Там жа.*
[23] *Там жа,* с. 72.
[24] *Там жа,* с. 46.

УНІЯЦКАЯ ЦАРКВА Ў ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ. СКАСАВАННЕ УНІІ Ў СССР

[1] Каад'ютар — духоўная асоба, якая прызначаецца папай рымскім у дапамогу епіскапу, калі той не ў стане выконваць свае абавязкі; валодае ўсёй паўнатой улады.
[2] *Дмитрук К. Е.* С крестом и трезубцем, с. 21.
[3] *Там жа.*

[4] Эксцэленцыя — шаноўная форма звароту да высокай духоўнай асобы.
[5] *Даниленко С. Т.* Униаты. М., 1972, с. 125.
[6] Звязда, 1984, 10 кастр.
[7] Провад — кіруючы орган АУН.
[8] *Дмитрук К. Е.* С крестом и трезубцем, с. 56.
[9] *Даниленко С. Т.* Униаты, с. 148—149.
[10] Капітул — савет пры епіскапе.
[11] *Шейман М. М.* Предисловие.— В кн.: Винтер Э. Политика Ватикана в отношении СССР, 1917—1968. М., 1977, с. 27.
[12] Вільна Украіна, 1945, 6 ліп.
[13] Правда, 1951, 10 мая.

ВЫВАДЫ ТАК І НЕ ЗРОБЛЕНЫ

[1] Легат — упаўнаважаны папы рымскага.
[2] Известия, 1983, 23 нояб.
[3] *Там жа.*
[4] *Там жа.*
[5] *Коротич В.* Голос Канады.— Лит. газ., 1980, 18 июня.
[6] *Там жа.*
[7] Катэхізіс — кароткі пераказ хрысціянскага веравучэння, звычайна ў форме пытанняў і адказаў.
[8] Беатыфікацыя — акт прылічэння папай рымскім той ці іншай асобы да ліку блажэнных; пэўны этап падрыхтоўкі кананізацыі, г. зн. залічэння ў лік святых.
[9] Сел. газ., 1984, 12 окт.

ЗМЕСТ

Уступ 3

Што прывяло да царкоўнай уніі 4

Падрыхтоўка і правядзенне Брэсцкага сабора . 12

Распаўсюджванне новага абраду 18

Уніяцкая царква Заходняй Украіны 32

Уніяцкая царква ў гады другой сусветнай вайны.
Скасаванне уніі ў СССР 57

Вывады так і не зроблены 74

Заключэнне 92

Заўвагі 94

Василий Федорович Гапанович
Леонид Антонович Царенков
ВЧЕРАШНИЙ И СЕГОДНЯШНИЙ ДЕНЬ УНИАТСКОЙ ЦЕРКВИ

Минск, издательство «Беларусь»
На белорусском языке

Загадчык рэдакцыі А. У. Сапун. Рэдактар А. А. Зарыцкі. Мастак У. А. Маеў. Мастацкі рэдактар В. А. Губараў. Тэхнічны рэдактар В. У. Харэўскі. Карэктары Н. Н. Масарэнка, Г. І. Славінская.

ІБ № 2188

Здадзена ў набор 10.01.85. Падп. да друку 29.04.85. АТ 07543. Фармат 84×108¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура літаратурная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 5,04. Ум. фарб.-адб. 5,35. Ул.-выд. арк. 5,53. Тыраж 4800 экз. Зак. 28. Цана 25 к.

Ордэна Дружбы народаў выдавецтва «Беларусь» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. 220041, Мінск, Ленінскі праспект, 79.

25 к.